Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 ЛІПЕНЯ 2009 г.
СУБОТА
№ 132
(26490)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«Прамая лінія»

СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

Апошнім часам статыстыка адзначае паступовы рост нараджальнасці. А адсюль — і павелічэнне цікавасці да тэмы сацыяльнай падтрымкі сем'яў і дзяцей. Дапамогі па доглядзе, бясплатнае харчаванне для дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, дадатковыя гарантыі працоўнага заканадаўства бацькам — аб усім гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандры Васільеўны ЛІСОЎСКАЙ** і **кансультанта гэтага ж аддзела Марыны Барысаўны АРЦЁМЕНКІ.**

УВАГА! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе 21 ліпеня з 15 да 16 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ — ЗАХАВАННЕ І НАРОШЧВАННЕ ЭКАНАМІЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ КРАІНЫ»

Для Беларусі асноўнай задачай у сучасных умовах з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці работы па захаванні і нарошчванні эканамічнага патэнцыялу, падтрыманні дастойнага ўзроўню жыцця людзей. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па бягучых пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў захаванне негатыўных тэндэнцый у эканамічным развіцці краіны і рэгіёнаў. «Становіцца больш востра праблема з неплацяжамі, скарачаюцца аб'ёмы знешняга гандлю, знікаюцца тэмпы інвестыцый у асноўны капітал», — адзначыў ён.

«Трэба трымаць руку на пульсе, высвятляць прычыны, якія стрымліваюць наша развіццё, і аператыўна іх ухіляць. Таму так важна «непрычасаная», адкрытая інфармацыя па ўсіх злабадзённых пытаннях», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

На яго думку, асабліва важным пытаннем сёння з'яўляецца сітуацыя ў агракомплексе, паколькі стан гэтай базавай галіны вызначае харчовую бяспеку дзяржавы, а таксама забяспечанасць сыравіннымі рэсурсамі шэрагу звязаных вытворчасцяў.

Аляксандр Лукашэнка выказаў занепакоенасць праблемамі, якія ўзнікаюць у жыллёвым будаўніцтве. «Будуем больш, а чэргі пры гэтым не змяншаюцца», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. «Мы дамаўляліся, што жыллёваму будаўніцтву нададзім асаблівую ўвагу як лакаматыву ўсёй эканомікі і вельмі важнаму фактару стабілізацыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама падкрэсліў, што ёсць праблемы з прыцягненнем грамадзян да будаўніцтва жылля. Акрамя таго, крэдытныя рэсурсы банкаў вельмі дарагія.

З 25 даручэнняў, дадзеных кіраўніком дзяржавы на мінулай нарадзе, нявыкананымі засталіся 5. Гэта датычыцца вырашэння пытанняў па стымуляванні экспарту, зніжэнні стаўкі па крэдытах для рэальнага сектара эканомікі, а таксама даручэнняў, якія закранаюць працу канкрэтных прадпрыемстваў.

Як адзначыў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, у першым паўгоддзі рэалізавана большасць распрацаваных мераў і механізмаў сістэмнага супрацьдзеяння крызісу. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей звярнуў увагу на той факт, што не заўсёды існуе паразуменне паміж Урадам і мясцовымі ўладамі наконт неабходнасці сумеснага вырашэння наяўных праблем. Старшыня Камітэта дзяржкантролю Зянон Ломаць далажыў аб асобных негатыўных фактах, якія назіраюцца ў эканоміцы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння галоўнай праблемай з'яўляецца вялікая затавараванасць складаў і слабы гандаль на экспарт. Прэзідэнт запатрабаваў ад Урада і губернатараў у вельмі кароткія тэрміны разабрацца з вырашэннем гэтай задачы.

На думку Прэзідэнта, прадпрыемствам неабходна больш актыўна асвойваць новыя рынкі збыту, рэалізоўваць прадукцыю ўнутры краіны пад гарантыі яе наступнай аплаты. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што не варта адмаўляцца ад расійскага рынку, проста неабходна памяняць метады, падыходы да рэалізацыі туды прадукцыі.

Што датычыцца сітуацыі з прывядзеннем санэпідзаключэнняў на малочную прадукцыю беларускіх вытворцаў у адпаведнасць з расійскім тэхрэгламентам, Аляксандр Лукашэнка катэгарычна папярэдзіў, што за 14 дзён, якія засталіся, усе наяўныя праблемы павінны быць вырашаны. Ён таксама падкрэсліў, што гэта пытанне не павінна нечакана ўзнікнуць 1 жніўня.

Як запэўнілі Прэзідэнта губернатары, у рэгіёнах няма нявырашаных праблем па ўборачнай кампаніі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўжо з наступнага тыдня ў краіне павінна пачацца масавая ўборка ўраджаю. Ён таксама дадаў, што будзе асабіста кантраляваць яе ход.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ва ўмовах крызісу асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на пытанне эканоміі сродкаў. «Мільярды выдаткоўваюцца на тыя мерапрыемствы, якія маглі б пачакаць, — сказаў Прэзідэнт. — Найважнейшым з'яўляецца пытанне эканоміі, і яно датычыцца ўсіх. Пакуль я не заўважыў, што краіна жыве ва ўмовах крызісу з пункту гледжання эканоміі».

У той жа час кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэта не павінна датычыцца згортвання праграм па будаўніцтве жылля, дарог, фермаў, мадэрнізацыі прадпрыемстваў.

«Надышоў час канкрэтнай працы. Прывядзіце краіну ў парадак, каб я не ўзварушваў кожнага», — заключыў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўсіх прысутных у зале.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

«АДСЛУЖЫМ ЯК ТРЭБА!»

Адпраўленне маладога папаўнення ў войскі спецыяльнага прызначэння з Магілёўскага чыгуначнага вакзала.

Без 8-мі балаў максімум!

Абітурыентка з Бабруйска падала ў прыёмную камісію Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на факультэт міжнародных адносінаў дакументы з унікальнай агульнай сумай балаў — 392. Пра гэта расказаў намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі ВНУ Вячаслаў Малафееў. Паводле яго слоў, гэта рэдкі выпадак у гісторыі ўступнай кампаніі, таму што дзяўчына не дабрала да максімальна магчымых 400 усяго 8 балаў.

Таксама вельмі высокія вынікі ў выпускніцы ліцэя БДУ — 382 балы. Гэта абітурыентка збіраецца паступаць на гістарычны факультэт.

Яшчэ адна мінчанка з 380 баламі падала дакументы на матэматычны факультэт.

БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРЭЗІДЭНТ ЛАТВІІ ПАПРАСІЎ ПАЧАКАЦЬ З НАБЫЦЦЁМ КВАТЭРЫ ДЛЯ ЯГО

Прэзідэнт Латвіі Валдыс Затлерс папрасіў прэм'ер-міністра Валдыса Дамброўскіса пачакаць з выбарам і набыццём новай кватэры, якая належыць кіраўніку дзяржавы па заканчэнні тэрміну яго паўнамоцтваў.

Паводле планаў ДАТ «Дзяржаўная нерухомасць», якое арганізавала тэндар на куплю жылля для кіраўніка дзяржавы, кватэру меркавалася абраць да 15 жніўня. Адборам найбольш зручных варыянтаў займаецца адмысловая камісія, на разглядзе якой ужо знаходзяцца 18 кватэр. Важным крытэрам выбару з'яўляецца тое, што будучая кватэра Затлерса павінна не саступаць па сваіх характарыстыках жыллю экс-прэзідэнтаў Гунціса Улманіса і Вайры Вікі-Фрэйбергі. У прыватнасці, кватэра, у якой пасяліцца Затлерс, павінна размяшчацца ў гістарычным цэнтры Рыгі і быць не меншай за 240 квадратных метраў па плошчы.

ПАПУ РЫМСКАГА ПРААПЕРЫРАВАЛІ



Папа Рымскі Бенядыкт XVI перанёс аперацыю, паведаміла AFP.

Пантыфіку прааперыравалі правае запясце, якое ён пашкодзіў пры падзенні, знаходзячыся на адпачынку ў Альпах. CNN удакладняе, што Папа Рымскі паслізнуўся ў ваннай.

НАЗВАНАЯ САМАЯ ТАННАЯ КРАІНА ЕЎРОПЫ

Самай таннай краінай у Еўропе прызнаная Македонія. Гэта вынікае з дакладу еўрапейскага статыстычнага агенцтва Eurostat, якое параўнала кошты на тавары і паслугі ў 37 краінах Еўропы.

У Македоніі, якая з'яўляецца кандыдатам на ўступленне ў Еўрасаюз, кошты былі ніжэйшыя на 53 працэнты за сярэднія ў ЕС. Самай таннай краінай у Еўрасаюзе стала Балгарыя, дзе спажывецкія кошты ніжэйшыя за кошты сярэднееўрапейскага ўзроўню на 49 працэнтаў. У даследаванні Eurostat узялі ўдзел 27 краін — членаў Еўрасаюза, а таксама тры дзяржавы — кандыдаты на ўступленне ў ЕС (Харватыя, Македонія, Турцыя), тры дзяржавы — члены Еўрапейскай асацыяцыі вольнага гандлю (Ісландыя, Нарвегія і Швейцарыя), а таксама Боснія і Герцагавіна, Албанія, Чарнагорыя і Сербія. Статыстычнае агенцтва параўноўвала кошты на 2,5 тысячы відаў тавараў і паслуг у пералічаных краінах. Самай дарагой дзяржавай у Еўропе стала Данія, дзе ўзровень спажывецкіх коштаў на 41 працэнт вышэйшы, чым у сярэднім па ЕС. Наступнымі па дарагоўлі ў Еўропе прызнаныя Нарвегія і Швейцарыя. У гэтых краінах спажывецкія кошты перавышаюць сярэднееўрапейскі паказчык на 39 і 30 працэнтаў адпаведна.

КОЖНАМУ ПЯЦІДЗЯСЯТАМУ РАСІЯНІНУ ЗАВІНАВАЦІЛІСЯ ЗАРПЛАТУ

Запазычанасць па зарплаце ў Расіі на 1 ліпеня 2009 года мелі 400 тысяч чалавек, што складае каля двух працэнтаў ад усіх работнікаў у тых галінах, якія ўваходзяць у афіцыйную статыстыку Расстата.

У ІЕРУСАЛІМЕ ЎЛЬТРААРТАДОКСЫ ПАРАНІЛІ 18 ПАЛІЦЭЙСКІХ

У ноч на пятніцу, 17 ліпеня, у Іерусаліме ўзнавіліся масавыя акцыі пратэсту, у якіх удзельнічала больш за 1000 ультраартадаксальных яўрэяў.

Яны перакрывалі аўтатрасы, палілі смецце, лілі алей на дарогі, разбівалі святлафоры і ламалі лініі электрапередач. Падчас падаўлення беспарадкаў раненні атрымалі 18 паліцэйскіх, больш за паўсотню пратэстуючых арыштаваныя, паведамляе Haaretz. Выступленні ўльтраартадоксаў пачаліся пасля арышту прадстаўніцы абшчыны, якую падазраюць у здзекаванні над трохгадовым дзіцем. Яна нібыта марыла яго голадам — на момант арышту дзіця важыла сем кілаграмаў.

ПАД ПІНСКАМ ЖЫВЕ БЕЛАРУСКІ ПІКАСО

Выкладчык вясковай школы Сяргей ЖЫЛЕВІЧ стварыў унікальны сад скульптураў пад адкрытым небам

Сяргей Жылевіч — гонар Піншчыны, ягоная сядзіба ў вёсцы Баяры нават унесеная ў афіцыйны турыстычны даведнік па рэгіёне. 25 гадоў таму мастак з'ехаў з Пінска і пасяліўся ў вёсцы Баяры. За гэты час Сяргей Фёдаравіч пераўтварыў сваю сядзібу ў сапраўдную мастацкую галерэю, а 40 сотак, дзе звычайна садзяць бульбу, — у неверагодны ландшафтны сад скульптураў. Знайсці сядзібу мастака ў Баярах — не праблема.

— З правага боку яна, з такой вялікай скульптурай Маці Божай, — скіроўвае мяне дзед на ровары. Арыенцір на мясцовасці яшчэ прасцейшы — напраўду незвычайны мастакоўскі плот: кожная штыкеціна круглая, заточаная і расфарбаваная пад аловак. Гасцей Жылевіч сустракае ветліва, хоць прыязджаю і без званка.

— Заходзьце, заходзьце! — вітае гаспадар на ганку дома. — А тут літаральна перад вамі з радыё прыязджалі. Напэўна, і вы мой музей паглядзець хочаце?

А яно так. Глядзіш — і рот адкрываецца: то пагорак, то лагчынка, фантанчыкі, кветкі, і паўсюль — скульптуры, скульптуры, скульптуры...

(Заканчэнне на 6-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.07.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 847,00
▲ 1 еўра	4 012,28
1 латвійскі лат	5 725,49
1 літоўскі літ	1 161,16
1 чэшская крона	154,47
1 польскі злоты	927,66
▼ 1 расійскі рубель	89,57
1 украінская грыўня	369,74

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,7837
10 UAH	41,2775
1000 BYR	11,1678
EUR	44,8023

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПИЩЕВОЙ КОМБИНАТ «ВЕСЕЛОВО»

19 АВГУСТА 2009 ГОДА СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ПИЩЕВОЙ КОМБИНАТ «ВЕСЕЛОВО»,

расположенного по адресу:
Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24.

Собрание пройдет по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24, актовый зал.

Повестка дня собрания:

1. Отчет о результатах деятельности Общества за период с 16 января 2009 по 18 августа 2009 года и информация об итогах льготной продажи и обмена на ИПЧ «Имущество» работникам Общества акций, принадлежащих государству.
Докладчик — директор Общества.
2. Утверждение направлений использования чистой прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2009 г. (текущий) год и первый квартал 2010 г. (следующего года).
Докладчик — главный бухгалтер Общества.
3. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
4. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
5. Определение органа печати, в котором будут публиковаться годовые отчеты Общества, решения о созыве собрания акционеров и другая информация.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24 (приемная) с 10 по 18 августа 2009 г. (время работы с 8.00 до 17.00) либо 19 августа 2009 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 19 августа 2009 г. в 11.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01 августа 2009 года. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность!

УНП 690277551

По поручению ОАО «Оргпищепром», КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания гальванического цеха, об. пл. 360 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, пер. С. Ковалевской, 44. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 377 713 280 бел. руб. Земельный участок, необходимый для обслуживания здания, будет выделен по решению горисполкома из земельного участка об. пл. 2,8491 га, находящегося во временном пользовании ОАО «Оргпищепром». Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.06.2009 г. Аукцион состоится **27.07.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.07.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел. (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

РАЗБОЙНІКІ ЗВЯЗАЛІ СТАРЫХ

Ахвярамі невядомых злачынцаў, асобы якіх цяпер вызначаюць праваахоўнікі, сталі дзве вясковыя пенсіянеркі. Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, трое невядомых залезлі ў дом праз акно да жыхаркі вёскі Нова-Дуброўка, што ў Шчучынскім раёне. Пагражаючы нажом гаспадыні, якая нарадзілася ў 1929 годзе, а таксама яе сястры (жанчына 1928 года нараджэння), нахабнікі звязалі пацярпелых. Здабычай разбойнікаў сталі 5 мільёнаў 300 тысяч рублёў, якія яны знайшлі ў доме.

Ігар ГРЫШЫН.

БЕЛИНВЕСТБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	237 343,8	178 501,2
3	Средства в Национальном банке	1102	2	153 672,3	256 728,3
4	Ценные бумаги	1103		327 721,9	397 375,4
	для торговли	11031	3	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	33 034,1	*33 028,8*
	в наличии для продажи	11033	3.2	294 687,8	*364 346,6*
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	222 684,0	288 431,6
6	Кредиты клиентам	1106	5	3 322 487,7	2 531 264,4
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	427,0	426,9
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	211 128,8	154 787,8
9	Прочие активы	1109	8	97 248,0	60 938,3
10	Итого активы	110		4 572 713,5	**3 868 453,9**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	357 481,2	78 048,2
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	344 068,7	377 448,3
14	Средства клиентов	1206	11	3 053 067,8	2 972 305,9
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		107 640,1	20 761,8
16	Прочие обязательства	1209	12	71 185,6	48 805,2
17	Всего обязательства	120		3 933 575,3	3 497 369,4
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	382 089,6	182 089,6
20	Эмиссионный доход	1212		0,1	0,1
21	Резервный фонд	1213		33 857,6	24 857,6
22	Накопленная прибыль	1214	14	134 807,0	99 559,0
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	88 383,9	64 578,2
24	Всего капитал	121		639 138,2	371 084,5
25	Итого обязательства и капитал	12		4 572 713,5	**3 868 453,9**
26	**Требования и обязательства на внебалансовых счетах**				
27	Требования	1301	16	3 607 573,3	**1 901 252,5**
28	Обязательства	1302	17	1 171 945,0	**636 376,4**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

N п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		285 029,4	162 299,2
2	Процентные расходы	2012		208 435,8	107 497,9
3	Чистые процентные доходы	201	18	76 593,6	54 801,3
4	Комиссионные доходы	2021		57 192,6	55 079,2
5	Комиссионные расходы	2022		7 352,7	5 628,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	49 839,9	49 450,6
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	(-29258,6)	21 629,3
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	(-287,3)	(-189,4)
9	Доход в форме дивидендов	205		33,5	34,4
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	22 033,7	3 332,8
11	Прочие доходы	207	23	76 093,3	8 508,6
12	Операционные расходы	208	24	96 766,3	84 080,3
13	Прочие расходы	209	25	18 354,0	9 348,0
14	Налог на прибыль	210		5 781,8	9 246,2
15	Прибыль (убыток)	2		30 078,6	28 227,5

Зам. председателя Правления **Т.А. Новосельская**
Главный бухгалтер **А.Н. Сырокваш**

www.belinvestbank.by
Минск, пр-т Машерова, 29

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» УНП 807000028
Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006 г.

Фота Марыны БЕЛЯКОВАЙ.

У ПУХ І ПЕР'Е

599-годдзе Грунвальдскай бітвы ў Мінску адзначылі бітвай падушкамі. Каля 200 чалавек з падушкамі замест зброі прыйшлі ў сквер Я. Купалы паўдзельнічаць у незвычайнай бітве. Удзельнікі раздзяліліся на каманды «сваіх» з белымі стужкамі на галаве і «чужых» з чорнымі. Пасля першага бою «пяхоты» пайшла «конніца». Дзяўчаты, хлопцы, дзеці калашмацілі адзін аднаго падушкамі так, што аж пыл курэў. Напрыканцы было ўжо незразумела, дзе якая армія: біліся кожны за сябе.

Пасля бітвы ўдзельнікі пайшлі піць гарбату. Арганізатары, натхнёныя такой колькасцю людзей, вырашылі правесці падобную акцыю ў найбліжэйшы час.

Настасся ЗАНЬКО.

У Беларусі будуць уручацца 5 прэмій Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» і 10 спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва

Рашэннем кіраўніка дзяржавы заснаваны 5 прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва ў памеры 350 базавых велічынь кожная. Адпаведны ўказ № 384 Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 ліпеня.

Згодна з указам прэмія «За духоўнае адраджэнне» прысуджаецца штогод за выдатныя творы літаратуры і мастацтва і (або) актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае зберажэнню і прымнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцяў і мастацка-маральных традыцый, ідэй чалавекалюбства, дабрачыннасці і міласэрнасці. Таксама кіраўнік дзяржавы ўнёс змяненні ў склад савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Адпаведны ўказ Прэзідэнт падпісаў 16 ліпеня. Старшынёй савета назначаны намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, заслужаны артыст Беларусі Генадзь Давыдзька, яго намеснікам — першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ВІРТУОЗНЫ ДЫПЛАМАТ

Беларусь адзначае 100-годдзе легендарнага Андрэя Грамыкі

Святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя векавому юбілею з дня нараджэння славутага дыпламата, міністра замежных спраў СССР, нашага земляка Андрэя Грамыкі, праходзяць гэтымі днямі ў Беларусі. Тэматычная выстава дакументаў, якія распавядаюць пра розныя этапы дзейнасці знакамітага ўраджэнца Гомельшчыны, адкрылася ў Цэнтры гісторыі МЗС і беларускай дыпламатычнай службы. У экспазіцыі — дакументальныя сведчанні работы Крымскай канферэнцыі, падпісання Статута ААН (і ў тым, што Беларусь з'яўляецца адной з заснавальніц гэтай міжнароднай арганізацыі, ёсць несумненная заслуга А. Грамыкі) і нават прыхільнасці да віртуознага дыпламата самой каралевы Лізаветы. У сваім лісце яна называе Андрэя Грамыку (у свой час ён займаў пост пасла СССР у Вялікабрытаніі) «дарагі сябар». Апроч архіўных дакументаў і фотаздымкаў на выставе знайшлося месца і паведамленням пра выбітнага дзяржаўнага дзеяча ў прэсе. Не без гонару адзначым, што ў экспазіцыі можна пабачыць і публікацыю ў «Звяздзе» за 1985 год.

Сын легендарнага дыпламата Анатоль Грамыка застаўся надзвычай задаволены выставай. «Людзі жывуць сярод нас, пакуль пра іх памятаюць. Мне, як і ўсім сваякам Андрэя Андрэевіча Грамыкі, вельмі прыемна, што ў Беларусі не проста памятаюць пра яго, а шануюць яго памяць. Я думаю, што ў Беларусі ён будзе доўга жыць у розумах і сэрцах людзей».

Імя «Спадар Не», якое замацавалася за савецкім паслом разам з суровым вобразам, што прыпісвала яму заходняя прэса, Анатоль Грамыка назваў застылымі характарыстыкамі, якія імкнуліся навязаць. Дапытлівы сын запытаўся, чаму бацьку так называюць, і вось што пачуў у адказ: «Я іх «по» чуў куды часцей, бо мы вылучалі значна больш прапаноў». Савецкая дыпламатыя была вельмі актыўнай, — адзначае Анатоль Грамыка. Ён кажа, што ў перамовах абодвум бакам часта даводзілася казаць «не», бо гэта вельмі складаны працэс «прыціркі» пазіцый і пошуку кампрамісаў. Аднак гісторыя дэманструе, што віртуозны дыпламат Андрэй Грамыка па-майстэрску выходзіў з самых няпростых сітуацый.

Дыпламатычным майстэрствам Грамыка авалодваў ва ўмовах Другой сусветнай вайны. Ён вёў перамовы гнутка і тактоўна. «Лепш сто разоў не сказаць тое, што трэба сказаць, чым адзін раз сказаць тое, што не трэба сказаць», — любіў паўтараць дыпламат. У 1943-м ён прызначаны паслом у ЗША, браў удзел у канферэнцыях у Ялце, Патсдаме, Думбартан-Оксе, Сан-Францыска, што заклалі аснову пасляваеннага светаўладкавання. Іншы раз дапамагала дыпламату і тонкае пачуццё гумару. На канферэнцыі ў Думбартан-Оксе, дзе і была ўтворана ААН, журналісты спыталі ў кіраўніка савецкай дэлегацыі А. Грамыкі пра «лятучыя талеркі», што з'явіліся над Амерыкай. «Аб'екты рэальныя. Яны — вынік дзеянняў ва Усходняй Сібіры савецкага чэмпіёна па кіданні дыска, які не ведае, якая ў яго сіла...».

А. Грамыка быў прыхільнікам мірных адносінаў з ЗША і іншымі краінамі Захаду. Пры яго непасрэдным удзеле СССР вылучыў больш за 100 ініцыятыў у галіне раззбраення. Прадметам яго асаблівага гонару быў падпісаны ў 1963 годзе Дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой.

А якім быў віртуозны дыпламат дома — з роднымі і блізкімі? Анатоль Грамыка падзяліўся з журналістамі і ўспамінамі пра гора-паляванне на качак, куды яго аднойчы ўзяў з сабой бацька. Паляўнічыя наладзілі засаду ў плавальных бочках. Аднак паляўнічаму-пачаткоўцу надоўга стаіцца не давялося: пад'ём быў раннім, і хлопец неўпрыкмет заснуў... А раптоўна пракаплівся ад таго, што яго паляўнічая зброя стрэліла. «Так паміраюць ад няшчасных выпадкаў, — падумаў тады я», — прызнаецца Анатоль Грамыка. «Бацька потым спытаў: ты чаму страляў, калі качак не было? Давялося яму ўсё расказаць...». Незадачлівага паляўнічага Андрэй Андрэевіч з сабой на паляванне больш не браў...

Сын выбітнага дзяржаўнага дзеяча мяркуе, што Андрэй Грамыка «рэкамендаваў бы спакойна, добразычліва, з улікам інтарэсаў абодвух бакоў весці работу па будаўніцтве нашага Саюза», паколькі абодва народы маюць патрэбу ў тым, каб эканамічнае і палітычнае адзінства Беларусі і Расіі мацнела.

Ушанавальныя мерапрыемствы, арганізаваныя МЗС і Пастаянным Камітэтам Саюзнай дзяржавы сумесна з інфармацыйным партнёрам — выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі», пройдуць і на малой радзіме беларускага майстра дыпламатыі — Веткаўшчыне. У Гомелі ўскладуць кветкі да бюста Грамыкі ў скверы, названым у гонар слыннага дзяржаўнага дзеяча. Правядуць таксама цырымонію гашэння маркі «100 годоў з дня нараджэння А.А. Грамыкі». У мерапрыемствах бяруць удзел прадстаўнікі знешнепалітычнага ведамства Расіі, Асацыяцыя расійскіх дыпламатаў, сваякі Андрэя Грамыкі.

На адкрыцці навукова-практычнай канферэнцыі з нагоды юбілею слыннага дыпламата першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі Ігар Петрышэнка адзначыў, што прапрацоўваецца пытанне аб тым, каб назваць адну з мінскіх вуліц у гонар Андрэя Грамыкі.

Зоя ВАРАНЦОВА.

ДАВЕДКА:

28 гадоў Андрэй Грамыка ўзначальваў знешнепалітычнае ведамства СССР, быў паслом у ЗША і па сумяшчальніцтве паўнамоцным пасланнікам на Кубе, паслом у Вялікабрытаніі, старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, стаяў ля вытокаў стварэння ААН.

Аляксандр СУРЫКАЎ: «ДАЎШЫ СЛОВА — ТРЫМАЙ»

Тэма аб прадастаўленні Беларусі чарговага траншу расійскага крэдыту не закрыта. Аб гэтым паведаміў журналістам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Сурыкаў.

«Гэта пытанне знаходзіцца ў развіцці, у перагаворах», — сказаў Аляксандр Сурыкаў. Прадастаўленне расійскага крэдыту ў памеры $500 млн прадаўжае прапрацоўвацца мінфінамі Расіі і Беларусі, дадаў ён.

Расія не разлічвае набываць актывы беларускіх малаказаводаў па таннай цане, заявіў Аляксандр Сурыкаў. Дыпламат адзначыў, што тэма набыцця актываў беларускіх малочных прадпрыемстваў, а таксама магчымага абмену акцыямі расійскіх і беларускіх малаказаводаў не закрыта. Разам з тым ён падкрэсліў, што «ніхто не збіраецца нічога набываць «на халяву», па таннай цане». «Цяпер ідуць рэальныя ацэнкі кошту прадпрыемстваў, і пасля гэтага будуць размовы аб працэнтах актываў, уваходжанні актываў у актывы або іх набыцці. Гэта ўсё залежыць ад жаданняў інвестараў і ўласнікаў прадпрыемстваў», — сказаў пасол.

Паводле слоў Аляксандра Сурыкава, беларускі бок прадставіў на разгляд спіс з 12—13 прадпрыемстваў. З расійскага боку ў ліку магчымых партнёраў разглядаюцца «Юнімілк», «Вім-Біль-Дан» і іншыя. Важнай умовай для рэалізацыі сумесных праектаў з'яўляецца тое, каб прадпрыемствы знаходзіліся ў сыравіннай зоне і адпавядалі патрэбнасцям беларускага і расійскага рынкаў, дадаў дыпламат.

Дамоўленасці аб пастаўках газу ў Беларусь па сярэднегадавой цане трэба замацаваць юрыдычна, лічыць пасол Расіі. Дыпламат адзначыў, што адпаведныя дамоўленасці паміж Беларуссю і Расіяй былі, значыць, яны павінны выконвацца. «Даўшы слова — трымай», — дадаў ён. На думку пасла, у інтарэсах «Газпрама» падпісаць адпаведнае дадатковае пагадненне да кантракта аб пастаўках газу ў Беларусь на 2009 год. «Хутчэй за ўсё, яно будзе падпісана», — лічыць Аляксандр Сурыкаў.

Пытанне аб уваходжанні Ашчаднага банка Расіі ў банкаўскі сектар Беларусі павінна вырашыцца да канца 2009 года. «Ашчадны банк Расіі хацеў бы ўвайсці на банкаўскі рынак Беларусі і паступова набыць якінебудзь з банкаў», — сказаў дыпламат.

«Не ведаю, які банк у канчатковым выніку будзе набыты, гэта залежыць ад цаны пытання», — дадаў Аляксандр Сурыкаў і выказаў меркаванне, што размова можа ісці аб набыцці кантролю над БПБ-банкам...

БЕЛТА.

Парламенцкі дзённік

СТАСУНКІ З ВЯЛІКІМ ПАТЭНЦЫЯЛАМ

На наступнай сесіі ў беларускім парламенце плануецца стварыць групу па супрацоўніцтве з Харватыяй.

— Мы разглядаем Харватыю як перспектыўнага партнёра Беларусі ў Балканскім рэгіёне, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка, старшыня Палаты прадстаўнікоў, падчас сустрэчы з Нябойшам Кахаровічам, паслом Харватыі ў Беларусі (па сумяшчальніцтве). Спікер адзначыў зацікаўленасць беларускага боку ў развіцці ўзаемавыгадных стасункаў з Харватыяй. Тым больш што, на думку палітыка, ёсць усе падставы развіваць гэтыя стасункі — гандлёва-эканамічныя, палітычныя, у сферы культуры, адукацыі, спорту, турызму. Важным складальнікам з'яўляецца і міжпарламенцкі дыялог — не толькі ў двухбаковым фармаце, але і ў міжнародных арганізацыях.

Група па супрацоўніцтве з Беларуссю ўжо створана ў Саборы (парламенце Харватыі). У Нацыянальным сходзе аналагічнай групы пакуль няма, аднак Уладзімір Андрэйчанка запэўніў, што ў самы блізкі час, літаральна на восеньскай сесіі (яна пачынаецца 2 кастрычніка) «мы вернемся да гэтага пытання і таксама створым такую групу».

Нябойша Кахаровіч зрабіў акцэнт на тым, што Беларусь — вельмі цікавая краіна з вялікім патэнцыялам. Паводле слоў пасла, такую пазіцыю падзяляюць і харвацкія інвестары. Дыпламат паведаміў, што на працягу гэтага года плануецца падпісаць два пагадненні, якія паспрыяюць рабоце харвацкіх інвестараў у Беларусі. Карацей, планаў багата, і патэнцыял у стасункаў паміж двума славянскімі народамі вялікі.

Ала МАЧАЛАВА.

ДОМІКІ — ДА АГЛЯДУ!

Мінбудархітэктуры Беларусі да канца года распрацуе палажэнне, якое вызначыць правілы прыёмкі ў эксплуатацыю дачных дамкоў, паведаміла на «круглым стале» начальнік юрыдычнага аддзела міністэрства Антаніна Пятрушына.

Неабходнасць прыняцця такога дакумента выклікана скаргамі дачнікаў, а таксама супрацьчынасцямі, якія ўзнікаюць пры прымяненні на практыцы ўказа «Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садаводчых таварыстваў». «Палажэнне, якое цяпер распрацоўваецца, вызначыць парадак прыёмкі ў эксплуатацыю будынкаў. Мяркуецца, што прымаць аб'екты будзе спецыяльная камісія, створаная ў таварыстве, для гэтага адпаведныя змяненні павінны быць унесены ў статут таварыства», — адзначыла Антаніна Пятрушына.

БЕЛТА.

Ліга Еўропы

«Нафтан» здзівіў, «Дынама» прымусіла спадзявацца, МТЗ згуляў, як змог

Перамога, нічыя і паражэнне — такі вынік выступлення трох беларускіх клубаў у першым туры другога кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы. Міні-сенсацыяй называюць перамогу наваполацкага «Нафтана» над бельгійскім «Гентам» (2:1). Прычым да дзевяностай хвіліны беларускі клуб вёў 2:0, дублем вызначыўся Аляксандр Дзегцяроў. Гэта пры тым, што на працягу ўсяго матча перавагай валодалі бельгійцы.

Матч праходзіў у фестывальным Віцебску, прычым бельгійцы напярэдадні прыезду выказалі пажаданне пасяліцца ў ціхай гасцініцы, праўда, узровень яе павінен быў адпавядаць чатыром зоркам. Па прычыне перагружанасці падчас «Славянскага базару» гарадскіх гасцініц, футбольную каманду пасялілі на базе адпачынку «Крупенін» за 30 кіламетраў ад Віцебска.

Сталічным дынамаўцам, якія прымалі ў Мінску нарвежскі «Тромсе», захаваць вароты ў непарушнасці ўдалося, праўда і ў саміх вызначыцца не атрымалася. Мінская каманда мела шмат момантаў, 3-4 з якіх былі стапрацэнтнымі, аднак рэалізацыя падвяла бела-блакітных.

А вось для сталічнага МТЗ-РІПА другі раўнд, хутчэй за ўсё, стане і апошнім у сёлетнім сезоне. Каманда на выездзе прайграла моцнаму суперніку — данецкаму «Металургу» — 0:3. Розніца ў класе камандаў была відавочнай, і пасля гульні галоўны трэнер мінчан Юрый Пунтус сумна заўважыў: «Прайгралі 0:3 — добра, што хоць так». Ён зазначыў, што каманды ў розных вагавых катэгорыях. Пра тое, каб адыграцца, казаць нерэальна, даў зразумець Юрый Пунтус, затое для яго «маладой каманды гэта карысны вопыт».

Учора ў штаб-кватэры УЕФА ў швейцарскім Ньёне адбылася жараб'ёўка трох адборачных раўндаў Лігі чэмпіёнаў і Лігі Еўропы. У Лізе чэмпіёнаў прадстаўніком нашай краіны з'яўляецца барысаўскі БАТЭ, які, як вядома, у другім раўндзе на выездзе 14 ліпеня абыграў македонскі «Скоп'е» 2:0. Сустрэча ў адказ пройдзе 21 ліпеня ў Барысаве. Калі БАТЭ праходзіць у трэці раўнд, сустракацца будзе там з пераможцам пары «Вентспілс» (Латвія) — «Дзюдзеланж» (Люксембург). У другім раўндзе на сваім полі «Вентспілс» абыграў «Дзюдзеланж» з лікам 3:0.

У Лізе Еўропы ў выніку пераадолення бельгійскага бар'еру наваполацкаму «Нафтану» дастаецца італьянская «Рома», якой дэбютантам еўракубкаў і саступіць не так ганебна. Мінскаму «Дынама» ў выніку выйгрышу ці выніковай нічыёй у Нарвегіі давядзецца сустрэцца ў трэцім раўндзе з пераможцам пары «Мілана» (Македонія)—«Славен» (Харватыя). МТЗ-РІПА таксама тэарытычна мае шанцы на выхад у трэці раўнд, калі дома адыграецца пасля паражэння 0:3 ад данецкага «Металурга». Там мінчан чакае славацкі «Інтэрблок». Матчы Лігі Еўропы адбудуцца 30 ліпеня і 6 жніўня.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Абзац

◢ Сіноптыкі аб'явілі штармавое папярэджанне ў сувязі з гарачым надвор'ем, якое чакаецца ў краіне 18-19 ліпеня. З-за паступлення вельмі цёплага паветра з раёна Міжземнага мора ў выхадныя на большай частцы Беларусі максімальная тэмпература паветра дасягне 30-34 градусаў. У Мінску ў сярэдзіне дня будзе каля 30, папярэджваюць сіноптыкі.

◢ **У выніку моцных вятроў і граду, што прайшлі на Гомельшчыне ў чэрвені, нанесены стыхіяй урон складае каля Br3 млрд.**

◢ Пасольства Літвы ў Беларусі рыхтуе да выдання беларуска-літоўскі і літоўска-беларускі размоўнік, а праца над паўнацэнным слоўнікам знаходзіцца на пачатковым этапе. Размоўнік накладам 1000 экз. будзе выдадзены ў найбліжэйшы час. Ён не паступіць у продаж, а будзе распаўсюджвацца пасольствам.

◢ **Буйную партыю кантрабанднага мяса канфіскавалі беларускія мытнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі і падатковай службы. У ходзе распрацоўкі аператыўнай інфармацыі быў выяўлены склад няўлічанай мясной і рыбнай прадукцыі на суму каля Br19 млн. Жыхар Полацка, дырэктар прыватнага гандлёвага прадпрыемства, захоўваў у маразільных камерах курыныя кумпячкі, рыбу і фарш, якія без адпаведных дакументаў былі вывезеныя з суседняй Расіі і рэалізоўваліся непасрэдна са склада. Тавар канфіскаваны, праводзіцца разбор.**

◢ Супрацоўнікі камітэта дзяржбяспекі Беларусі затрымалі грамадзяніна краіны, які гандляваў самаробнымі залатымі манетамі «Славянскі базар у Віцебску». На манетах змешчана выява амфітэатра, яны выраблены з золата 585 пробы агульнай вагой 200 г. У затрыманага былі канфіскаваныя 12 залатых манетападобных жэтонаў без прабірных кляймаў, а таксама самаробныя штампы для вырабу жэтонаў. Ацэначны кошт манетападобных жэтонаў складае больш за Br11,5 млн.

◢ **Дзень нараджэння бацькі абярнуўся смерцю сына ў Астраўцы. 26-гадовы непрацуючы мужчына загінуў на пажары. Пажар адбыўся ў цагляным доме, дзе напярэдадні сям'я святкавала дзень нараджэння бацькі. Пажарнікі, якія прыехалі па выкліку, знайшлі на верандзе цела сына гаспадара. Бацькам удалося выратавацца.**

◢ Пракуратура Брэсцкай вобласці распачала крымінальную справу ў дачыненні да былога дырэктара Пінскага гарадскога парку культуры і адпачынку. У сакавіку 2007 г. ён заключыў дамову з адной з арганізацый Мінска на пастаўку 6 атракцыёнаў. Пасля пастаўкі трох з іх дырэктару стала вядома, што астатнія тры атракцыёны пастаўшчык адгрузіць не зможа. Тым не менш ён даў указанне пералічыць у якасці перадаплаты Br188 млн бюджэтных сродкаў. У выніку атракцыёны не былі дастаўленыя. Грошы прапалі, прадпрыемству нанесены ўрон у асабліва буйным памеры.

Поўны абзац

◢ **Амерыканскія вучоныя высветлілі, што пералічваць наяўныя грошы карысна для псіхікі. Сутнасць эксперыменту дастаткова простая. Спецыялісты падзялілі добраахвотнікаў на дзве групы. Адной далі пералічваць стос з 80 простых белых паперак, а іншай — пачак з 80 стадоларавых банкнотаў. Высветлілася, што псіхічныя характарыстыкі, а таксама самаадчуванне прадстаўнікоў другой групы намнога адрозніваліся ад адпаведных паказчыкаў першай у лепшы бок. Вучоныя звяртаюць асаблівую ўвагу на тое, што грошы не належаць удзельнікам эксперыменту, а гэта азначае, што іх уздзеянне нельга атаясамліваць з задавальненнем ад асэнсавання ўласнага багацця. Таксама высветлілася, што думкі пра меркаваныя траты пагаршаюць настрой.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Самы хуткі інспектар працуе на Глыбоччыне

15—16 ліпеня на базе Смаргонскага пагранатрада прайшлі вучэбна-метадычныя зборы супрацоўнікаў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Рэспублікі Беларусь.

Інспектары праходзілі навучанне псіхалогіі вядзення гутаркі з парушальнікамі, парадку іх затрымання, рукапашнаму бою, а таксама здавалі залікі па фізічнай і агнявой падрыхтоўцы. Па выніках здачы нарматываў фізпадрыхтоўкі першае месца сярод абласцей заняў інспектарскі склад Віцебшчыны, а ў асабістым заліку першым на стометроўцы стаў **начальнік Глыбоцкай міжрайінспекцыі Аляксей ПРОТАС.**

Сяргей АЛЯКСАНДРАЎ.

Минский районный исполнительный комитет *в августе 2009 г.* проводит открытые *аукционы* по продаже земельных участков в частную собственность в Минском районе

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 307. Дата проведения: 20.08.2009 г. в 14:00.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9:00 до 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 14.08.2009 г. в 13:00. Контактный телефон: (8-025) 92-761-92.

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4
1	Адрес земельного участка	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино
2	Кадастровый номер	623685707101000160	623685707101000131	623685707101000236	623685707101000143
3	Площадь земельного участка	0,1527 га	0,1546 га	0,2016 га	0,1635 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	70 000	70 000	70 000	70 000
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	15 000 000	15 187 000	19 803 000	16 060 000
7	Задаток (рублей)	1 400 000	1 500 000	1 900 000	1 600 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 307. Дата проведения: 21.08.2009 г. в 14:00.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9:00 до 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 17.08.2009 г. в 13:00. Контактный телефон: (8-025) 92-761-92.

		Лот 1	Лот 2	Лот 3
1	Адрес земельного участка	Петришковский с/с, д. Новашино	Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода	Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода
2	Кадастровый номер	623685707101000141	623688006601000335	623688006601000334
3	Площадь земельного участка	0,1622 га	0,1500 га	0,1500 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	70 000	503 370	500 820
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	15 933 000	52 126 695	52 126 695
7	Задаток (рублей)	1 500 000	5 200 000	5 200 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 307. Дата проведения: 24.08.2009 г. в 14:00.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9:00 до 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 18.08.2009 г. в 13:00. Контактный телефон: (8-025) 92-761-92.

		Лот 1	Лот 2	Лот 3
1	Адрес земельного участка	Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода	Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода	Щомыслицкий с/с, д. Антонишки
2	Кадастровый номер	623688006601000336	623688006601000337	623688000101000057
3	Площадь земельного участка	0,1500 га	0,1500 га	0,1547 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	495 640	501 680	503 370
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	52 126 695	52 126 695	50 702 925
7	Задаток (рублей)	5 200 000	5 200 000	5 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 307. Дата проведения: 25.08.2009 г. в 14:00.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9:00 до 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 18.08.2009 г. в 13:00. Контактный телефон: (8-025) 92-761-92.

		Лот 1	Лот 2	Лот 3
1	Адрес земельного участка	Ждановичский с/с, п. Ратомка	Ждановичский с/с, д. Дегтяревка	Ждановичский с/с, д. Воловщина
2	Кадастровый номер	623681708601002490	623681702101000242	623681701101000047
3	Площадь земельного участка	0,1517 га	0,1521 га	0,1206 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 196 468	1 196 468	1 196 468
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	33 000 000	36 000 000	12 000 000
7	Задаток (рублей)	3 300 000	3 600 000	1 200 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 307. Дата проведения: 27.08.2009 г. в 14:00.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9:00 до 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 20.08.2009 г. в 13:00. Контактный телефон: (8-025) 92-761-92.

		Лот 1	Лот 2	Лот 3
1	Адрес земельного участка	Ждановичский с/с, д. Воловщина	Ждановичский с/с, д. Тарасово	Ждановичский с/с, д. Тарасово
2	Кадастровый номер	623681701101000048	623681709601001840	623681709601001838
3	Площадь земельного участка	0,1204 га	0,1081 га	0,1079 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 196 468	1 196 468	1 196 468
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	12 000 000	27 000 000	27 000 000
7	Задаток (рублей)	1 200 000	2 700 000	2 700 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 307. Дата проведения: 31.08.2009 г. в 14:00.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9:00 до 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 24.08.2009 г. в 13:00. Контактный телефон (8-025) 92-761-92.

		Лот 1	Лот 2	Лот 3
1	Адрес земельного участка	Ждановичский с/с, д. Тарасово	Лошанский с/с, д. Куты	Лошанский с/с, д. Суковичи
2	Кадастровый номер	623681709601001839	623684004101000030	623684012101000078
3	Площадь земельного участка	0,1542 га	0,2005 га	0,1484 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 196 468	502 665	454 973
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	38 000 000	13 722 621	9 960 385
7	Задаток (рублей)	3 800 000	1 300 000	900 000

Задаток перечисляется на р/с 3641200070048 в Октябрьское отд. в г. Минске ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, код 737, УНП 600068187, получатель Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

По решению комиссии участники аукциона, не выигравшие аукцион в отношении земельных участков, на которые они подали заявления, в перерывах между аукционными торгами могут перерегистрироваться на другие земельные участки, по которым размер задатка не превышает суммы, внесенной ими в качестве ранее перечисленного задатка. Для перерегистрации участники аукциона представляют заявления.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин, юридическое лицо обязаны внести плату за земельный участок в размере его кадастровой стоимости, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе по продаже земельных участков в частную собственность:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
- представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц — документ, удостоверяющий личность.

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

18 ЛІПЕНЯ 2009 г. СУБОТА № 26 (15580)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Лета студэнцкае

СТРАТЭГІЯ СТУДЭНЦКАГА ПРАЦАЎЛАДКАВАННЯ

Падпрацоўка для студэнта — звычайная справа, асабліва на летні перыяд. Але не кожны знаходзіць месца, на якое ўдасца ўладкавацца адразу і з поўнай упэўненасцю, што яно замацуецца за ім на неабходны тэрмін. Мне пашанцавала, я гэтую самую падпрацоўку знайшла. Праўда, не адразу. Давялося прыкласці шмат намаганняў, каб знайсці хоць нешта. А вось сяброўкі мае амаль што ўсе паехалі дадому, адпачываць з татамі і мамамі і атрымліваць асалоду ад знакамітага і жаданага ўсімі студэнтамі трыа: тэлевізар, дыван і халадзільнік.

Маё працаўладкаванне праходзіла ў некалькі этапаў, на кожным з якіх мяне чакала новая непрыемнасць і разам з ёй чарговая няўдача. Чамусьці працадаўцы як толькі чулі, што я студэнтка, ды яшчэ і дзённага аддзялення, адразу адмаўлялі мне ў тым самым жаданым месцы, якое, здаецца, ужо амаль было ў маіх руках. Таму зноў і зноў даводзілася штурмаваць іншыя арганізацыі, у якіх я чула амаль што ідэнтычны адказ. Праўда, дзе-нідзе праяўлялі разнастайнасць і абяцалі «Мы вам патэлефануем», што адразу давала зразумець — няма чаго і тут чакаць.

Трэба заўважыць яшчэ і тое, што пошукі працы — гэта надта дорага. Мне давялося наведаць 20 працадаўцаў, і ўсе яны знаходзіліся ў розных канцах горада. Значыць, і грошай на аплату праезду пайшло даволі многа — 600 рублёў у адзін бок на адзін від транспарту. Часам жа даводзілася дабірацца і двума, і трыма. Сума ў агульным падліку набягала немалая. Здаецца, праехаць бы «зайчыкам», што ўласціва студэнту ўвогуле. Ды дзе ж там! Увесь грамадскі транспарт проста нашпігаваны цётачкамі-кандуктаркамі, пад чыім вострым вокам не праслізне ніводзін пасажыр-безбілетнік.

У выніку ў мяне выпрацавалася свая стратэгія, згодна з якой я заўсёды ішла на чарговую гутарку па працаўладкаванні, што, мабыць, мне і дапамагло ўсё ж такі атрымаць месца, на якім я зараз і працую.

Вопыт працы?

Першае пытанне, якое задаюць усе наймальнікі, — «Ці ёсць вопыт?». Калі студэнту дзесьці калісьці даводзілася працаваць па сваёй універсітэцкай спецыяльнасці, гэта яшчэ зусім не азначае, што ён паспеў разам з тым ахапіць і ўсе іншыя працоўныя сферы, а тым больш тую, у межах якой збіраецца працаўладкавацца. Таму, які там можа быць вопыт?! Але адразу «рубіць з пляча» не трэба. Можна ў рэшце рэшт трошкі, дзеля лепшага ходу падзей, і прыхлусіць. Сказаўшы, што вопыт быў, мне падаецца, бедны студэнт нікому нічога дрэннага не зробіць. Галоўнае — не забыцца адзначыць, што праца была неафіцыйная, таму і адпаведнага запісу ў працоўнай кніжцы няма (калі яна наогул ёсць). Натуральна, у такім выпадку папросяць пазначыць нумары тэлефонаў тых людзей, якія змаглі б даць рэкамендацыі. Мне падаецца, гэта не такая невырашальная праблема. У кожнага студэнта шмат добрых і надзейных сяброў, якія заўсёды змогуць дапамагчы.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Санітарная кніжка

Тут, зразумела, усё складваецца не так гладка. На атрыманне гэтай самай санкніжкі затрачваецца каля тыдня-двух, ды яшчэ і тысяч 50 беларускіх рублёў. Часам у студэнта няма ні таго, ні другога. А тым больш падчас працаўладкавання. Таму таксама застаецца толькі адно — прыхлусіць, што санкніжка робіцца і ў хуткім часе будзе гатовая. Гэта, безумоўна, не самы лепшы варыянт, але можа дапамагчы замацаваць за сабой працоўнае месца на пэўны тэрмін. Можна яшчэ папрасіць, каб узялі і без яе, праўда, паабяцаўшы, што ўсе ўрачы будуць пройдзеныя падчас працы і ў вельмі сцісłыя тэрмін. Можа пашанцаваць у тым плане, што санкніжка ў пэўнай арганізацыі і не патрэбная. Усё, чым там абмяжуюцца, — гэта медагляд, які, праўда, давядзецца праходзіць у вельмі сцісłыя тэрміны.

Працоўныя тэрміны

Пасля пытання пра вопыт працы студэнта чакае яшчэ адно — аб яе тэрмінах. Гэта значыць, на пастаянна ён завітаў, ці так, на падпрацоўку. Хоць некаторыя студэнты і застаюцца потым працаваць на доўгі тэрмін, але часцей пасля летняга перыяду амаль што ўсе яны збягаюць. Ды гэта і зразумела. Там і вучоба пачынаецца, і з сябрамі хочацца пагуляць... А калі працуеш 2 дні праз 2 ці, калі застаўся на пастаянна, кожны дзень, магчымасці пагуляць і адпачыць па поўнай праграме можа і не быць. Тут і абмежаванні ў часе, і стомленасць, і процьма іншых неабходных спраў, якія ніяк не атрымліваецца зрабіць у працоўныя дні. Таму і ўвесь вольны час адводзіцца на іх выкананне. А на кароткі тэрмін, гэта значыць, на падпрацоўку, не вельмі хочуць браць. Гэта ў асабліавых выпадках, калі ў сталых супрацоўнікаў водпускі і іх трэба кімсьці замяніць, каб месца не пуставала, наймаюць людзей на пэўны час, могуць і таго ж студэнта ўзяць. Але трэба вельмі пастараца, каб знайсці такую працу. Не спаць у шапку, бо ўсё добрае хутка расхопліваецца. Таму пры найме лепш адказваць, што ўладкаванне на пастаянны тэрмін, але пакуль без афіцыйнага афармлення, каб прыглядзецца, паспрабаваць і вырашыць, ці па сілах гэтая задача. А пакуль тое ды сёе, дык і лета скончыцца паспее.

Ці студэнт?

Гэта пытанне таксама нікога не абміне, і адназначны адказ нічога добрага ў выніку не дасць, тым больш для тых студэнтаў, якія ў будучыні запланавалі застацца на пастаянна. А тлумачыцца гэта тым, што наймальнік турбуецца аб навучальным працэсе, якому праца будзе перашкаджаць і замінаць. Адзінкі сярод працадаўцаў складаюць выключэнні і перш за ўсё пытаюцца ў студэнта яго асабістую думку. Калі таго ўсё задавальняе, дык і наймальніку няма пра што непакоіцца. Таму і трэба на гутарках адказваць, што калі трэба будзе, ты гатовы прапускаць заняткі і часам парушаць навучальны працэс, а ўсю арганізацыю такога сумбурнага жыцця ўзяць на сябе. А што ж, хочаш жыць — умей круціцца!

Зарплата

Гэта пытанне, само сабой, хвалюе кожнага. Ды ў прынцыпе дзеля іх, радзімых, таго, што звычайна называюць грашыма, і задумваецца ўвесь гэты сыр-бор з працай. Якому студэнту не патрэбная лішняя капейка? Пытанне смешнае. Толькі адзінкі ідуць працаваць не дзеля грошай, а для асабістага самасцвярджэння. Хочацца ім даказаць сабе і навакольным, што яны могуць нешта ў гэтым жыцці зрабіць самастойна. Хоць і грошы для іх у такім выпадку, як мне падаецца, немалаважны фактар. Трымаючы ў руках зароблена сваімі намаганнямі, яны адчуваюць сваю моц і незалежнасць. Звычайна за месяц студэнту абяцаюць плаціць дзесьці каля 500-600 тысяч беларускіх рублёў плюс прэмія. У выніку атрымліваецца пад 600 з хвосцікам, які вагаецца ў залежнасці ад працы і таго, наколькі ты спадабаешся кіраўніцтву. Такая зарплата звычайна разлічана на бягучы графік працы 2 дні праз 2. Але, што называецца, давярай і правярай. Трэба патрабаваць ад наймальніка працоўны дагавор, у якім будзе ясна адзначана тая сума, якую збіраюцца плаціць, працоўныя правы, абавязкі. А то ўсякае можа быць.

Натуральна, гэта яшчэ далёка не ўсё, што трэба ўлічваць пры працаўладкаванні, ды тым больш студэнту. Але асноўнае і неабходнае. Тое, што прапісана вышэй, мае за аснову асабісты жыццёвы досвед, таму і нясе ў сабе пэўную долю каштоўнай інфармацыі. Знайсці працу цяжка, асабліва зараз, падчас эканамічнага крызісу. Цяжка — але магчыма. Галоўнае не страчваць жадання і аптымізму, а астатняе неяк дадасца.

Сваім досведам дзялілася студэнтка БДПУ імя М. Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

Жывая гісторыя

Усе, хто прайшоў выпрабаванне БАМам, рэалізавалі сябе ў жыцці

Днямі ў Расіі адзначалася 35-годдзе будаўніцтва БАМа (Байкала-Амурскай магістралі). Калі для многіх сённяшніх маладых вышэй згаданая абрэвіятура — проста літары, то для людзей больш сталых гэта цэлая эпоха, час камсамольскага запалу, час вялікіх здзяйсненняў і працоўнага подзвігу на агульную карысць. Пачынаючы з 1975 на саюзную будоўлю з'язджалася моладзь з усіх куткоў СССР. Было там і шмат беларусаў. Сярод іх — студэнт 3 курса БДУ Валодзя Карагін, камандзір першага беларускага студэнцкага будатрада на БАМе. Сёння Уладзімір Мікалаевіч — старшыня Прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, чалавек вядомы і вельмі заняты. Але ён знайшоў час на сустрэчу з журналістам, каб згадаць сваю БАМаўскую маладосць (тым больш, што інтэрв'ю адбылося адразу па вяртанні з горада Тында, дзе святкавалі юбілей будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі).

— Уладзімір Мікалаевіч, прайшло 35 гадоў. Што да сённяшніх дзён захавалася ў памяці самым яркім успамінам?

— Найбольш запомніўся наш моладзевы задор і вялікая адказнасць, якую мы адчувалі, калі ўвязаліся ў такі маштабны праект... Калі паўстала пытанне аб фронце работ для нашага атрада, тагачасны лідар моладзі Паўднёвай Якуціі Дзмітрый Трафімаў прапанаваў нам узяць асобны аб'ект, які быў бы цалкам нашым — ад першага калка да апошняй цаглінкі, і якім мы маглі б потым ганарыцца. Мы ўзяліся за будаўніцтва пасёлка Сярэбраны Бор, побач з якім сёння размяшчаецца Нерунгрынская ГРЭС (яна забяспечвае энергіяй палову Якуціі!). Трэба разумець, што непасрэдна чыгунка — гэта адна сотая ад усёй інфраструктуры. БАМ — гэта пад'язныя дарогі, гэта пасёлкі з жылымі дамамі, бальніцамі, дзіцячымі садкамі, ЗАГСамі і г.д. «Жалезка» — гэта дробязь, галоўнае — асваенне зоны БАМа, фарміраванне ўсёй неабходнай інфраструктуры. Безумоўна, мы не абмежаваліся толькі Сярэбраным Борам. Працавалі на будоўлі іншых пасёлкаў (напрыклад, Залацінкі — пасёлка атрада беларускіх будаўнікоў імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Кедышкі), самога чыгуначнага палатна. Мы прыязджалі сюды працаваць на ўсё лета, восенню вярталіся на вучобу, а новым летам — зноў на БАМ. Усяго я адпрацаваў на БАМе 12 гадоў.

На будоўлі «жалезкі»

У нас быў выключна арганізаваны атрад. Кожны баец быў яшчэ і членам агітбрыгады. Паколькі мы там былі прадстаўнікамі сваёй рэспублікі, то везлі з сабой сваю сімволіку, сваю культуру, песні, паэзію, мастацтва. У нас былі слайд-фільмы пра Беларусь, і кожны наш баец апроч іншага быў яшчэ і дакладчыкам на пэўную тэму, якая датычылася нашай рэспублікі. На нашым рахунку стварэнне на БАМе некалькіх моладзевых бібліятэк. Спачатку мы разгарнулі работу ў беларускіх школах, арганізавалі збор кніг. Кожны школьнік падпісваў сваю кніжку, якую ахвяраваў бібліятэкам БАМа. Усяго мы адправілі на БАМ больш за 50 тысяч кніг, заснавалі бібліятэкі ў пасёлках Залацінка, Нерунгры, Сярэбраны Бор.

— Раскажыце, у якіх умовах вам давялося жыць і працаваць на БАМе?

— У самым пачатку (калі прыехалі ў першы раз) не было нічога. Толькі тайга, дзе трэба было «зняць» (высекчы) дрэвы, каб паставіць палаткі. Не было святла і вады (яе нам прывозілі). У нас там утварылася своеасаблівая маленькая дзяржава: мы самі забяспечвалі сябе ўсім неабходным (ніхто для нас нічога загадзя не рыхтаваў). Камандзір павінен быў усім забяспечыць сваіх байцоў, усё арганізаваць. А я тады быў студэнтам 3 курса БДУ (праўда, ужо з вопытам кіравання будатрадамі). Наладжваць побыт нам давялося «з нуля». Тое ж датычылася і будаўнічых работ. Калі пачалі ўзводзіць фундаменты будынкаў, сутыкнуліся з праблемай — адсутнасцю неабходнага інструмента. Грунт, які трэба было капаць, паводле класіфікацыі адносіўся да 11-й катэгорыі (гэта прамерзлая скальная парода). Яе магчыма было «дзяўбці» толькі кіркамі, якіх у нас не было. Першае, што мы зрабілі, адшукалі кузні, дзе нам змаглі выкаваць кіркі для работы. Аб'ём цяжкай фізічнай працы ў надзвычай складаных умовах быў каласальны. У далейшым, у наступныя нашы заезды на БАМ, мы будавалі бетонныя дарогі, будынкі. Апроч іншага мы былі далучаны і да кіравання будоўляй. Я, напрыклад, некалькі гадоў быў «начным дырэктарам». Начальнік кіравання будаўніцтвам давяраў мне 5 тысяч рабочых, чыя змена доўжылася з 8 гадзін вечара да 8 гадзін раніцы (будоўля працавала круглыя суткі). Я на той час ужо скончыў БДУ, працаваў выкладчыкам. На БАМе я вёў і навуковую работу — быў адным з аўтараў канцэпцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Паўднёва-Якуцкага тэрытарыяльна-вытворчага комплексу.

— А як вы адпачывалі, бавілі вольны час?

— На БАМе нам хацелася як мага больш паглядзець, таму ў выхадныя дні мы вывозілі людзей і ў былыя Сталінскія лагеры, на арцелі старацеляў, дзе здабывалі золата, бачылі, як здабываюць алмазы, слюду, наведвалі выбраныя ўранавыя руднікі, вугальны разрэз, аб'екты іншых падраздзяленняў БАМа. Знаёміліся з нацыянальнай культурай і ладам жыцця якутаў, эвенкаў, нацыянальным эпасам «Алонха». Мы прывезлі з сабой апаратуру для дыскатэкі, запісы. У нас былі самыя лепшыя дыскатэкі на БАМе. Можаце сабе ўявіць: мы нават лазеры з сабой прывезлі!

— А тады ўжо былі лазеры?

— Былі. Нашы фізікі Валодзя Кустаў і Коля Марціновіч, якія пазней сталі кандыдатамі навук, паклапаціліся пра гэта. Такім чынам, у нас былі дыскатэкі з лазерамі, якія мы ладзілі некалькі разоў на тыдзень.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ»)

Э. Кант сцвярджаў, што праца — лепшая магчымасць адчуць асалоду жыцця, а студэнты лічаць — спосаб падзарабіць

Канікулы — гарачая пара не толькі для адпачынку, але і для працы. Толькі летам акрамя таго, што можна атрымаць загар, магчыма яшчэ і падзарабіць, асабліва студэнту, які не ведае як і чым сябе заняць падчас адпачынку. Ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела, сцвярджаюць студэнцкія забабоны. А чым жа яны займаюцца пасля? Варта адзначыць, што кожны дзясяты малады чалавек не марнуе час дарма, а шукае сваё месца пад сонцам. Сёлета для моладзі падрыхтавана 1230 працоўных месцаў — і гэта толькі ў Мінску, абласныя цэнтры не адстаюць.

Большасць студэнтаў не згодная са сваім матэрыяльным становішчам, бо стыпендыі, шчыра кажучы, не зусім высокія, у інтэрнаты засяляюць не ўсіх ахвотных, бацькі не заўсёды могуць матэрыяльна дапамагчы, што і падштурхоўвае шукаць альтэрнатыўныя крыніцы прыбытку. Праца дазваляе маладым людзям атрымаць досвед у галіне прафесійных стасункаў, развівае пачуццё самастойнасці і адказнасці за свае ўчынкі. Далёка не апошнюю ролю адыгрывае і матэрыяльная зацікаўленасць. Нават невялікі заробак дазволіць адчуць сябе больш дарослым, а досвед, набыты на любой працы, павялічвае ўзровень адаптацыі ў грамадстве.

Працаўладкаванне моладзі на часовыя працоўныя месцы ажыццяўляецца згодна з заканадаўствам аб працы РБ. Працягласць працоўнага дня для моладзі на перыяд летніх канікулаў не можа перавышаць 40 гадзін на тыдзень.

Існуе шэраг праграм, накіраваных на працаўладкаванне студэнтаў на перыяд летніх канікулаў у студэнцкія будаўнічыя, сельскагаспадарчыя, педагагічныя і валанцёрскія атрады. У рамках праграм студэнты атрымліваюць магчымасць працаваць і адначасова адпачываць у Крыме і на тэрыторыі Беларусі. Для студэнтаў педагагічных універсітэтаў самым распаўсюджаным заняткам з'яўляецца праца важатага ў летніку. Заробак вагаецца ад 150 да 500 тысяч (з агульнага заробку адлічваюцца грошы на ежу і падаткі). Праца дастаткова цікавая, але напружаная і вельмі адказная. Можна сумясціць прыемнае (заробак) з неабходным (практыку ніхто не адмяняў).

Магчымы і іншы варыянт заробку для студэнтаў з педагагічнай адукацыяй — праца ў дзіцячым садку выхавальнікам або яго памочнікам (нянькай). Выхавальнік працуе па 5-6 гадзін у дзень, пяць дзён на тыдзень. Малады спецыяліст, які працуе на няпоўную стаўку, без папярэдняга вопыту і катэгорый можа смела разлічваць на 200—300 тысяч. Варта ўлічыць, што для працаўладкавання неабходна зрабіць санітарную кніжку, якая каштуе каля 35 тысяч, а таксама ўзяць даведку з дэканата той навучальнай установы, якая забяспечвае вашу падрыхтоўку як спецыяліста. Бацькі давяраюць самае дарагое ў сваім жыцці выхавальніку, які ў сваю чаргу зарабляе менш чым аддае, а аддае педагог усяго сябе, часцінку сваёй душы. Для працы нянькай спецыяльнай адукацыі не патрабуецца, як і навыкаў. Патрабаванні тыя ж, што і да выхавальніка, але меншая адказнасць і, як ні дзіўна, большы заробак (300—350 тысяч).

Маладыя людзі маюць магчымасць праявіць свой талент на аб'ектах горада і за яго межамі на працы ў будаўнічых атрадах БРСМ. Работа фізічна цяжкая і складаная. Заробак вагаецца ў межах 500 тысяч, але залежыць ад якасці і тэрміну выканання паслуг.

Наступны від дзейнасці не такі прэстыжны. як папярэднія, ды і заробак невысокі: аказанне паслуг па прафесійнай прыборцы памяшканняў. Шэраг кампаній запрашае студэнтаў на пастаянную (230—250 тысяч) і частковую занятасць (заробак залежыць ад колькасці гадзін). Праца на вядомых аб'ектах горада па падтрымцы чысціні на спецыялізаваным еўраабсталяванні. Вакансіі ў розных раёнах горада, гнуткі графік працы.

Праца прамоўтара гандлёвага цэнтра заключаецца ў тым, каб звяртаць увагу мінакоў на яго асартымент. Патрабаванні: добра пастаўлены голас, прывабная знешнасць, камунікабельнасць. Заробак выплачваецца ў залежнасці ад якасці працы і здзельна-прэміяльнай дамоўленасці.

Наступная прафесія, на якую хацелася б звярнуць увагу — расклейванне аб'яў. Калі ты малады і энергічны, добра ведаеш горад і яго раёны, то гэта праца для цябе. Сума зароблены грошай залежыць ад колькасці расклееных аб'яў.

Таксама можна падзарабіць, працуючы паштальёнам, раскідваючы газеты і часопісы па паштовых скрынях. Па інфармацыю звяртайцеся ў мясцовыя аддзяленні сувязі.

Знойдзецца праца і для тых, хто любіць і шануе прыроду. Уладкавацца можна ў «Мінскзелянстрой». З раніцы да вечара супрацоўнікі ўпрыгожваюць горад: саджаюць і паліваюць кветкі, прыбіраюць смецце. Дадатковыя звесткі можна атрымаць па тэлефоне інфармацыйнай службы вашага горада.

Яшчэ можна паспрабаваць сябе ў якасці прадаўца квасу і іншага пітва, марожанага, цацак або шарыкаў. Як відаць, асартымент — на любы густ, шырокае поле дзейнасці. Але часцей за ўсё ад студэнта патрабуецца невялікі досвед у вышэй названай галіне, санкніжка, даведка, пашпарт. Заробак не большы за 350 тысяч.

Сёлета на рынку працы ёсць чым заняцца і творчым асобам. Калі любіш танчыць і спяваць, атрымліваць асалоду ад самога працэсу, то «масоўка» — проста выратаванне ад фінансавага крызісу. Запрашаецца творчая таленавітая моладзь для здымак у кінастужках, кліпах і рэкламных роліках. За 8—10 гадзін ёсць рэальная магчымасць зарабіць 10—15, за тыдзень — каля 100 тысяч.

Памер заробку ў месяц вызначаецца не ніжэйшы за мінімальную заработную плату за перыяд выканання работы, якая аплачваецца.

Часовая і пастаянная занятасць моладзі арганізавана з мэтай зацікавіць моладзь грамадска-карыснай працай і забяспечыць атрыманне ўменняў і навыкаў, з мэтай адаптацыі да сферы дзейнасці, падрыхтоўкі да самастойнага выхаду на рынак працы, паляпшэння матэрыяльнага становішча.

Згодна з пастановай Савета Міністраў краіны, па ініцыятыве грамадскіх арганізацый моладзі ў БДУ быў створаны Студэнцкі цэнтр занятасці, які працуе пад эгідай БРСМ. Гэтая арганізацыя прапануе студэнтам вакансіі, якія паступаюць з Мінскага гарадскога цэнтра занятасці насельніцтва, з інтренет-крыніцы інтэрнэт, з газет і непасрэдна ад прадстаўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый розных формаў уласнасці. Трэба адзначыць, што Студэнцкі цэнтр занятасці арыентаваны на працаўладкаванне менавіта студэнцкай моладзі Мінска, таму вакансіі прапануюцца на няпоўны працоўны дзень, з гнуткім графікам, якія не патрабуюць спецыяльнай адукацыі. Па дадатковыя звесткі звяртайцеся ў мясцовае Аддзяленне занятасці насельніцтва да спецыялістаў.

Праца нагадвае прыгожую жанчыну: яна не любіць чакаць і марнаваць час. Таму, калі ты вырашыў распачаць свой працоўны шлях даўжынёй у жыццё, паспрабуй спачатку настроіцца на пазітыў, каб выбраць правільную дарогу...

Наталля ГАЛІЕЎСКАЯ.

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 года

ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 8

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2009 г.	01.07.2008 г.
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	9 855,9	6 328,4
3	Средства в Национальном банке	1102	8 464,0	10 279,4
4	Ценные бумаги:	1103	0,0	0,0
	для торговли	11031	0,0	0,0
	удерживаемые до погашения	11032	0,0	0,0
	в наличии для продажи	11033	0,0	0,0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	31 707,6	13 649,0
6	Кредиты клиентам	1106	74 647,1	76 743,4
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	0,0	0,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	25 771,7	17 945,5
9	Прочие активы	1109	1 731,5	1 803,5
10	**ИТОГО активы**	**110**	**152 177,8**	**126 749,2**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	0,0	0,0
13	Кредиты и другие средства банков	1205	15 139,5	19 013,7
14	Средства клиентов	1206	86 999,3	62 473,2
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	3 230,7	6 169,4
16	Прочие обязательства	1209	3 892,0	3 609,1
17	**ВСЕГО обязательства**	**120**	**109 261,5**	**91 265,4**
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	19 989,1	16 864,4
20	Эмиссионные разницы	1212	0,0	0,0
21	Резервный фонд	1213	3 018,8	2 550,2
22	Накопленная прибыль	1214	5 771,6	5 724,0
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	14 136,8	10 345,2
24	**ВСЕГО капитал**	**121**	**42 916,3**	**35 483,8**
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**	**152 177,8**	**126 749,2**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	83 117,0	41 362,1
28	Обязательства	1302	37 990,0	25 353,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 года

ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2009 г.	01.07.2008 г.
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	8 314,2	4 437,9
2	Процентные расходы	2012	4 268,3	1 999,8
3	**Чистые процентные доходы**	**201**	**4 045,9**	**2 438,1**
4	Комиссионные доходы	2021	4 061,0	4 088,5
5	Комиссионные расходы	2022	316,9	204,0
6	**Чистые комиссионные доходы**	**202**	**3 744,1**	**3 884,5**
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	1 883,3	2 046,2
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	7,7	-4,0
9	Доход в форме дивидендов	205	0,0	0,0
10	Чистые отчисления в резервы	206	510,8	14,3
11	Прочие доходы	207	1 222,2	1 207,1
12	Операционные расходы	208	6 874,7	6 459,5
13	Прочие расходы	209	1 074,3	340,5
14	Налог на прибыль	210	754,3	892,3
15	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**1 689,1**	**1 865,3**

Председатель Правления А.Е. Киреев

Главный бухгалтер Н.А. Кузьмицкая

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 20 от 13.11.2008 г. УНП 100195493. ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

ПАДАРОЖЖА ПА КАНАПАХ,

або Каўчсёрфінг як абмен гасціннасцю

Пазнаём Свет

Танна і цікава паездзіць па свеце — мара ледзь не кожнага студэнта. Асабліва пасля сесіі, асабліва летняй. І калі грошай на дарогу можна наскрэбці, то шмат каго спыняюць кошты пражывання ў замежных краінах. Аднак вынаходлівыя студэнты стварылі каўчсёрфінг — магчымасць пажыць «за так» у розных краінах свету.

Каучсёрфінг — даслоўна «падарожжа па канапах». Гэта гасцявая сістэма падарожжаў, калі вы знаходзіце чалавека, які можа пусціць вас пажыць нейкі час у сваёй кватэры. Бывае, што разам з начлегам вы атрымліваеце экскурсію па горадзе, дэгустацыю нацыянальных страў і іншыя прыемныя моманты (усё залежыць ад чалавека). У адказ вы таксама павінны быць гатовымі да прыезду гасцей. Займацца каўчсёрфінгам можна і без атрымання жылля. Часта замежнікам патрэбны экскурсавод па горадзе і проста чалавек, з якім можна схадзіць у кавярню папіць гарбаты.

Абмен гасціннасцю, па розных крыніцах, пачаўся пасля Другой сусветнай вайны. Амерыканец Боб Лутвейлер стварыў міжнародную арганізацыю Servas. Праз стварэнне сусветнай сеткі людзей, якія гатовы адкрыць свае дамы падарожнікам, ён імкнуўся развіваць міжкультурнае разуменне і спрыяць міру на планеце. Быў таксама і клуб HomeLink International амерыканскіх і англійскіх настаўнікаў, якія хацелі правесці адпачынак у іншых краінах. Стварыліся аб'яднанні для байкераў, аўтаспыншчыкаў і г.д.

1,2 мільёна чалавек па ўсім свеце

Аднак сапраўдную папулярнасць каўчсёрфінг набыў пры развіцці інтэрнэта. Калі раней спісы ахвотных даводзілася друкаваць і адпраўляць членам арганізацыі, то цяпер хапае кліку мышкай, каб знайсці больш за мільён чалавек, якія могуць даць жыллё па ўсім свеце. Першы сайт www.hospitalityclub.org з'явіўся дзякуючы нямецкаму студэнту Файту Кюэ. Хлопец арганізаваў яго для людзей, якія хочуць бясплатна атрымаць часовае жыллё.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ»).

Англічанін Стыў (у цэнтры) у інтэрнаце БДУ.

Усе, хто прайшоў выпрабаванне БАМам, рэалізавалі сябе ў жыцці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Акрамя таго, мы выступалі з канцэртамі. Наша агітбрыгада дала на БАМе дзясяткі канцэртаў. Уяўляеце, пасля 12-гадзіннай змены мы яшчэ выступалі, чыталі лекцыі.

— А з якім нумарам выступалі вы?

— Я быў вядучым канцэртаў. У нас былі цудоўныя сцэнкі, тэатр мініяцюр. Наша Лёка Гашына — доктар атрада (сёння яна працуе ў дзіцячым хірургічным цэнтры) цудоўна спявала песні пад гітару. Лёку Гашыну ведаў увесь БАМ. Кожнае лета, у жніўні, на БАМе праводзіўся фестываль аўтарскай песні, і Лёка заўсёды там выступала. Апроч таго, што яна была ўрачом атрада, яна яшчэ працавала ў брыгадзе па бетонных работах і сама заўсёды брала на сябе самыя цяжкія нагрузкі. Лёка ў нас была энтузіясткай-завадатаркай, а як урач выратавала некалькі жыццяў. Увогуле, у нас было даволі многа дзяўчат. Яны былі кухарамі, медыкамі, малярамі. Узгадаю Тамару Станькову, Валянціну Марціновіч, Ірыну Піўчанку, Люду Сямёнаву, Іну Шалахаву.

— Хто з вядомых сёння людзей быў байцом першага беларускага студэнцкага будатрада?

— Намеснік міністра культуры Віктар Кураш, рэктар універсітэта культуры Барыс Святлоў, старшыня Савета заснавальнікаў інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва Алег Марозаў, пракурор Бабруйска Анатоль Траццякоў, намеснік дэкана мехмата БДУ Дзмітрый Мядзведзеў, доктар геолага-мінералагічных навук Уладзімір Левашкевіч, доктар гістарычных навук прафесар БДУ Анатоль Разанаў, палкоўнік Уладзімір Стужук, паэт Леанід Пранчак, вядомыя журналісты Сяргей Новікаў, Уладзімір Дзюба, Уладзімір Капскі, Аляксандр Андрэеў, Васіль Анісенка, прадпрымальнік Васіль Аўдзеенка. Неаднаразова браў удзел у будаўніцтве БАМа заслужаны артыст Беларусі, оперны спявак Віктар Стральчэня (яго называлі залатым голасам Беларусі). У розны час байцамі нашага атрада станавіліся вядомыя кампазітары Уладзімір Буднік, Васіль Кандрасюк, спевакі Уладзімір Колін, Раман Жабінскі. Яны працавалі на будоўлі і ездзілі з канцэртамі ў складзе агітбрыгады.

— На БАМ бралі ўсіх ахвотных?

— Вядома, не. Быў адбор. Абавязковыя патрабаванні — фізічнае здароўе і вопыт працы на будоўлі. Трапіць у БАМаўскі атрад, які называўся СБА (студэнцкі будаўнічы атрад) імя Ленінскага камсамола, было складана. Каб атрымаць неабходны досвед, я спачатку ўзяў удзел у будаўніцтве бетонных дарог Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, будаваў піянерскія лагеры ў Радашковічах для заводаў «Гарызонт» і «Тэрмапласт» (ужо тады я быў камандзірам атрада), узводзіў фундамент кампрэсарнай станцыі газаправода Таржок—Мінск—Івацэвічы пад Крупкамі, быў на меліяратыўных работах на Міншчыне. Акрамя таго, мы праверылі свае сілы і цягавітасць у зімовых атрадах (між іншым, сталі першымі ў Саюзе студэнтамі, хто распачаў такую практыку!). Зімой 1974-га і 75-га мы будавалі вытворча-тэхнічнае вучылішча меліяратараў у Валожыне, аб'екты завода імя Вавілава. І толькі пасля работы на будаўнічых аб'ектах у Беларусі і Томску мяне выбралі камандзірам будатрада на БАМе. Астатнія мае байцы таксама мелі папярэдні вопыт зімовых студэнцкіх будатрадаў. Мы з'ядналіся ў працы, выступалі разам і як агітбрыгада (выязджалі з выступленнямі ў калгасы, у населеныя пункты). Такім згуртаваным калектывам мы і накіраваліся на БАМ.

Лёка ГАШЫНА.

Увесь наш атрад быў падзелены на брыгады. Мы загадзя прыкінулі верагодныя спецыяльнасці, якія там нам могуць спатрэбіцца. Тыя, каму не хапала профільных ведаў, прайшлі спецыяльныя курсы, атрымалі пасведчанні. Гэта была сур'ёзная прафесійная падрыхтоўка. Я сам вучыўся на філасофскім аддзяленні БДУ. Зразумела, да будаўніцтва мая спецыяльнасць не мела ніякага дачынення. Мне давялося ісці на будаўнічы факультэт БПІ і вывучаць тэхналогію будаўнічай вытворчасці. Затое потым, на БАМе, я змог быць прарабам, начальнікам участка і нават галоўным дыспетчарам.

Менавіта на БАМе я «заразіўся» кіраваннем і пытаннямі эканомікі, калі пазнаёміўся з акадэмікам Абэлам Аганбегянам. Гэта ён мяне, студэнта 3 курса, уключыў у даследчыя навуковыя праграмы комплекснага асваення Якуціі.

— Ці былі людзі, якія не вытрымлівалі нагрузак і цяжкіх умоў і вярталіся дамоў?

— Вядома ж, былі. Сур'ёзным выпрабаваннем была сама дарога да месца будоўлі — гэта 8—10 тысяч кіламетраў у адзін бок, 7 часавых паясоў. Таму мы намагаліся браць у атрад толькі фізічна здаровых людзей. Вы ж разумееце, мы не маглі рызыкаваць. Былі і такія, каго мы самі адпраўлялі з будоўлі дамоў. На БАМе панаваў «сухі закон», дысцыпліна была вельмі жорсткая. Раніца заўсёды пачыналася з пастраення, з пад'ёму сцяга.

З Ігарам ЛУЧАНКОМ.

У нашым атрадзе мы ўкаранілі прынцыпы камуністычнай крамы. Загадчык гаспадарчай часткі прывозіў у атрад розныя патрэбныя дробязі (цукеркі, цыгарэты, мыла, зубную пасту і г.д.). Усё гэта ён выстаўляў навідавоку, побач ставіў скрыню для грошай і клаў сшытак. Тут жа віселі цэны на ўсе тавары. Кожны з байцоў выбіраў тое, што яму патрэбна, клаў грошы ў скрыню ці запісваў сваю «пазыку» ў сшытак. Па заканчэнні сезона мы заўсёды падводзілі баланс, і кожны раз грошай было больш, чым агульны кошт набытых тавараў. Ніколі не было недастачы! А гэта сведчыць аб выключнай сумленнасці людзей.

— Ведаю, што будоўлю БАМа наведаў і тагачасны намеснік галоўнага рэдактара «Чырвонай Змены» Анатоль Бутэвіч...

— Гэта было ў 1976 годзе. 2 красавіка мы адзначалі гадавіну высадкі першага беларускага будаўнічага атрада імя Мікалая Кедышкі на аб'екты Паўднёва-Якуцкага ўчастка БАМа. З гэтай нагоды творчая брыгада ЦК камсамола Беларусі, у складзе якой, акрамя Бутэвіча, былі музычныя дзеячы Ігар Лучанок, Вольга Шутава, паэт Генадзь Бураўкін, правяла сустрэчу з работнікамі будоўлі. Гэта была самая цудоўная вечарына, на якой мне калі-небудзь даводзілася прысутнічаць. Між іншым, на маёй спіне Ігар Лучанок напісаў песню «Залацінка». Ідэя прайшла да яго на месцы, у пасёлку Залацінка, кампазітару не было на што абаперціся, таму ў якасці рабочага стала ён выкарыстаў маю спіну.

— На святкаванні 35-годдзя будаўніцтва БАМа вы былі адзіным прадстаўніком беларускіх будатрадаўцаў. Якія эмоцыі ў вас выклікаў сённяшні БАМ?

— Выключна станоўчыя. Мне было прыемна прайсціся па дарогах, якія мы пабудавалі больш за 30 гадоў таму, пачуць ацэнку мясцовых жыхароў, якія прызналі, што беларусы будавалі вельмі якасна (бетон нідзе не разваліўся, хоць па плане ён павінен быў пратрымацца толькі 20 гадоў). Увогуле, усе людзі, якія прайшлі выпрабаванне БАМам, здолелі рэалізаваць сябе ў жыцці. Сёння гэта вядомыя прадпрымальнікі, рэктары ВНУ, вучоныя, дырэктары школ. У суботу, 18 ліпеня, у Інстытуце парламентарызму і прадпрымальніцтва а 14-й гадзіне адбудзецца сустрэча ветэранаў першых студэнцкіх будатрадаў. Плануецца, што збярэцца каля 60 чалавек. Магчыма, будуць і госці з БАМа. Калі ласка, прыходзьце.

— Дзякуй за размову.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.
Фота з асабістага архіва Уладзіміра КАРАГІНА.

ПАДАРОЖЖА ПА КАНАПАХ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Адзін з самых папулярных сайтаў на сёння — www.couchsurfing.com. Ідэя яго стварэння прыйшла ў галаву амерыканскаму студэнту Кэйсі Фентану, калі ён захацеў наведаць Ісландыю. Пералёт з Бостана да Рэйк'явіка каштаваў так шмат, што хлопцу не заставалася грошай на гатэль. Тады ён адправіў 1500 электронных лістоў студэнтам Ісландскага ўніверсітэта з просьбай часовага прытулку. Яму адказала 50 чалавек. Пасля падарожжа Кэйсі вырашыў стварыць сусветную сістэму для тых, хто знаходзіўся ў такой сітуацыі, як ён. І ў 2004 годзе на прасторах інтэрнэту з'явіўся сайт www.couchsurfing.com. Зараз на ім зарэгістравана больш за 1,24 млн чалавек з 232 краін свету, якія жывуць у 61 714 гарадах планеты.

Беларускіх каўчсёрфераў больш за 900 чалавек

Што датычыцца Беларусі, то на сайце **www.couchsurfing.com** зарэгістравана 918 чалавек. Антон Трафімовіч пяцікурснік БДУ з дапамогай каўчсёрфінгу ўжо пабываў у Фінляндыі, Швецыі, Венгрыі, Аўстрыі, Славакіі.

— Першы раз мы з сябрамі адправіліся ў Хельсінкі. Нам проста патрэбен быў танны хостэл, — тлумачыць Антон. — І вось тады я зарэгістраваўся на сайце. Сябры сказалі, што класная штука. Мяне і яшчэ адну дзяўчыну ў пятніцу а шостай сустрэў фін Віле Тарке. Адвёў да сябе, лазанню прыгатаваў, аддаў ключы. Сказаў: «Вось вам, спіце. Вечарам убачымся». І сышоў. Мы былі ў горадзе два дні. Але з ім асабліва шмат не тусаваліся. Ён быў заняты, а мы па горадзе бадзяліся.

У Стакгольме Антона прымаў швед Магнус — чыноўнік гарадскога парламента. На той момант у яго ўжо месяц жыў адзін бельгіец, а праз некалькі дзён прыехаў амерыканец.

— Магнусу 37 гадоў. І ён пастаянна прымае ў сябе каўчсёрфераў, — расказвае Антон. — У яго вялізная кватэра, двухузроўневая, месца там для ўсіх хапала. Для каўчсёрфераў у яго ёсць асобны пакой — бібліятэка, там глобус 20-х гадоў стаіць, кніжкі розныя. Мы раніцай з'язджалі, а вечарам вярталіся назад. Гулялі з бельгійцам, пасля з амерыканцам.

У Вене Антона і яго сяброў сустракала дзяўчына Юлія. Яе кватэра знаходзіцца ў самым цэнтры горада. Гэта дом пачатку XX-га стагоддзя.

— Яна жыве на шостым паверсе, адкуль адкрываецца фантастычны від на дахі і вежы цэрквы старой Вены, — гаворыць Антон.

Бацька Юліі — намеснік дырэктара музея Альберціна (адзін з самых вядомых музеяў у Вене). Ён павадзіў хлапцоў па музеі, паказаў усё.

— Мы схадзілі на выставу Рыхтара, авангардыстаў і французскіх імпрэсіяністаў, — гаворыць Антон. — Юля і яе бацькі нас частавалі сваімі аўстрыйскімі стравамі — шніцаль з сочывам. Мы нават хадзілі на вячэру да Юліных сяброў. А сама дзяўчына скіроўвала, куды можна схадзіць у Вене. Каўчсёрфінг класны тым, што ты едзеш як бы ў госці да каго-небудзь. Ёсць шанц, што гэты чалавек можа паказаць табе горад.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ!

На сайце www.couchsurfing.com зарэгістравана больш за 1,24 млн чалавек з 232 краін свету, якія жывуць у 61 714 гарадах планеты.

Сярэдні ўзрост каўчсёрфера — 27 гадоў.

Самыя распаўсюджаныя мовы — англійская, французская, іспанская, нямецкая і італьянская.

Найбольш папулярныя гарады наведванняў — Парыж, Лондан, Берлін, Манрэаль, Стамбул.

Каўчсёрферы зарэгістраваны нават у Батыкане, Антарктыцы, Акеаніі.

«Я хацеў бы пабываць у беларускай вёсцы»

Да Антона прыязджаў англічанін Стыў. Родам з Манчэстэра, ён тры дні жыў у студэнцкім інтэрнаце БДУ.

— Яго пусцілі, з цяжкасцямі, але прапусцілі, — кажа Антон. — Ён на той час ужо чацвёрты месяц падарожнічаў па ўсходняй Еўропе. Два дні быў у Брэсце і чатыры ў Мінску. Пасля ён ужо не хацеў нікуды з'язджаць. Шэсць дзён — гэта для яго вельмі мала. Але ў нас гэтыя ўмовы рэгістрацыі для замежнікаў складаныя ды і візу цяжка атрымаць. Праўда, нават за гэтыя дні ён паспеў схадзіць ва ўніверсітэт на заняткі, расказваў пра сябе. Там назбіраў грошай на падарожжа ў вёску. Ён прыйшоў у аўдыторыю БДЭУ, куды яго запрасілі знаёмыя, расказаў пра сябе, а пасля кажа: «Я хацеў бы пабываць у беларускай вёсцы». Выкладчыца сказала, што ў яе бабуля жыве ў вёсцы пад Івянцом. Гэта 90 км ад Мінска. Маўляў, калі на бензін грошы будуць, дык можна і паехаць. Тут адна група скінулася, другая, так ён сабе зарабіў.

Каўчсёрферы ў Стакгольме: амерыканец, бельгіец і два беларусы.
Фота Анатоля ТРАФІМОВІЧА

Як пачаць?

Для таго, каб пачаць займацца каўчсёрфінгам, вам патрэбен камп'ютар і інтэрнэт. Рэгіструецеся на сайце, запаўняеце анкету. Лепш ведаць англійскую мову, таму што большасць сайтаў мае дрэнны рускі пераклад. Можаце зарэгістравацца групай сяброў. Пажадана дадаць фотаздымак, бо многія каўчсёрферы прытрымліваюцца правіла — не звяртацца да тых, хто зарэгістраваны без фота. Важна таксама найбольш поўна расказаць пра сябе, каб астатнія ведалі, якімі мовамі вы валодаеце, вашы звычкі, пра наяўнасць хатніх жывёл, дзяцей, і г.д. Гэта дазволіць пазбегнуць непрыемных сітуацый, калі ў вас поўны дом катоў, а ў вашага госця — алергія на шэрсць.

Што датычыцца бяспекі, то на сайце ёсць магчымасць пісаць водгукі пра наведвальнікаў. І натуральна, калі ў вас будзе негатыўны водгук, то далей падарожнічаць такім спосабам стане вельмі складана.

Карысныя сайты:
www.couchsurfing.com, www.hospitality.org — самыя буйныя;
www.place2stay.net, www.globalfreeloaders.com — больш дробныя

Пасля рэгістрацыі вы шукаеце патрэбную краіну і горад. На сайце ёсць статыстыка колькасці каўчсёрфераў у пэўным горадзе. Вы спісваецеся з людзьмі, якія вам спадабаліся, дамаўляецеся, на якіх умовах прыедзеце. Можаце нават скласці адпаведны маршрут падарожжа па некалькіх гарадах. Пасля ідзяце на чыгуначны вакзал ці ў аэрапорт па білет, альбо едзеце аўтаспынам.

— Каўчсёрфінг — гэта магчымасць падарожнічаць самому, а таксама імкненне зрабіць больш лёгкім знаходжанне замежнікаў у краіне, — кажа Антон Трафімовіч. — Цікава сустракаць людзей з розных краінаў, заводзіць новыя знаёмствы, бавіць час і старацца паказаць Беларусь у лепшым свеце.

Настасся ЗАНЬКО.

Экскурсія па цудоўных аб'ектах

НА МІНШЧЫНЕ РАСПРАЦАВАНЫ МОЛАДЗЕВЫ ТУРЫСТЫЧНЫ МАРШРУТ

Праект «Сем цудаў прыроды» стартаваў летась на сайце Мінскага абласнога камітэта БРСМ brsmok.by. На суд былі вынесены 34 найбольш цікавыя помнікі прыроды з розных куткоў сталічнага рэгіёна, за кожны з якіх можна было прагаласаваць у інтэрнэт-прасторы. У выніку наведвальнікі сайта вызначылі найлепшыя аб'екты, па якіх і быў распрацаваны моладзевы турыстычны маршрут. Яго прэзентацыя адбылася днямі ў Рэспубліканскім Доме моладзі.

— Спецыфікай маршрута з'яўляецца тое, што ў яго аснове — прыродныя аб'екты, — расказаў другі сакратар абкама БРСМ Максім Басалыга. — Пры арганізацыі праекта «Сем цудаў прыроды» мы ставілі перад сабой задачу перш за ўсё зацікавіць маладых людзей актыўным адпачынкам, праз які выхаваць у іх павагу да гістарычных, культурных помнікаў Беларусі.

Па выніках інтэрнэт-галасавання наведвальнікамі сайта лепшымі былі названыя такія аб'екты: «Клецкі дуб», «Востраў Замак» і «Блакітныя азёры», што ў Мядзельскім раёне, «Вырацішынскі крыж», «Елка плакучая» і «Рака Вілія», што ў Вілейскім раёне.

Пры падвядзенні вынікаў галасавання быў распрацаваны моладзевы турыстычны маршрут працягласцю 200 кіламетраў, у які ўвайшлі 2 раёны — Мядзельскі і Вілейскі. Тут знаходзіцца большасць аб'ектаў з ліку пераможцаў і намінантаў: легендарнае возера Нарач, рака Вілія, Вілейскае вадасховішча, востраў-замак на возеры Мядзел, дзе захаваліся рэшткі гарадскіх умацаванняў XI стагоддзя, унікальныя плакучая елка і блакітныя азёры. Адлегласць паміж аб'ектамі складае не больш як сем кіламетраў.

Першымі па маршруце пройдуць актывісты «Беларускай рэспубліканскай скаўтскай асацыяцыі». Хлопцы і дзяўчаты будуць весці інтэрнэт-дзённік на сайце абласнога камітэта БРСМ, дзе падзеляцца сваімі ўражаннямі. Таксама на беразе Вілейскага вадасховішча адбудзецца турыстычны злёт.

Аксана КОЗІНАВА.

Яны жывуць на Зямлі і мысляць глабальна

Колькі хвілінаў у дзень вы думаеце пра размяшчэнне ПРА ў Чэхіі і Польшчы? А пра ксенафобію ці правы розных меншасцяў у цывілізаваным грамадстве? Дзве-тры хвіліны? Менш? Зусім не думаеце? Можа, тады вас турбуе праблема раставання ледавікоў? Што, зусім не? І сапраўды, чаму нас, звычайных беларусаў, павінна хваляваць раставанне ледавікоў за сотні, тысячы кіламетраў ад Беларусі?! Няхай праблему вырашаюць вучоныя. Нам жа справа да яе як пінгвінам да прагнозу надвор'я ў Афрыцы. Згадзіцеся, цынічна. Добра, што гэты цынізм не падзяляе сучасная моладзь. Моладзь, якая бярэ ўдзел у міжнароднай канферэнцыі «BelaMUN-2009».

Моладзь шукае ісціну

Беларуская мадэль ААН (BelaMUN-2009) ужо трэці год запар склікала дэлегатаў з розных краін свету. Геаграфія канферэнцыі сёлета ахапіла абшары ад Балканскага паўвострава да Прыбалтыкі, ад Германіі да Казахстана. А колькасць удзельнікаў упісваецца ў трохзначную лічбу — 270. Сваіх амбіцый не хавае дырэктар канферэнцыі Вольга Хабібуліна: «Мы ставім перад сабой мэту — стаць самай буйной і ўплывовай канферэнцыяй на постсавецкай прасторы. Пакуль што першынство трымае Санкт-Пецярбург».

Дэлегаты «BelaMUNa» — маладыя інтэлектуалы 15—20 гадоў. Што іх адрознівае ад астатніх маладых людзей? Думаю, актыўная жыццёвая пазіцыя і глыбокая зацікаўленасць у тым, што дзеецца ў свеце. Ім па зубах найважнейшыя пытанні палітыкі і эканомікі. Іх трывожыць экалагічны стан планеты. Яны, нягледзячы на свой узрост і невялікую жыццёвую практыку, ужо сёння клапоцяцца: як будуць жыць нашы дзеці? На колькі гадоў хопіць прыродных рэсурсаў? Як прыпыніць распаўсюджванне расізму? Хто паставіць кропку ў праблеме бежанства?

Традыцыя весці дэбаты бярэ вытокі з самой арганізацыі ААН. Увогуле, на прыкладзе Беларускай мадэлі можна ўбачыць, як працуе міжнародная арганізацыя ААН, як праходзяць яе пасяджэнні, якім чынам выпрацоўваюцца і зацвярджаюцца рэвалюцыі. «Калі мы мадэлюем якінебудзь орган, напрыклад, Савет Бяспекі, — распавядае Вольга Хабібуліна, — то спачатку вывучаем яго структуру, даследуем яго работу. А пасля набытыя веды пераносім на сучасныя рэаліі. І стараемся ісці ў адным рэчышчы з ААН».

Гуляем і вучымся

Мадэляванне ААН — гэта адукацыйная праграма Дэпартамента грамадскай інфармацыі ААН. Ва ўсім свеце яна набыла шырокую папулярнасць. Беларуская мадэль ААН складаецца з сямі камітэтаў. Камітэт па Раззбраенні, Экалагічны і Палітычны Камітэты, Камітэт па Правах Чалавека, Савет Бяспекі, Мадэль ЮНЕСКА і ЭКАСАК — Эканамічна-сацыяльны Камітэт. На парадку дня — самыя актуальныя і набалелыя пытанні. Кожны дэлегат адстойвае інтарэсы абранай краіны і напрамую ўплывае на прыняцце рэзалюцыі. Напрыклад, Ганна Цыгулёва з Іванава на « BelaMUNe-2009» адстойвала пазіцыю і інтарэсы Беларусі ў Камітэце па Раззбраенні. «Дэбаты былі вельмі напружаныя, — дзеліцца дзяўчына ўражаннямі, — бо праблема размяшчэння ПРА ў Чэхіі і Польшчы, што была на парадку дня, абвастрылася ў свеце.

Правілы гульні

Стыль адзення — афіцыйны. Мова стасункаў — англійская. За выкарыстанне рускай мовы дэлегатам свеціць выдаленне з залы пасяджэння, за джынсы і адкрытае дэкальтэ — туды ж дарога. Ветлівасць і карэктнасць — вось што ў цане. Уменне адстаяць сваю думку і падмацаваць яе аргументам — індэкатар кампетэнтнасці. Прынцып «Скажы гучна, каб цябе пачулі. Гаворы ціха, каб цябе слухалі» дзейнічае бездакорна. Старшыні камітэта нібы арбітры на полі бітвы. А прадстаўнікі краін выносяць свае прапановы і абмяркоўваюць іх сумесна. Тут роўнымі лічацца і магутная ЗША, і маленькая Гвінея-Бісау.

Толькі на пасяджэннях юнакі і дзяўчаты вядуць сябе як дарослыя: строга, сур'ёзна і з лёгкім імпэтам у голасе. Хлопцы — у гальштуках і касцюмах, дзяўчаты — апранутыя а-ля бізнэс-лэдзі. Па-за межамі канферэнцыі гэта цікавая, няўрымслівая і добразычлівая моладзь. Любяць смяяцца і адпачываць, лёгка заводзяць новыя сяброў, падтрымліваюць з імі сувязь і чакаюць наступнага года, каб іх зноў звёў «BelaMUN».

Мне давялося зазірнуць у самае нутро Беларускай мадэлі ААН. Бо сёлета я працавала ў камандзе прэсы « BelaMUNa». Напярэдадні канферэнцыі выйшаў першы нумар «The BelaMUN Tribune», пад канец канферэнцыі дэлегаты ўжо трымалі ў руках другі нумар. І шукалі на старонках іх фотаздымкі, цікавыя каментары, свежыя інтэрв'ю, жарты. Галоўны рэдактар «The BelaMUN Tribune» Кацярына Ільіна пракаментавала: «Мы мадэлявалі сапраўдную рэдакцыю газеты ААН з яе напружанай працай. Тры дні і тры ночы і ні гадзіны больш — вось колькі часу было адведзена на выпуск другога нумара ў 12 палосаў. Так што папрацаваць камандзе прэсы і мне асабіста давялося нямала».

І напаследак...

Моладзь, якая думае, якая разумее і якая прымае дзейсныя рашэнні. Гэта тыя, каго прадстаўнікі ААН хочуць бачыць у будучыні на сваіх месцах. Сёння дзяўчаты і юнакі проста гуляюць, заўтра — сутыкнуцца з праблемамі твар у твар, як дарослыя. А жыццё... Яно не церпіць уцёкаў. І праблемы будуць вырашаны толькі сумеснымі сіламі і толькі падрыхтаванымі для вырашэння праблем людзьмі. І гэта будзе моладзь «BelaMUNa».

Наталля СЕРГУЦ.

Вучымся на чужых памылках

Скончылася чарговая ўступная кампанія. Хтосьці з абітурыентаў радуецца набраным высокім балам, а нехта застаўся засмучаным. Але ўжо нічога не паправіш і не зменіш, бо двойчы пісаць адзін і той жа тэст не дазваляецца. А вось у абітурыентаў наступнага года ёсць добрая магчымасць зрабіць аналіз чужых памылак і пастарацца налета не дапусціць іх. Для гэтага трэба звярнуць увагу на наступныя простыя рэчы, ігнараванне якіх прывяло не адну тысячу абітурыентаў да страты надзей на атрыманне студэнцкага білета, да суму і слёз.

Пачнём з... адзення. Адзенне павінна быць адпаведным надвор'ю. Уступная кампанія выпадае на цёплыя летнія месяцы. Летам у вучэбных карпусах холадна не бывае. Наадварот, ёсць аўдыторыі з нахілам у бок кафедры, разлічаныя на вялікую колькасць абітурыентаў (да 100 чалавек), і на апошніх месцах у іх вельмі горача. У строгім касцюме цёмнага колеру, ды яшчэ з гальштукам на шыі, або вязанай кофце будзеце аблівацца потам, а нехта можа і прытомнасць страціць. Між тым, вашы думкі павінны быць цалкам скіраваныя на выкананне тэста, а не на тое, як бы скінуць кашулю ды папіць халоднай вадзіцы.

Шануйце пашпарт. Ён — самы галоўны дакумент абітурыента. У іншых месцах яго могуць замяніць ксеракопія ці пасведчанне кіроўцы аўтамабіля, а вось на тэсціраванне без пашпарта не прапусцяць. Паклапаціцеся пра гэта: не здавайце яго на рэгістрацыю, на пастаноўку візаў для выезду за мяжу на адпачынак, для атрымання мэтавага накіравання і г.д., калі да пачатку тэсціравання застаецца мала дзён і ў вас няма ўпэўненасці, што яго вам вернуць. А яшчэ не забывайце пашпарт дома, асабліва калі кватэра знаходзіцца ў другім горадзе ці далёкай вёсцы. Праўда, члены экзаменацыйнай камісіі могуць дазволіць вам пачаць выконваць тэст пры ўмове, што вашы родныя ці знаёмыя прывязуць пашпарт на працягу адной-дзвюх гадзін. Калі ж гэтага не адбудзецца, то работа не будзе залічана. Тое ж датычыцца і пропуска на ўваход у корпус пункта тэсціравання.

Кожны год некаторая частка абітурыентаў «выбывае з гульні» з-за спазнення, і гэта пры тым, што ўсе тэсты пачынаюцца не на світанні, а ў 11 гадзін раніцы. Таму не спазняйцеся на экзамен. Натуральна, члены экзаменацыйнай камісіі могуць дазволіць абітурыенту зайсці ў аўдыторыю, калі спазненне невялікае і яшчэ не распачаталі «валізу» з заданнямі. А вось калі ўжо заданні раскрытыя, то допуск тых, хто спазніўся, строга забаронены. Дарэчы, спазненне можа адбыцца і з-за таго, што тэсціраванне часам праводзіцца ў некалькіх карпусах адной ВНУ, прычым будынкі могуць знаходзіцца на розных вуліцах. У гэтым годзе ў Мінску, як маглі, ратавалі абітурыентаў, выкарыстоўваючы спецыяльны транспарт для іх перамяшчэння па горадзе, але ўсіх уратаваць не змаглі, бо «машыну часу» так ніхто і не зрабіў. Таму абавязкова напярэдадні іспыту ўдакладніце месцазнаходжанне вашай аўдыторыі, дзе будзе праводзіцца тэсціраванне.

Зайшоўшы ў аудыторыю, сядзьце на тое месца, якое вам вызначылі члены камісіі пасля «жараб'ёўкі», і ні ў якім выпадку не перасаджвайцеся на іншае, нават калі побач ёсць мноства вольных месцаў. Тым больш, не абменьвайцеся варыянтамі тэстаў. Могуць быць вялікія непрыемнасці, бо нумар варыянта тэста не будзе адпавядаць вашаму месцазнаходжанню ў аудыторыі, а за гэта работа можа быць не залічана.

Калі перад вамі пакладуць ліст з заданнямі, накрыйце яго бланкам адказаў і чакайце дазволу членаў камісіі на пачатак выканання работы, інакш вас могуць выдаліць з памяшкання з-за парушэння прынцыпу «аднолькавыя ўмовы для ўсіх абітурыентаў». Пасля атрымання такога дазволу вам можа здацца, што вы нічога не ведаеце. Спалох — гэта тыповая рэакцыя на экзамене. Але не спяшайцеся здаваць чысты ліст і ўцякаць за дзверы (некаторыя так і робяць, пакідаючы аўдыторыю праз 7-10 хвілін пасля пачатку тэсціравання), бо ў рэальнасці кожны хоць нешта ды ведае. Урэшце можна паставіць адказ на пытанне наўздагад.

У апошні час у мэтах забеспячэння інфармацыйнай бяспекі больш строгімі сталі патрабаванні і да так званых «пабочных прадметаў» (мабільныя тэлефоны, мініпрайгравальнікі, калькулятары, ручкі і інш.). Таму аб тым, што можна браць з сабою на экзамен, а што — нельга, лепш пацікавіцца ў пунктах тэсціравання. Звычайна асноўны набор абітурыента — пашпарт, пропуск і гелевая ручка. Дарэчы, на іспытах па фізіцы дазваляецца карыстацца найпрасцейшым і нават «інжынерным» калькулятарам, аднак ён не павінен выконваць функцыі перадачы, прыёму і захоўвання інфармацыі. У калькулятары таксама не павінна быць баз звестак.

З практыкі правядзення ўступных кампаній вядома, што праблемы ў абітурыентаў з'яўляюцца яшчэ і тады, калі яны не здаюць мабільныя тэлефоны на захоўванне, пакідаюць іх у кішэнях, а тэлефоны, як на тое, звіняць прама ў час тэсціравання. У гэтых выпадках парушальнікі адразу выдаляюцца з аўдыторыі.

Як ні дзіўна, але да гэтага часу не пераводзяцца тыя, хто спадзяецца не на ўласныя веды, а на традыцыйную шпаргалку. Было вельмі шкада дзяўчат і хлопцаў, у якіх спецыялісты пунктаў тэсціравання знаходзілі пакамечаныя паперкі з найпрасцейшымі формуламі. Памятаю, як плакала адна дзяўчына, як прасілася, каб яе не выдалялі з аўдыторыі. Уяўляю пачуцці абітурыенткі ў гэты момант, бо на цэлы год адкладвалася яе магчымая студэнцкая вучоба, а што яна скажа дома родным?.. Але ж правілы правядзення іспытаў у гэтых выпадках не дапускаюць спачування. Таму запомніце: на тэсціраванні пад пільным вокам 4-6 чалавек не можа спісаць нават адмысловы фокуснік.

У час тэсціравання не размаўляйце з іншымі яго ўдзельнікамі, бо гэта марная трата каштоўнага часу. І наогул падказваць не мае сэнсу, бо ўсе астатнія — вашы канкурэнты. А яшчэ за размовы могуць выдаліць з экзамену.

Хтосьці, можа, і здзівіцца, але самае важнае для паспяховага праходжання іспыту пры любым узроўні падрыхтоўкі — спакойна і ўважліва прачытаць пытанне і зразумець, што ж там напісана. Як высвятляецца, нават вельмі добра падрыхтаванымі абітурыентамі найбольш памылак дапускаецца ў адказах на самыя простыя пытанні. Прычым таму, што яны дрэнна зразумелі сэнс напісанага. Прычын таму многа: паспешлівасць, хваляванне, няўважлівасць. Часам гэта адбываецца нават з-за таго, што чалавек проста не выспаўся.

Перад тэсціраваннем уважліва азнаёмцеся з памяткай аб правілах запаўнення бланкаў адказаў. Бывае, што абітурыенты яе не чытаюць і дапускаюць недарэчныя памылкі.

Пры запаўненні пашпартных звестак прозвішча, імя і імя па бацьку пішуцца друкаванымі літарамі. У некаторых абітурыентаў чамусьці не хапае цярпення, і апошнюю літару імя па бацьку (часцей за ўсё літару «ч») яны пішуць як прапісную. Часам друкаванае рускае «И» падобна на «Н», а «Н» на «Ч». У такіх выпадках камп?ютару будзе цяжка распазнаць напісанае.

Трэба быць вельмі ўважлівым і акуратным і пры запаўненні клетачак для адказаў, бо нават калі вы ўсе заданні выканаеце правільна, але дапусціце памылкі ў запаўненні адказаў, то потым нічога і нікому не дакажаце. Так, у адказах на заданні групы «В» па матэматыцы павінны запісвацца толькі лічбы і ні ў якім разе не літары ці абазначэнні велічынь. Аднак некаторыя, напрыклад, пішуць так: 250°, 34 м. Заданні былі выкананы сапраўды правільна, але абітурыенту за іх балы не налічаць, бо адказы запісаны не так, як трэба. Правільна — 250 і 34 адпаведна. Таму, калі нешта незразумела, то абавязкова паклічце для парады дарослага чалавека, які кантралюе ход тэсціравання ў аўдыторыі.

Наогул, не спяшайцеся здаваць выкананую вамі работу. Некалькі разоў праверце бланк адказаў, бо, пакінуўшы аўдыторыю, вярнуцца назад і нешта выправіць будзе ўжо нельга.

Кожны год бывае, што пэўная колькасць абітурыентаў не з'яўляецца на экзамен у пункт тэсціравання. Дзяржава ўлічвае такія моманты і дае шанц пры наяўнасці ўважлівых прычын запісацца на выкананне тэста па адным з прадметаў у рэзервовы дзень. Многія абітурыенты гэты шанц стараюцца выкарыстаць, але не ўсе яны будуць дапушчаны да рэзервовага тэсціравання. Галоўная ўмова, якая ставіцца прэтэндэнту — юрыдычна даказаць уважлівасць прычыны адсутнасці на экзамене ў асноўны дзень. Ведайце пра гэта, і калі з вамі здарыцца нешта незвычайнае на шляху да пункта тэсціравання, адразу ж запасайцеся даведкаю са штампам і пячаткай пэўнай установы: калі трапілі ў аварыю — з ДАІ, захварэлі — з паліклінікі, зламаўся грамадскі транспарт — з адпаведнага парка і г.д. Усе іншыя тлумачэнні («перакуліўся на машыне, страціў прытомнасць, ДАІ не стаў выклікаць, паверце на слова...»; «моцна балеў жывот, але ў паліклініцы даведку не далі, паверце...»; «спазнілася на цягнік...»; «забыў пашпарт...» і інш.) прымацца не будуць. Дарэчы, па некаторых тлумачэннях праводзяцца дадатковыя праверкі з удзелам супрацоўнікаў сілавых міністэрстваў, таму падманваць дзяржаўныя камісіі «ліпавымі даведкамі» не варта. Праўдзівасць і справядлівасць — галоўныя прынцыпы ўступнай кампаніі ў нашай краіне.

Падача дакументаў на залічэнне — справа больш простая, галоўнае — не спазніцца. Праўда, і ў ёй ёсць адна тонкасць. На некаторыя спецыяльнасці, спіс якіх прыведзены ў Правілах прыёму ў сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь, папярэдне трэба праходзіць псіхолага-прафесійную гутарку. Яна абавязковая нават для тых, хто ўжо працуе або ў год здачы тэстаў атрымаў дыплом па спецыяльнасці, адпаведнай прыведзеным у спісе. Ведайце пра гэта, бо без праходжання гутаркі, нават пры самых высокіх балах, якія вы атрымаеце па тэстах, дакументы прыёмная камісія ад вас не возьме.

Усе прыведзе

Месяц, Сонца і зноў Месяц

22 ЛІПЕНЯ мы перажывём поўнае сонечнае зацьменне. Яно будзе доўжыцца 6 хвілін 39 секундаў і стане самым працяглым зацьменнем у гэтым стагоддзі. Адпаведна і ўплыў на нас яно акажа значна большы, чым звычайнае. Пабачыць сонечнае зацьменне 22 ліпеня змогуць жыхары Кітая, Японіі, Індыі, Непала, Бутану і Маршалавых астравоў. Часткова яно будзе заўважна і на тэрыторыі Расіі (у паўднёвай частцы Сібіры і на Далёкім Усходзе), у Казахстане, у Акіяніі і ў акваторыі Ціхага акіяна.

Як сцвярджаюць астролагі, месяцавае паўценявое зацьменне 7 ліпеня адкрыла «калідор зацьменняў», які завершыцца 6 жніўня (яшчэ адным месяцавым зацьменнем). Да гэтага дня мы знаходзімся ў патоку прадвызначанасці, наканаванасці і мала што можам змяніць у сваім жыцці.

— Зацьменне нельга разглядаць як выключна негатыўны фактар, — расказвае **астролаг Уладзімір ВАСЮК.** — У астралогіі ёсць паняцце «цыкл зацьменняў» (сарас). Сонечнае зацьменне 22 ліпеня ўваходзіць у склад 136-га сарасу — цыкла паслядоўных зацьменняў, які пачаўся ў 1360-м годзе і скончыцца ў XXIV стагоддзі. У згаданы сарас уваходзіць жнівеньскае зацьменне 1991 года (час путчу ў Расіі), чэрвеньскае зацьменне ад 73 года (канец вайны ў В'етнаме, адмена золата-доларавага стандарту), чэрвеньскія зацьменні 1955-га (вайна ў Карэі) і 1937 года (пік рэпрэсій у СССР) і г.д. Зацьменне названага цыкла, якое адбудзецца 22 ліпеня, акажа значны ўплыў не толькі на рэгіёны, дзе яно будзе добра бачна, але і на ўвесь зямны шар, у тым ліку і на нас. На ўзроўні дзяржаў і рэгіёнаў уздзеянне зацьмення будзе адчувацца на працягу паўгоддзя. А аддаленыя яго вынікі мы пабачым толькі ў час наступнага зацьмення 2 жніўня 2027 года.

Негатыў сонечнага зацьмення праяўляецца ў тым, што яно робіць нейкія сітуацыі незваротнымі, таму ў час сонечнага зацьмення трэба баяцца не саміх падзей, а неабдуманасці і недальнабачнасці ў прыняцці рашэнняў. Агульная рэкамендацыя, эфектыўная падчас любога сонечнага зацьмення: не рабіць у гэты час таго, што потым захочацца выправіць. Выправіць ужо нічога будзе немагчыма. Варта запісаць галоўныя падзеі, якія адбыліся ў вашым жыцці напярэдадні зацьмення, у час зацьмення і адразу пасля яго, акрэсліць праблемы, якія стаялі на парадку дня. Гэта дапаможа вызначыць тыя кірункі развіцця падзей, якія прывядуць да станоўчых вынікаў. Прасцей кажучы, падзеі пасля зацьмення будуць развівацца ў тым кірунку, у які яны былі зарыентаваны на момант зацьмення. Калі гэта быў ланцужок негатыўных падзей, значыць, чалавеку давядзецца ў далейшым прыкласці вельмі шмат намаганняў, каб нейтралізаваць негатыў і змяніць сваё жыццё да лепшага. Калі наадварот — у пэўнай сферы акрэсліліся станоўчыя тэндэнцыі, якія праявіліся і падчас зацьмення, значыць, далейшае жыццё як мінімум паўгода будзе развівацца менавіта па пазітыўным сцэнарыі. Зацьменне — гэта своеасаблівы жыццёвы водападзел. Яно нясе пячатку фатуму, прадвызначанасці. Любыя падзеі ў час зацьменняў — незваротныя.

У час зацьмення воля і памкненні чалавека карэктуе Сусвет. Працівіцца Сусвету — значыць асуджаць сябе на паражэнні. У азначаны перыяд неабходна кіравацца падзеямі, рабіць тое, што падказвае сэрца, і цвёрда трымацца сваіх маральна-этычных прынцыпаў. Зацьменні — гэта маякі, якія ўказваюць шлях. І задача кожнага чалавека — не зацыклівацца на негатыве, а імкнуцца змяніць сваё жыццё так, каб яно было ў гармоніі і адпаведнасці з Сусветам.

Тры дні (дзень да зацьмення, дзень зацьмення і наступны за ім) азначаная нябесная з'ява закранае наша фізічнае цела, эмацыянальную прыроду і нават духоўныя памкненні. На момант зацьмення эмацыянальна няўстойлівым асобам варта быць выключна асцярожнымі, бо верагодныя правакацыі, якія «выведуць» чалавека на негатыўныя эмоцыі. У час сонечнага зацьмення «закладаюцца» праблемы з целам, якія потым праявяцца ў хваробах, таму варта вельмі ашчадна ставіцца да свайго арганізма. Тым, у каго ёсць хранічныя захворванні, лепш правесці прафілактычныя мерапрыемствы.

На наш ментальны ўзровень сонечнае зацьменне ўздзейнічае на працягу двух тыдняў (тыдзень да зацьмення і тыдзень пасля). З улікам уплыву месяцавых зацьменняў 7 ліпеня і 6 жніўня ўсе ідэі і думкі, якія з'явіліся ў прамежку 1 ліпеня — 13 жніўня, абавязкова трэба давесці да лагічнага завяршэння, прааналізаваць. Тады эфект ад іх рэалізацыі будзе ашаламляльным і значна зменіць жыццё да лепшага.

Напярэдадні зацьмення не дапускайце напружанасці ў сям'і, у першую чаргу паміж прадстаўнікамі розных пакаленняў. Суткі пасля зацьмення добра выкарыстаць для планавання будучыні сям'і і асобных яе членаў, для ўсведамлення праблем на шляху да дасягнення мэты. Напярэдадні зацьмення не варта пазычаць грошы — рызыкуеце іх не атрымаць назад. У час зацьмення 22 ліпеня вельмі небяспечна пераядаць і злоўжываць алкаголем — можна справакаваць праблемы са страўнікам. У гэты час супрацьпаказаныя канфлікты і сваркі з кіраўніцтвам, з калегамі. Не трэба пачынаць новыя праекты, рамонт, а напярэдадні зацьмення можна зрабіць прыборку, абысці дом (кватэру) са свечкай. У дзень зацьмення больш часу правядзіце на прыродзе.

Сур'ёзныя праблемы ў рабоце *падчас зацьмення 22 ліпеня могуць з'явіцца ў народжаных у ліпені 1943 года, у ліпені 46-га, сакавіку-красавіку 49-га, лістападзе 49-га, кастрычніку і снежні 54-га, чэрвені 55-га, сакавіку-жніўні і снежні 61-га, верасні 66-га, студзені-маі 67-га, лютым 73-га, жніўні-верасні 75-га, студзені-маі 76-га, жніўні-верасні 78-га, сакавіку-красавіку 79-га, студзені-лютым 85-га, жніўні 1990 года.*

Значны ***негатыўны ўплыў*** *зацьменне можа аказаць на* ***фінансавую сферу*** *тых, хто нарадзіўся ў верасні 1940-га, жніўні 42-га, чэрвені 46-га, чэрвені-ліпені 49-га, маі-чэрвені 51-га, ліпені 52-га, жніўні 55-га, ліпені 57-га, маі-жніўні 60-га, жніўні 63-га, верасні 64-га, чэрвені-ліпені 67-га, чэрвені-ліпені 71-га, маі 73-га, жніўні 74-га, ліпені 78-га, ліпені-жніўні 79-га, маі-жніўні 84-га, жніўні-верасні 85-га, чэрвені-ліпені 1989 года.*

У ***асабістым жыцці напружаная сітуацыя*** *можа скласціся ў народжаных у красавіку 1941-га года, у студзені 47-га, студзені 49-га, снежні 50-га, кастрычніку 54-га, красавіку 56-га, лютым 60-га, лютым 62-га, снежні 65-га, маі 71-га, лютым 73-га, сакавіку 75-га, лютым 77-га, снежні 80-га, лістападзе 82-га, лістападзе-снежні 84-га, кастрычніку 86-га, красавіку 87-га, сакавіку 1990 года.*

Яшчэ раз падкрэслю: у час зацьмення не трэба рабіць тое, з-за чаго потым будзе соромна. Гэта значыць не парушаць маральна-этычных нормаў і прынцыпаў, быць шчырым з самім сабой. Тады зацьменне закладзе фундамент не для фатальна негатыўных, а для фатальна станоўчых сітуацый.

Месяцавае зацьменне звязана з мінулым, з вяртаннем людзей, з якімі раней не былі вырашаны нейкія маральна-этычныя праблемы. Калі раней вы ігнаравалі праблемы ва ўзаемаадносінах, то ў час месяцавага зацьмення (6 жніўня) у вас ёсць шанц іх вырашыць. Месяцавае зацьменне больш сур'ёзна ўплывае на эмацыянальны план, яно будзе правакаваць на скандалы і канфлікты, на разрыў адносінаў з супрацьлеглым полам з-за жадання большай трываласці і стабільнасці ў партнёрстве. Па магчымасці будзьце мяккімі і асцярожнымі са сваімі каханымі і блізкімі. Усе працэдуры, скіраваныя на змену іміджу, стылю лепш адкласці на больш рыдатны час. Праявіце асцярожнасць падчас знаходжання ля вадаёмаў, пры выкарыстанні электрапрыбораў. Асноўная небяспека ў сям'і — напружанасць ва ўзаемаадносінах бацькі-дзеці. Дарослыя рызыкуюць сваімі карнымі ўчынкамі адцаліць сваіх дзяцей ад сябе. Прычым наступствы залішняга дэспатызму могуць праявіцца не адразу, а праз паўгода.

Кожны чалавек павінен быць гатовым да таго, што падчас месяцавага зацьмення яго настрой зменіцца — не ў лепшы бок. У гэты час супрацьпаказана ўжываць алкаголь, псіхатропныя прэпараты, лекі, якія ўздзейнічаюць на псіхіку. Затое месяцавае зацьменне — выдатны час для таго, каб развітацца з непатрэбным, састарэлым (дрэннымі звычкамі, рысамі характару, абарваць непатрэбныя сувязі).

Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.

Патанулі трое дзяцей

16 ліпеня ўдзень у Магілёве ў вадаёме на Гомельскай шашы патануў хлопчык. Вучню 8-га класа адной з магілёўскіх школ было 13 гадоў. Кампанія хлопчыкаў купалася ў невялікім кар'еры, калі тры з іх сталі клікаць на дапамогу. Самы старэйшы і моцны хлопец кінуўся ратаваць малодшых, але паспеў выцягнуць толькі двух.

На гэтым тыдні ў Магілёўскай вобласці гэта ўжо трэці трагічны выпадак, калі ў вадзе гінуць дзеці.

13 ліпеня, у панядзелак, у пасёлку Глуша Бабруйскага раёна два мясцовыя падлеткі адправіліся купацца ў закінуты басейн. Нечакана адзін з іх, вучань 8-га класа адной з бабруйскіх школ, стаў тануць. Прыяцель кінуўся на дапамогу і ўрэшце выцягнуў яго, але хлопчык ужо не дыхаў.

15 ліпеня трагічнае здарэнне адбылося ўдзень на возеры ў вёсцы Андраны Мсціслаўскага раёна. Дзве дзяўчынкі з вёскі Доўгавічы, 1996 і 1995 гадоў нараджэння, трапілі на возеры ў бяду. Адна сяброўка ўмела плаваць, а другая — не. Яны ўдзвюх зваліліся з кладкі ў возера. Месца, дзе адбылося трагічнае здарэнне, не было абсталявана для купання. На дапамогу прыйшла кампанія, якая непадалёк адпачывала. Старэйшую дзяўчынку ўдалося выцягнуць з вады жывую: яна была дастаўлена ў Мсціслаўскую цэнтральную раённую бальніцу ў стане пасля ўтаплення. Пакуль пацыентка знаходзіцца яшчэ ў рэанімацыі, яе стан медыкі ацэньваюць як сярэдняй цяжкасці. Яе сяброўка патанула.

Алена КАЗЛОВА.

Сітуацыя

РАДАВАЦЦА ЦІ СУМАВАЦЬ?

Беларускія хаты пераязджаюць у... Літву

Старыя вясковыя хаты, якія сталі нікому не патрэбнымі ў Беларусі, знаходзяць новых гаспадароў у... суседняй краіне. «На першы погляд, неверагодна, але факт», — сцвярджае журналіст Лявонас Даўгела, які раней пражываў на Гродзеншчыне, а цяпер у Літве.

Прадпрымальнік з Варэны Айварас Часнуліс арганізаваў акцыянернае таварыства, якое купляе, разбірае старыя вясковыя хаты ў Гродзенскай і Мінскай абласцях, перавозіць іх у Літву і праводзіць зборку там, дзе скажа кліент. Гэты бізнэс давялося ўзгадняць з шэрагам беларускіх і літоўскіх дзяржструктур, аднак аўчынка, як кажуць, аказалася вартай вырабу. За даволі кароткі тэрмін з Беларусі «на экспарт» накіравана каля трыццаці дамоў, якія ўжо стаяць у прэстыжных для пражывання мясцінах, у прыватнасці, у азёрным Тракайскім краі і на Балтыйскім узмор'і. Пры гэтым, паводле слоў некаторых навасёлаў, іх у старых беларускіх хатах прывабліваюць нейкі асаблівы вясковы дух і нават непаўторныя шляхецкія таямніцы, нябачная прысутнасць нашых некалі агульных продкаў... Ды і якасць задавальняе, бо гніллё Часнуліс не бярэ.

Замовіў у яго — на год наперад. Колькі фірма плаціць у Беларусі за старую хату — камерцыйная тайна, аднак, на думку Лявонаса Даўгелы, за такія грошы ў Літве можна купіць хіба што лес на корані, першапачатковую сыравіну для пабудовы дома. Потым гэтыя сосны трэба спілаваць, вывезці з лесу, нарыхтаваць бярвёны, частку з якіх распілаваць на дошкі і брусы. Потым высушыць нарыхтаваную драўніну, наняць брыгаду талковых цесляроў... У выніку цана новага дамка будзе яшчэ як «кусацца».

А тут усё гатовае. Разабраць зруб могуць трое вясковых мужчын, сабраць — таксама. Транспартныя фірмы ва ўмовах эканамічнага крызісу з гатоўнасцю выдзяляць грузавік з прычэпам. Дакументы ў парадку... Выдатны бізнэс.

Вось толькі якія ўражанні ад гэтага бізнэсу павінны быць у нас, у Беларусі? Парадуемся, што гэтыя хаты, няхай за мяжой, але ўсё ж атрымаюць другое жыццё? Ці пасумуем, што самі не здолелі імі па-гаспадарску распарадзіцца?

Хоць бываюць і прыемныя выключэнні. Адзін чалавек паклаў вока на кінуты дом у невялікай вёсачцы Гродзенскага раёна і адшукаў нашчадкаў ажно ў Адэскай вобласці, спецыяльна туды паехаў і афарміў усе неабходныя дакументы. Не пазнаць цяпер гэту, здавалася б, бесперспектыўную сядзібу...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Здароўе на талерцы

Плюшавыя ягады

Так-так, ківі — гэта менавіта ягады, плады павойнай расліны з доўгімі шматметровымі галінамі, з вельмі прыгожымі белымі або ружовымі кветкамі. Сваю назву ягады бяруць ад новазеландскай птушкі ківі. А яшчэ іх называюць кітайскім агрэстам, авечым або малпіным персікам.

Медыкі справядліва лічаць ківі сапраўднай «вітаміннай бомбай», паколькі ў ім змяшчаецца шмат карысных кампанентаў. Асабліва багаты гэты махнаты зялёны шарык на вітамін С — у такой колькасці яго няма больш ні ў адным фрукце. Дарэчы, калі кожны дзень з'ядаць па адным ківі, то ваш арганізм будзе цалкам забяспечаны вітамінам С. Для чаго гэта трэба? А вось для чаго: вітамін С актыўна ўдзельнічае ў працэсе абмену рэчываў, умацоўвае крывяносныя сасуды і імунную сістэму, павышае супраціўляльнасць арганізма розным інфекцыям, садзейнічае добрай працаздольнасці, дапамагае пераадолець стрэс.

Шмат у ківі калію, патрэбнага для аднаўлення балансу мінеральных рэчываў, для нармалізацыі крывянога ціску. Утрымлівае ківі і фермент актыдзін, які расшчапляе бялкі. Таму некалькі пладоў, з'едзеных пасля сытнага абеду, дапамогуць пазбавіцца ад адчування цяжару ў страўніку, пяготкі і адрыжкі.

А не так даўно нарвежскія вучоныя ўстанавілі, што ківі можа дапамагчы і ў барацьбе з хваробамі сэрца, паколькі ён валодае здольнасцю спальваць дрэнны халестэрын, які блакіруе артэрыі. Грунтуючыся на выніках сваёй працы, вучоныя рэкамендуюць штодзень з'ядаць 2—4 ківі. Яны сцвярджаюць, што пры такой дыеце значна зніжаецца ўзровень утрымання ў крыві шкодных тлустых кіслот і, як вынік, змяншаецца рызыка ўтварэння тромбаў.

У ківі прысутнічае мноства энзімаў, якія паскараюць спальванне тлушчаў і садзейнічаюць утварэнню валокнаў калагену. Таму калі вы марыце аб стройнай фігуры, вам проста неабходна звярнуць увагу на гэты экзатычны фрукт.

СОУС З КІВІ

Вазьміце: ківі, ачышчаныя арэхі, часнок, кроп. Спелыя плады ківі вымыць, абабраць, працерці праз сіта. У працёртую мякаць дадаць растоўчаныя арэхі, расціснуты часнок, дробна парэзанае зяленіва. Усё старанна перамяшаць. Соус падаюць да мясных страў і страў з птушкі.

Прадукты для разагрэву страсці

Задоўга да з'яўлення штучных стымулятараў людзі навучыліся знаходзіць крыніцу любоўнага запалу на... стале.

Шакалад. Яшчэ старажытныя ацтэкі пілі шакалад перад любоўнымі гульнямі. Сёння дакладна вядома, што тэабрамін, які ўтрымліваецца ў ім, аказвае такі ж узбуджальны эфект, як і кафеін. А ўжыванне шакаладу прыводзіць да выдзялення эндарфінаў — знакамітых «гармонаў шчасця».

Шампанскае. Гэты напой больш за астатнія падыходзіць для пачатку лёгкай любоўнай гісторыі. Але варта памятаць, што перадазіроўка можа мець сумныя наступствы. Акрамя таго, шампанскае можа прывесці да збірання газаў і ўзнікнення няёмкіх сітуацый.

Сельдэрэй. Яшчэ ў сярэднія вякі лічылася, што сельдэрэй дапамагае жанчыне зачаць хлопчыка, а сок гэтай расліны ператвараў самых «вялых» мужчын у герояў-палюбоўнікаў.

Вострыя прыправы. Вострая ежа наогул лічыцца асабліва падыходнай для «разагрэву» перад ноччу кахання. Але перш-наперш тут варта адзначыць карыцу, мускатны арэх, кардамон і шафран — яны падтрымліваюць тонус арганізма і валодаюць шматлікімі карыснымі ўласцівасцямі.

Кроп. Быў час, калі кроп выключалі з меню ў манастырах, — лічылася, што ён узбуджае нясціплыя жаданні. Невялікі пучок кропу кожны дзень дапаможа захаваць сэксуальны тонус.

Імбір. Ужо тысячы гадоў імбір ужываецца як «памагаты мужчыны». Яму прыпісваюць здольнасці «падтрымліваць жыццёвыя органы» і «спрыяць дзейнасці семявых залозаў». Імбір выклікае расшырэнне сасудаў у вобласці малога таза. Аднак ужываць імбір варта з асцярожнасцю, бо ён аказвае моцнае раздражняльнае ўздзеянне.

Ваніль. Апошняя асацыюецца з нявіннымі ласункамі, між тым яна дапамагае змагацца з астэніяй дзякуючы свайму паху, які ўздзейнічае на органы пачуццяў. Многія мужчыны сцвярджаюць, што ім не падабаецца водар ванілі, аднак выраз «салодкая жанчына» прыдуманы не выпадкова.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНОВ)

18 августа 2009 года по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукционы по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков необходимых для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукционов

На аукционные торги выставляются:

Время проведения аукционов	Сведения о предметах аукционов	Начальная цена предмета аукциона, рублей Сумма задатка для участия в аукционе, рублей
10.00	**Лот № 1:** Здание клуба (инв. № 632/С-19105), общей площадью 93,1 кв. м 1968 года постройки – одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки бревенчатые, перекрытия дощатые, крыша шиферная. Отопление печное. Здание **сарая** (инв. № 632/С-19106) одноэтажное общей площадью 16,0 кв. м, 1972 года постройки. Фундамент – д.столбы, стены дощатые, крыша шиферная. Объекты находятся в собственности Воложинского района, расположены по адресу: Минская область, Воложинский район, Воложинский с/с, д. Рум, на земельном участке площадью 0,0674га, отведенном для обслуживания и эксплуатации зданий. Срок аренды земельного участка 99 лет. Имеется ограничение в использовании в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Ислочь.	21 391 495 (в том числе: недвижимое имущество – 21 368 965, право аренды земельного участка – 22 530) сумма задатка – 2 000 000
	Продавец: Воложинский сельский исполнительный комитет, расположенный по адресу: Минская обл., г. Воложин, пл. Свободы, 21, тел. (801772) 54 075. **Арендодатель земельного участка:** Воложинский районный исполнительный комитет.	
11.00	**Лот № 1:** Здание амбулатории (инв. № 600/С-93319), расположенное по адресу Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи, ул. Полевая, 13, общей площадью 197,3 кв.м, 1968 года постройки – одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, перегородки дощатые, перекрытие деревянное, крыша шиферная. Подведены инженерные коммуникации. Имеется сооружение: забор штакетный. Объект находится в собственности Минского района и расположен на земельном участке площадью 0,1344 га. Срок аренды земельного участка 30 лет. **Победителю аукциона** разрешается использовать в установленном порядке земельный участок для строительства и обслуживания административно-бытового здания.	88 520 280 (в том числе: недвижимое имущество – 50 116 613, право аренды земельного участка – 38 403 667) сумма задатка – 8 000 000
	Лот № 2: Здание амбулатории (инв. № 600/С-93309), расположенное по адресу: Минский район, Роговской с/с, п. Шершуны, ул. Савенко, 2, общей площадью 207,6 кв.м., 1935 года постройки – одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, перегородки и перекрытия деревянные, крыша шиферная. Подведены инженерные коммуникации. Объект находится в собственности Минского района и расположен на земельном участке площадью 0,1641 га. Срок аренды земельного участка 30 лет. **Победителю аукциона** разрешается использовать в установленном порядке земельный участок для строительства и обслуживания административно-бытового здания.	56 105 069 (в том числе: недвижимое имущество – 50 429 574, право аренды земельного участка – 5 675 495) сумма задатка – 5 000 000
	Продавец: Учреждение здравоохранения «Минская центральная районная больница», расположенное по адресу: Минская обл., Минский район, д. Боровляны, ул. Фрунзенская, 1, тел. 5052717. **Арендодатель земельного участка:** Минский районный исполнительный комитет, г. Минск, ул. Ольшевского, 8, тел. 256 11 50	
15.00	**Лот № 1:** Здание склада (инв. № 640/С-27232), расположенное по адресу: Минская область, г. Слуцк, 1-й пер. Железнодорожный, 10, общей площадью 181 кв.м, 1972 года постройки – одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная. Объект находится в собственности Слуцкого района, расположен на земельном участке площадью 0,2193 га. Срок аренды земельного участка 22 года. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением его в водоохранной зоне р. Случь	26 155 320 (в том числе: недвижимое имущество – 7 200 000, право аренды земельного участка – 18 955 320) сумма задатка – 2 500 000
	Продавец лота № 1: Торговое унитарное предприятие «Городской центральный рынок г. Слуцка», расположенный по адресу: Минская обл., г. Слуцк, 1-й пер. Железнодорожный, 10, тел. (801795) 20 613	
	Лот № 2: Здание клуба (инв. № 640/С-36816), расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий район, Бокшицкий с/с, д. Радичево, общей площадью 256,9 кв.м, 1959 года постройки – одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная. Объект находится в собственности Слуцкого района, расположен на земельном участке площадью 0,1072 га, отведенном для его содержания и обслуживания. Срок аренды земельного участка 50 лет. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением его в водоохранной зоне канала Бокшицкий. **Условия использования земельного участка**: для размещения объектов соцкультбыта либо жилья.	33 044 490 (в том числе: недвижимое имущество – 33 000 000, право аренды земельного участка – 44 490) сумма задатка – 3 000 000
	Лот № 3: Здание столовой (инв. № 640/С-26427), расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий район, Бокшицкий с/с, д. Радичево, общей площадью 102,1 кв.м, 1959 года постройки – одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша железная. Объект находится в собственности Слуцкого района, расположен на земельном участке площадью 0,0586 га. Срок аренды земельного участка 50 года. Ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением его в водоохранной зоне канала Бокшицкий. **Условия использования земельного участка**: для размещения объектов соцкультбыта либо жилья.	18 024 320 (в том числе: недвижимое имущество – 18 000 000, право аренды земельного участка – 24 320) сумма задатка – 1 800 000
	Продавец лотов 2-3: Торгово-промышленное коммунальное унитарное предприятие «Металлист» Слуцкого райисполкома, расположенный по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Монахова, 23, тел. (801795) 24 815.	
	Арендодатель земельного участка (лоты № 1-3): Слуцкий районный исполнительный комитет.	

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского областного исполнительного комитета: **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Миноблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

К участию в аукционных торгах допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), представившие в фонд «Миноблгосимущество» в сроки, указанные в извещении заявление на участие в аукционе, заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, по формам, утвержденным постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов». К заявлению на участие в аукционе прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Не допускается одновременное участие в торгах по одному и тому же предмету аукциона следующих лиц: близких родственников (родителей, детей, усыновителей, усыновленных (удочеренных), родных братьев и сестер, деда, бабки, внуков), а также супругов и их близких родственников; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере двадцати и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка;

3. После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка — договор аренды земельного участка.

4. После заключения с райисполкомом договора аренды земельного участка в 2-х месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок.

5. Получить в установленном порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Фонд «Миноблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона (продажа конкретного предмета аукциона) в любое время, но непозднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет фонда «Миноблгосимущество» **№ 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686.** Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел. 224 39 76, 500 47 10.** Последний день подачи заявок **14 августа 2009 г. до 17.00. Участникам аукциона необходимо пройти заключительную регистрацию перед началом аукциона.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства изолированного помещения с инвентарным номером 500/D-718486, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Одинцова Л.Е., д. 36, корп. 1, помещение 1 Н (административно-торговое помещение общей площадью 344,6 кв. м).

Начальная цена – 1 289 790 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 100 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится 03 августа 2009 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 31 июля 2009 года до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017) 227-48-36.



Яўгена ПЯСЕЦКАГА

ФОТА СЛОВА

Шляхі вандровак і пагонь
Спляліся ў гэтым свеце цесным,
Але для ўсіх адзін закон,
І саступае белы конь
Дарогу белым мерседэсам.

Дарогі — даўнія прынады,
У іх спакою не шукай:
Гасцінцы, сцежкі, аўтастрады
Скрозь раставанні, згубы, здрады
Вядуць цябе за небакрай...

У тым краі за краем неба
Пазнаеш, кім на свеце быць —
Не трэба золата і срэбра,
Каб зранку мець акраец хлеба
І каб невінаватым жыць.

ПАД ПІНСКАМ ЖЫВЕ БЕЛАРУСКІ ПІКАСО

Сяргей ЖЫЛЕВІЧ за тое, што вучыць дзетак прыгожаму, быў прызнаны «Чалавекам года Брэсцкай вобласці»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Я нарадзіўся ў Пінску, — кажа Сяргей Фёдаравіч, — а мой бацька — вось у гэтай хатцы (яна стаіць ля брамы, старэнькая і ўрослая ў зямлю — **Аўт.**). — Мне сельсавет казаў зруйнаваць яе, каб выгляд не псавала. Але пасля чыноўнік адзін высокі прыязджаў на экскурсію, кажа: «Добра, Сяргей Фёдаравіч, што карані не забываеце!..»

У Баяры Жылевіч перабраўся жыць каля 25 гадоў таму. Спачатку — у меншую хату, а як нарадзіліся дзеці — разбудаваўся. Тады і заклаў сваю незвычайную галерэю пад адкрытым небам. Стварыў рэльеф, выкапаў сажалку (метраў дзесяць па вялікім баку), насыпаў пагорак. У сажалку запусціў рыбу, ёсць тут і жабы.

— Але жабы самі з'явіліся, — смяецца мастак. — Я ж не чараўнік!..

На беразе сажалкі збудаваў альтанку для юшкі і шашлыкоў, лазню, а сам вадаёмчык аздобіўся кампазіцыямі — «Човен», «Алёнка», «Флірт рыбак»...

На пагорку ля сажалкі — стромкая вытанчаная фігура анёла. Адсюль, зверху, увесь сад скульптураў — як на далоні!

— У мяне шмат скульптураў-прысвячэнняў, — расказвае спадар Сяргей. — Вось Высоцкаму, вось Малевічу, вось Мадзільяні, а гэта — жонцы, сыну і дачцэ...

Кот завецца Эцюд. І гэта сапраўдны мастакоўскі кот. Калматы, баламутны, але адначасова — шляхетны і какетлівы. Куды мы — туды і ён. А як пабачыць фотаапарат — замірае і пачынае пазіраваць, як мадэль. Не кот, а падарунак для фатографа!..

— Хадзем у хату, — запрашае мастак. — Скульптуры паглядзелі, цяпер карціны пакажу.

У майстэрні Жылевіча карціны — нават на столі. Тэмы — самыя розныя, ад яркага пеўня да таямнічай каплічкі. Засталіся ў майстэрні толькі тыя, што асабліва дарагія мастаку. Астатнія разляцеліся па ўсім свеце — у Польшчу, Германію, Іспанію, Англію, Амерыку... Скульптура Жылевіча выстаўлялася нават на аўкцыёне «Сотбіс»! У якім стылі працуе мастак?

— Нейкага аднаго няма, — кажа ён сам. — Стыль увесь час змяняецца ў залежнасці ад настрою, ад задачы, замовы... Часам раблю нешта абстрактнае, часам — нейкія кубісцкія рэчы...

Сяргей Фёдаравіч выкладае маляванне ў сярэдняй школе суседняй вёскі Аснежыцы. Цешыцца, што можа вучыць дзетак прыгожаму, развіваць у іх густ і любоў да мастацтва. Некаторыя ягоныя вучні пайшлі па слядах настаўніка — пасканчалі Акадэмію мастацтваў ці мастацкія вучэльні, павывучваліся на дызайнераў... У 2004 годзе спадара Сяргея прызналі «Чалавекам года Брэсцкай вобласці» ў галіне адукацыі. Аднак, па ўсім відаць, не дзеля гэтага ён вучыць дзяцей і стварае прыгажосць.

— Тут, у Баярах, у мяне свой хранатоп, свая прастора, свой свет, — кажа мастак. — Многія, хто прыязджае сюды, змяняюць свае погляды на некаторыя рэчы. Пачынаюць задумвацца пра тое, што ёсць мітусня, а што ёсць сэнс...

Я ехаў да Сяргея Жылевіча на паўгадзінкі — быўшы ў камандзіроўцы на Піншчыне, хацеў заадно напісаць і пра адметнага мастака. Аднак затрымаўся тут гадзін на пяць. П'ючы смачную каву ў мастакоўскай майстэрні і не запальваючы святла, хоць надыходзілі прыцемкі, я разумеў, што і сам не заўжды аддзяляю мітусню ад нечага сапраўды важнага. У хуткім часе зноўку збіраюся ў Баяры.

Дарэчы, сёння, 18 ліпеня, Сяргей Жылевіч святкуе 50-годдзе. Шчырыя віншаванні, Маэстра!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

СЕМ НОТ ФЕСТЫВАЛЬНАЙ ПЕСНІ

«Славянскі базар». Уражанні

Міжнародны форум мастацтваў, які сёлета ў афіцыйных прамовах атрымаў прыстаўку «паўналетні», завяршыўся. Але паставіць на гэтым тлустую кропку — значыць, не прыгадаць мноства яркіх фрагментаў, без якіх фестывальная палітра будзе няпоўнай. Скажам, сем фрагментаў за сем фестывальных дзён.

(До) Двайны джаз

Адметнасць сёлетняга фестывалю — неверагодная колькасць самай рознай музыкі: опера, інструментальная класіка, фолк-музыка і папулярныя песні народаў свету, эстрада, «фарматная» поп-музыка, шансон і джаз. Выходзіш з арт-кавярні ў Летнім амфітэатры — чутны зборны канцэрт майстроў эстрады або «сольнік» прыезджай зоркі, вяртаешся назад — акунаешся ў джазавыя эксперыменты ад калектыву з Санкт-Пецярбургу «Музы Канты. Soundproject». На «Славянскім базары» гурт адзначыўся ўжо другі год запар, таму прывёз на радасць заўсёднікам пашыраны рэпертуар: як апрацоўку старых савецкіх хітоў, так і зусім новыя песні.

Але галоўным джазавым сюрпрызам стаў своеасаблівы фестываль у фестывалі — у «базарныя» дні ў Віцебску ўпершыню адбылася папярэдняя прэзентацыя 7-га Міжнароднага музычнага фестывалю «Джаз Кактэбель». Па шчырасці, сам фэст, які штогод збірае на чарнаморскім узбярэжжы пад адкрытым небам каля 30 тысяч прыхільнікаў, адбудзецца толькі ў верасні гэтага года, цяпер жа адбылося, так бы мовіць, папярэдняе знаёмства. А разам з тым — і адбор беларускіх гуртоў, якія выступяць у Кактэбелі. Серыя музычных вечарынак адбору прайшла пад дэвізам «Асобная рэальнасць», што як мага лепш адпавядала рэчаіснасці. Вы забіраліся калі-небудзь у дзяцінстве на гарышча, каб пагуляць з сябрамі і падзяліцца важнымі дзіцячымі сакрэтамі? А цяпер уявіце тое ж самае, толькі з удзелам дарослых, з жывой музыкай і танцамі пад «Сярэбранае вяселле», «Джамбібум», «Port Mone», «Open Space» і мноства іншых беларускіх і ўкраінскіх музыкантаў. Адчуванне такое, як быццам выпадаеш на некалькі гадзін у паралельны сусвет.

(Рэ) Рыбак і райдар

Гэта была, бадай, адна з самых любімых тэмаў сёлета — асабліва расійская прэса насілася з ёй, як нянька

Пушкіна з чарговай казкай. Маўляў, рана хлопчык стаў «зорным», бач ты — патрабуе і піва, і свежавыціснутыя сокі, і салодкага без межаў, і жуйку канкрэтнай маркі, і араматычныя свечкі, і поўны бар у гасцінічным нумары, і каб душ на ключ замыкаўся... Пры гэтым уласна райдара са «смешнымі, недарэчнымі і раздражняльнымі» патрабаваннямі пераможцы «Еўрабачання-2009» у вочы не бачыў ніхто, за выключэннем дырэктара фестывалю Радзівона Баса, а той у вочы артысту прэтэнзій не выказваў, прытрымліваўся пазіцыі «гэта не сам спявак прыдумаў, а яго менеджары».

Скандал затух, так і не разгарэўшыся — на прэс-канферэнцыі Аляксандра Рыбака. Выканаўца паведаміў шаноўнай публіцы, што не п'е — не толькі піва, а і ўвогуле; што чартарны самалёт — гэта не яго выбрыкі, а суровая жыццёвая неабходнасць — рэгулярным рэйсам артыст ніяк не паспеў бы з Нарвегіі ў Беларусь і, адпаведна, не выступіў бы на канцэрце адкрыцця «Славянскага базару»; што 10 ліпеня — гэта быў адзіны дзень у годзе, які ў Сашы быў больш-менш вольны, і што пра астатнія «свае» патрабаванні ён нічога не ведае. Старанна разагрэтае абурэнне прадстаўнікоў жоўтай прэсы, як кажуць, завяла на корані.

(Мі) Маўклівы Меладзэ

«Зоркі», якія ўдзельнічалі ў фестывалі, сёлета збольшага расчаравалі журналістаў абсалютным нежаданнем размаўляць. За выключэннем традыцыйных кампліментаў, як у нас чыста і якія гасцінныя людзі, дазнацца ад большасці артыстаў хоць на слова больш не ўдавалася. Пара Анжэліка Варум—Леанід Агуцін спасылалася на недахоп часу — маўляў, хутка цягнік, прабачце, не паспяваем, усім задаволеныя, усім прывітанне і бывайце. Саліст «Любэ» Мікалай Растаргуеў, які прыехаў у Віцебск з канцэртам упершыню пасля складанай аперацыі па перасадцы ныркі, таксама быў не настроены на задушэўныя размовы. А тут яшчэ хтосьці з аператараў за пару хвілін да выхаду на сцэну алею ў агонь падліў: «Вы добра сябе адчуваеце?» — «Адчапіся ты ад мяне, дзеля Бога!» — раздражнёна кінуў Мікалай Вячаслававіч. Падчас выступлення «Любэ», дарэчы, за сцэнай дзяжурылі медыкі — на ўсякі выпадак. Невядома, ці ацанілі музыканты гэты клопат дырэкцыі, ці яшчэ больш раззлаваліся, аднак пасля канцэрта ахова перакрыла ўсе службовыя ўваходы, і гурт пакінуў Летні амфітэатр, перакінуўшыся прывітаннямі толькі з байцамі АМАПа.

Аднак лідарам па закрытасці сёлета стаў Валерый Меладзе, які прывёз у Віцебск сольную праграму «Насуперак». Дык вось, насуперак таму, што артыст славіцца трапяткім стаўленнем да жанчын, а большасць журналістаў, якія бегалі за спеваком у надзеі на інтэрв'ю, — якраз дзяўчаты, на кантакт Валерый не ішоў. «Надакучыла, калі стануць навокал 20 чалавек з дыктафонамі і задаюць адны і тыя ж пытанні», — тлумачыў далікатны, але непрыступны, як скала, дырэктар артыста. У якасці своеасаблівых выбачэнняў спявак падчас канцэрта прысвяціў менавіта журналістам песню «Дзяўчына з вышэйшага свету» і вельмі-вельмі прасіў не пісаць аб тым, што ў яго дзе-нідзе падводзіў голас (звычайна так робяць, цвёрда разлічваючы на адваротны вынік).

(Фа) Фігуры і «фірма»

Калі адзін з пастаянных фестывальных гасцей, «хлопчык» Барыс Маісееў, па звычцы эпаціраваў і хуліганіў нават на афіцыйных прэс-канферэнцыях (яго каронная сумесь ласкі і брыдкаслоўя, кшталту фразы «ў школе я быў сапраўдны рас....й, дарагія мае», не раз і не два выклікала ў заўсёднікаў культурны шок), то не менш пастаянная і любімая госця Лайма Вайкуле не здраджвала свайму фірмоваму лоску і высакароднай стрыманасці. Прычым сцвярджала, што ўсё гэта — ад бацькоў і ад прыроды.

— А цудоўны знешні выгляд? Таксама гены? — не адставалі цікаўныя прыхільнікі.

— Гены, — лёгка пагадзілася спявачка. Але паралельна прызналася, што ведае мноства дыет, адной з якіх падзялілася з жанчынамі, у якіх ёсць сіла волі і якім тэрмінова трэба прывесці сябе ў парадак. Паводле гэтай «зорнай» дыеты, цягам 3 дзён можна ўжываць толькі яйкі (і толькі бялок!) і грэйпфруты. Трэба чаргаваць: бялок — грэйпфрут — і так дзесяць прыёмаў за дзень.

Вынік, запэўніла артыстка, гарантаваны.

А яшчэ Лайма Вайкуле, адна з нямногіх, не скардзілася на крызіс — і ўвогуле сцвярджала, што праблем у яе няма: «У мяне ўсё прыжываецца: і людзі, і дрэвы, і бізнэс... Нават не ведаю, на што паскардзіцца — я паспяховы і багаты чалавек. Я цудоўная!».

(Соль) Сіла слова

Раней нізавошта б не паверыла, што вялікі паэт, грамадзянін свету і жывы карыфей слова можа цікавіцца станам эстрады. Аднак Яўген Еўтушэнка, які стаў ганаровым госцем сёлетняга «Славянскага базару», пераканаў у адваротным: паэту цікава ўсё. Тым больш, калі да Беларусі ў яго асаблівае стаўленне — Яўген Аляксандравіч не стамляецца нагадваць, што тут яго карані, у вёсцы Хомічы Карэліцкага раёна ён знайшоў дзвюх сваіх бабуляў, сяцэр дзеда, які быў расстраляны ў 1933 годзе. (Зрэшты, пра гэта кожны ахвотны можа даведацца з паэмы Еўтушэнкі «Мама і нейтронная бомба»).

— Я ведаў, што тут адбываецца фестываль, і быў крыху здзіўлены, што мяне за столькі гадоў не запрасілі ў Беларусь, перад якой я, здаецца, нічым не правініўся, — мякка ўпікнуў паэт, але тут жа дадаў, што галоўнае — вынік, і з мноства бачаных ім фестываляў віцебскі яму многа ў чым спадабаўся (Еўтушэнка сядзеў у першых радах на некалькіх зборных канцэртах, у тым ліку на конкурсе маладых выканаўцаў). Аднак знайшлося месца і для крытыкі — у адрас паэтаў, якія пішуць тэксты для сучасных выканаўцаў.

— Трэба вам развіваць яшчэ літаратурную частку на фестывалі, — параіў арганізатарам Еўтушэнка. — Ладзіць сустрэчы чытачоў з аўтарамі, паказваць уласных маладых паэтаў — а ў вашай краіне заўжды былі цудоўныя паэты!

(Ля) Літоўскі феномен

У нас гэта стала ўжо няпісаным законам: малады выканаўца «абкатваецца» на дробных конкурсах, потым паказвае сябе як след на «Славянскім базары» і — наперад і з песняй, здзіўляць Еўропу на «Еўрабачанні»! Каларытны літоўскі хэві-металіст Іеронімас Мілюс зрабіў усё наадварот: летась стаў прадстаўніком сваёй краіны на «Еўрабачанні», заняў адно з невысокіх месцаў у паўфінале, але не стаў перажываць з гэтай нагоды — падумаеш, конкурс! Сёлетняе выступленне на «Славянскім базары» для 24-гадовага Іеронімаса сталася не толькі больш удалым — 3-я прэмія, няхай сабе і падзеленая на дваіх з прадстаўніком Украіны — але і больш прыемным.

— Я адчуваю сябе надзвычай камфортна, — прызнаўся спявак, — лепш, чым на «Еўрабачанні». Бо тут усё па-шчыраму: спаборніцтва песні і вакалу, усё залежыць толькі ад цябе — як выкладзешся, якое ўражанне зробіш на гледачоў і журы. А на «Еўрабачанні» ніхто не можа прадказаць, што будзе ў фаворы: шоу або песня, або ўвогуле касцюмы.

...Дарэчы, ужо на закрыцці «Славянскага базару» нагадаў аб сабе яшчэ адзін удзельнік таго, леташняга «Еўрабачання»: спявак Руслан Аляхно не толькі паказаў публіцы новую — дуэтную — песню «Кахаць», але і расказаў, што ў яго днямі адбудзецца важная падзея ў жыцці — вяселле з расійскай актрысай Ірынай Мядзведзевай. Вось бы і іншыя нашы выканаўцы навучыліся так лёгка ставіцца да «Еўрабачання»!

(Сі) Сольнік «Сяброў»

Яго не тое каб цвёрда паабяцаў, але ўжо заявіў налета на «Славянскім базары» намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Рылатка — маўляў, засталося толькі ўгаварыць на гэты канцэрт, дарэчы, юбілейны для ансамбля, кіраўніка «Сяброў» Анатоля Ярмоленку. «Вы ж неяк абяцалі вывесці на фестывальную сцэну зубра?» — прыгадалі, карыстаючыся выпадкам, журналісты. Анатоль Іванавіч нават крыху разгубіўся, але потым выкруціўся: «Зубры — гэта ўсё ж да Брэсцкай вобласці, а мы выступаем на Віцебшчыне, дзе іншыя, свае адметнасці — мноства азёраў, напрыклад. Але, пакольку трэба развівацца і штогод паказваць штосьці новае, магчыма, дойдзе і да зуброў — трэба, напэўна, сесці на іх і прыехаць».

Уласна кажучы, тут можна і паставіць кропку. Бо менавіта гэтыя словы, «сябры» і «сяброўства», былі цэментам у агульным музычным фестывальным доме пад валошкавым дахам. І таму ў Віцебску штогод будуць збірацца пастаянныя ўдзельнікі і новыя госці, прычым прыязджаць яны будуць не толькі па ўражанні і не столькі па сувеніры, колькі па новыя знаёмствы і сяброўскія стасункі. Таму — да сустрэчы, «Славянскі базар-2010»! А мне яшчэ доўга будзе сніцца харавое скандзіраванне моладзі а першай гадзіне ночы: «Ві-цебск! Ві-цебск! Ві-цебск!»...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА і БЕЛТА.

ТЕХНОБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 июля 2009 г.

Наименование банка **ОАО «ТЕХНОБАНК»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101	1	3514,5	6847,7
3	Средства в Национальном банке	1102	2	17785,6	6669,8
4	Ценные бумаги:	1103		23,2	9038,6
	для торговли	11031	3	0,0	9019,6
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	0,0	0,0
	в наличии для продажи	11033	3.2	23,2	19,0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	16317,8	31845,0
6	Кредиты клиентам	1106	5	128714,8	145937,4
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	47,9	47,9
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	25359,6	7319,1
9	Прочие активы	1109	8	38315,7	18096,4
10	ИТОГО активы	110		230079,1	225801,9
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
12	Средства Национального банка	1202	9	21780,6	0,0
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	66749,2	76861,1
14	Средства клиентов	1206	11	79730,4	84918,1
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		17,4	12421,3
16	Прочие обязательства	1209	12	21512,8	14919,4
17	ВСЕГО обязательства	120		189790,4	189119,9
18	КАПИТАЛ				
19	Уставный фонд	1211	13	19985,3	19985,3
20	Эмиссионный доход	1212		0,0	0,0
21	Резервный фонд	1213		9049,2	7249,3
22	Накопленная прибыль	1214	14	3698,4	3711,9
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	7555,8	5735,5
24	ВСЕГО капитал	121		40288,7	36682,0
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		230079,1	225801,9
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ				
27	Требования	1301	16	57987,3	87046,5
28	Обязательства	1302	17	26583,3	67270,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 г.

Наименование банка **ОАО «ТЕХНОБАНК»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		7402,4	4100,1
2	Процентные расходы	2012		8215,7	4087,3
3	Чистые процентные доходы	201	18	-813,3	12,8
4	Комиссионные доходы	2021		4812,8	4191,6
5	Комиссионные расходы	2022		892,8	811,8
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	3920,0	3379,8
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	4751,3	4706,6
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	-26,0	-3,7
9	Доход в форме дивидендов	205		0,1	0,0
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	-115,6	804,7
11	Прочие доходы	207	23	2284,9	305,0
12	Операционные расходы	208	24	8442,3	5506,6
13	Прочие расходы	209	25	582,5	379,4
14	Налог на прибыль	210		184,7	390,7
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		1023,1	1319,1

Руководитель Д.Л. Михалевич

Главный бухгалтер Н.Л. Борсук

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г. Дата подписания 10.07.2009 г. УНП 100706562.

aquabel

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ПРАВ НА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже прав на заключение договоров аренды следующего недвижимого имущества ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район:

№ лота	Наименование объекта аренды	Адрес объекта аренды	Арендуемая площадь, м.кв.	Начальная цена продажи права заключения договора аренды, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
1.	Арендуемое помещение № 58	Минский р-н, пересечение Логойского тракта и МКАД, Выставочный блок главного выставочного павильона	52,9	4 000 000	400 000
2.	Арендуемое помещение № 21а	Минский р-н, пересечение Логойского тракта и МКАД, Выставочный блок главного выставочного павильона	159,9	4 000 000	400 000
3.	Арендуемое помещение № 83	Минский р-н, пересечение Логойского тракта и МКАД, Выставочный блок главного выставочного павильона	211,3	4 000 000	400 000
4.	Арендуемое помещение № 85	Минский р-н, пересечение Логойского тракта и МКАД, Выставочный блок главного выставочного павильона	90,8	4 000 000	400 000

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом (арендодателем) является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, комната 302.

Торги состоятся **28.07.2009 года** в **10.00** по адресу Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 3 этаж, зал совещаний.

Шаг аукциона – **5%** от начальной цены продажи права заключения договора аренды.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические и физические лица, а также граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей).

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом аренды;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесения задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Обязательные дополнительные требования к претендентам на участие в аукционных торгах:

по **ЛОТу № 1**: организация на арендуемой площади торговли ювелирными изделиями, или часами и аксессуарами к ним известных торговых марок, или организация торговли одеждой и аксессуарами из кожи класса люкс известных торговых марок;

по **ЛОТам № 2** и **№ 3**: организация на арендуемой площади торговли спортивными одеждой и обувью известных торговых марок, или организация торговли товарами для спорта и отдыха известных торговых марок, или одеждой и обувью известных торговых марок;

по **ЛОТу № 4**: организация на арендуемой площади торговли обувью известных торговых марок или организация торговли компьютерной техникой, или организация интернет-клуба, или размещение банковского учреждения.

Претенденты на участие в торгах перед перечислением задатка обязаны связаться с организатором аукциона и представить материалы, свидетельствующие о том, что претендент соответствует указанным обязательным дополнительным требованиям. Если претендент соответствует этим обязательным дополнительным требованиям, то он получает согласие организатора торгов на перечисление задатка, а также может ознакомиться с объектом аренды.

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет **ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район»** № 3012204960010 в ф-ле Минская городская дирекция ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, код 153001963, УНН 600438617.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона заключает договор на аренду нежилого помещения в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Срок договора аренды нежилого помещения – **3 (три) года**. Арендные ставки с НДС за один календарный месяц без эксплуатационных расходов на арендуемое помещение и без эксплуатационных расходов на помещения общего пользования: **ЛОТ № 1 – 44 евро/м.кв.** в течение первого года аренды с **5%** повышением этой арендной ставки на каждый последующий год; **ЛОТ № 2 – 30 евро/м.кв.** в течение первого года аренды с **5%** повышением этой арендной ставки на каждый последующий год; **ЛОТ № 3 – 30 евро/м.кв.** в течение первого года аренды с **5%** повышением этой арендной ставки на каждый последующий год; **ЛОТ № 4 – 30 евро/м.кв.** в течение первого года аренды с **5%** повышением этой арендной ставки на каждый последующий год. В случае уклонения или отказа от заключения договора аренды или уклонения или отказа от оплаты стоимости приобретенного права на заключение договора аренды задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенного права заключения договора аренды на объект недвижимости осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **27.07.2009 г.** до **14.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 1 (первый) этаж, комната 103. Тел. (017) 237 91 32, (029) 757 12 02.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра **Сафронава Анатоля Міхайлавіча**, 7 ліпеня 1951 года нараджэння, ураджэнца г. Мінска, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Стоўбцы-2, вул. Школьная, 27—32, паведаміць іх суду Цэнтральнага раёна г. Мінска на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Модны французскі мастак Рафаэль ЗАРКА:

«МНЕ БЫЛО ЦІКАВА, ЯК У ТАКОЙ НЕЗВЫЧАЙНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ПРАЦУЮЦЬ ЛЮДЗІ!»



Рафаэль ЗАРКА са стваральнікамі бібліятэкі Людмілай ШОХІНАЙ, Міхасём ВІНАГРАДАВЫМ і Віктарам КРАМАРЭНКАМ.

Рафаэль Зарка прыехаў у Беларусь на тыдзень. Мастак натхніўся геаметрычнай фігурай ромбакубаактаэдра, якая роўна 500 гадоў таму была выяўленая вялікім Леанардам да Вінчы. Адбылося гэта ў матэматычным трактаце Лукі Пачыёлі, які выйшаў у Венецыі, і які ілюстраваў якраз Леанарда. Захацеўшы стварыць фільм пра гэтую фігуру, Рафаэль Зарка зразумеў, што без нашай цуда-бібліятэкі ў такой стужцы — ніяк. Набыў білеты — і прыехаў са сваёй здымачнай групай у Мінск.

Рафаэль Зарка — адзін з самых модных і вядомых сучасных мастакоў Францыі. Рафаэлю 32 гады, а ягоныя працы ўжо патрапілі ў прэстыжную парыжскую галерэю «Michel Rein», галерэю Цэнтра Пампіду, Музей сучаснага мастацтва Парыжа, Нацыянальны збор сучаснага мастацтва Францыі, многія прыватныя калекцыі. Рафаэль — апошні па часе лаўрэат прэміі Фонда Рыкар — найважнейшай штогадовай прэміі, якая даецца французскім дзеячам мастацтва.

У першы дзень у Мінску мастак пазнаёміўся з супрацоўнікамі бібліятэкі, агладзеў наш Дыямент унутры і звонку. Пасля пачалася праца. Амаль цэлы дзень здымачная група фіксавала бібліятэку з усіх бакоў і ракурсаў. Пасля перайшлі ў чытальныя залы і сховішчы. Калі я прыйшоў у бібліятэку на размову з Рафаэлем, мастак якраз распытваў стваральнікаў бібліятэкі — архітэктараў Віктара Крамарэнку і Міхася Вінаградава, а таксама канструктара Людмілу Шохіну. Рафаэля цікавіла — ну чаму менавіта такая форма?!

— Галоўнай мэтай было — стварыць бібліятэку, дзе б кніга за найкарацейшы час дастаўлялася да чытача, — тлумачыў архітэктар Міхась Вінаградаў. — Думалі пра шар, але яго тэхнічна складана збудаваць. Пасля нам казалі: не выдурняйцеся, пабудуйце звычайны дом — і ўсё. Аднак мы настаялі на тым, каб гэта быў асаблівы, канцэптуальны будынак, твор мастацтва. І гэтая форма — яна трымае сама сябе. Кшталту чаркі — разумееце?! А сховішчы з кнігамі можна параўнаць з каранямі дрэва. Толькі яны ідуць дагары нагамі — зверху ўніз, да чытальных залаў.

Метафара з чаркай апынулася вельмі яркай і дасяжнай для мастака, выклікаўшы ў яго лёгкую ўсмешку.

— Гэтая форма валодае боскай энергетыкай, яна станоўча ўплывае на чалавека, — працягваў расказ калегі Віктар Крамарэнка. — Гэта дасканалыя прапорцыі — усе грані роўныя, па 25 метраў. Маштабы фігуры павінны ўражваць: 200 метраў у дыяметры, 140 тысяч тон вагі...

Людміла Шохіна па-жаночы растлумачыла Рафаэлю, як такая спаруда трымаецца і не коціцца, як мячык.

— У сярэдзіне бібліятэкі ідзе жалезабетонны «ствол», наўкол — своеасаблівыя «паяскі», а па перыметры — 24 вялізныя слупы. Уявіце, што бібліятэка — гэта як клубок на прутках!..

— А мне карціць параўнаць вашую бібліятэку з воданапорнай вежай! — падхапіў гутарку Рафаэль. — Уверсе забраныя кнігі — як вада ў вежы. І кнігі ўвесь час «цякуць» уніз да чытачоў. Гэта простая, але дасканалая ідэя!..

У час абмеркавання ўзнікла пэўнае непаразуменне. Рафаэль палічыў вокны на бібліятэцы, і атрымалася з аднаго боку шэсць, а з іншага — восем. Праз тое мастак падумаў, што ромбакубаактаэдр «несапраўдны» — з рознымі бакамі. Архітэктарам давялося на схеме тлумачыць Рафаэлю, што ён памыляецца: колькасць вокнаў розная выключна з-за ўнутранай планіроўкі будынка. У час дэбатаў Віктар Крамарэнка, даказваючы французу роўнасць бакоў, спантанна намаляваў бібліятэку на аркушы паперы.

— Пастаўце, калі ласка, аўтограф, — далікатна, з усмешкай папрасіў француз. Адметна, што паралельна з самім фільмам французы здымаюць «фільм пра фільм» — фіксуючы на іншую камеру працэс здымак.

Напрыканцы сустрэчы са стваральнікамі бібліятэкі Рафаэль прасіць дазволу завітаць да іх у госці. Яму спадабаўся момант, што бібліятэку відаць з вокнаў іх майстэрняў, хоць размешчаныя яны даволі далёка. Мастак нават пытаецца, у які час сутак архітэктарам найбольш падабаецца глядзець на свой твор. Дамаўляюцца на дзве гадзіны дня.

— Рафаэль, вы не расчараваліся, калі пабачылі бібліятэку зблізку? — пытаюся я ў мастака.

— Не расчараваўся зусім. Наадварот, мне цікава было пабачыць, як такі незвычайны будынак упісваецца ў навакольны пейзаж, у прыроду і горад. У жыцці ваша бібліятэка цікавейшая, чым на карцінках у інтэрнэце!..

— Вам не падалося, што форма тут пераўзыходзіць змест, што тут ёсць месца эпатажу?

— Вядома, у мяне ёсць адчуванне, што беларусам было важна збудаваць не проста бібліятэку, але і нешта грандыёзнае ў архітэктурным сэнсе. Нават месцазнаходжанне бібліятэкі — на цэнтральнай магістралі, па дарозе з аэрапорта — яно шмат пра што гаворыць.

— Вас не здзівіла, што пры такой складанай форме гэты будынак функцыянальны — сюды можна прыходзіць чытаць кніжкі?..

— Насамрэч, там, дзе знаходзяцца чытачы, форма простая і звычайная. Для мяне было цікава, як адчуваюць сябе супрацоўнікі бібліятэкі ў гэтым ромбакубаактаэдры. Але якраз сёння мы там былі, і, паводле слоў саміх супрацоўнікаў, яны там сябе цудоўна адчуваюць!..

— Рафаэль, калі вы цікавіцеся ромбакубаактаэдрамі — ці сапраўды нашая бібліятэка такая ўнікальная ў свеце?

— Калі казаць пра будынак такой формы, то сапраўды — больш такіх няма. Іншая справа, што мяне цікавіць не столькі ўнікальнасць. Бо часам унікальныя рэчы па якасці не зусім добрыя. У гэтым выпадку ў мяне ёсць інтарэс да формы. І я лічу, што сама форма не ўплывае на поспех ці не-поспех установы, якая знаходзіцца ў гэтым будынку. Ёсць шмат іншых чыннікаў... Форма важная для помніка архітэктуры — бібліятэку лёгка заўважыць у горадзе.

— Я так і зразумеў: ваш фільм будзе не пра бібліятэку, а пра яе форму.

— Вы ўсё зразумелі слушна. Мяне цікавіць форма ромбакубаактаэдра, а ваша бібліятэка сталася для мяне яе яскравым увасабленнем. Гэта — шчаслівая акалічнасць для мяне! Бо калі я захапіўся гэтай формай і пачаў пошукі, то адразу знайшоў бібліятэку. Ланцужок замкнуўся — 500 гадоў таму Леанарда да Вінчы выявіў гэтую фігуру, сёння беларусы збудавалі сабе такую бібліятэку. Нацыянальная бібліятэка Беларусі — гэта апагей існавання ромбакубаактаэдра!.. Зрэшты, гэта магла быць не бібліятэка, а што заўгодна — музей, шпіталь...

— А вы набылі б сабе кватэру ў доме такой формы?

— А чаму не! Зрабіць больш вокнаў — і нармалёва!.. Насамрэч, важна — як мы арганізуем гэтую форму, каб нам было зручна ў ёй.

— Бібліятэка застанецца для вас галоўным сімвалам Беларусі?

— Не, яна ёсць цэнтрам майго фільма. З Беларуссю ў мяне будуць асацыявацца цудоўныя людзі. Ці, можа, гэта мне так пашанцавала — сустрэць тут менавіта такіх?..

— Вы ведалі, што едзеце на радзіму Марка Шагала, Хаіма Суціна, што тут раскрыўся талент Казіміра Малевіча?..

— На жаль, у афіцыйных біяграфіях гэтых мастакоў месцам нараджэння пазначаная Расія. І я быў моцна ўражаны, што такія геніі нарадзіліся тут, у Беларусі. Гэта шмат пра што сведчыць...

Застаецца дадаць, што прэм'ера фільма пра нашу бібліятэку... даруйце, пра ромбакубаактаэдр адбудзецца 23 верасня ў Галерэі Эдуарда Манэ французскага горада Жэнвільe і будзе спалучана з адкрыццём персанальнай выставы Рафаэля Заркі.

— Запрашайце на прэм'еру! — сказала на развітанне Рафаэлю Зарка Людміла Шохіна. — Сядзем у «рафік» — і прыедзем!..

Сёння, калі вы чытаеце гэты артыкул, Рафаэль Зарка сядзіць на даху высокага дома насупраць бібліятэкі. Ад паловы на чацвёртую да паловы на дзявятую раніцы здымачная група фіксуе ўзыход сонца над бібліятэкай. Ад паловы на дзясятую вечара да гадзіны ночы — як сонца сядае над нашым Дыяментам Ведаў. Рафаэль хоча, каб ягоны фільм атрымаўся канцэптуальным. Здаецца, ён дасягне свайго.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

Чалавек думаючы не народзіцца без асэнсаванага чытання

У якім стане знаходзіцца сёння беларуская літаратура? Што робіцца для яе папулярызацыі і ці нарадзіліся ў Беларусі новыя Купалы? Пра гэта і не толькі ішла гаворка на прэс-канферэнцыі «75 гадоў Саюзу пісьменнікаў Беларусі. Дзейнасць пісьменнікаў на сучасным этапе і іх роля ў развіцці грамадства», якая прайшла напярэдадні з удзелам некаторых членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі.

— Саюз пісьменнікаў — гэта перш-наперш актыўная літаратурная творчасць. Гэта платформа, што яднае творчых людзей, якія сваім талентам хочуць служыць грамадству, — лічыць **галоўны рэдактар журнала «Полымя» Мікола МЯТЛІЦКІ**. — Адрозненні ў творчасці прафесійнага пісьменніка ад творчасці літаратурнага дзялка? Прафесійны пісьменнік ніколі не напіша твор, які абражае годнасць яго народа. Як павінна выглядаць літаратура суверэннай Беларусі? Думаю, што гэта будзе адна з самых гуманных літаратур свету, жыццёвай практыкі якой хопіць на многія пакаленні.

Саюз пісьменнікаў Беларусі на сёння мае дамовы аб супрацоўніцтве з пісьменніцкімі арганізацыямі 21-й краіны свету. Адно з апошніх новаўвядзенняў — стварэнне пры саюзе адмысловай секцыі сатыры і гумару.

Акрамя таго, як расказаў прысутным **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ**, немалаважную ролю Саюз пісьменнікаў адыграў у стварэнні «Савета па маральнасці», які не так даўно быў арганізаваны ў Беларусі. У яго, паводле слоў Чаргінца, акрамя пісьменнікаў і прадстаўнікоў розных канфесій, акрэдытаваных у Беларусі, увайшлі таксама акцёры, артысты і спартсмены.

— Ад савета не трэба чакаць нейкіх цэнзурных забаронаў. Гаворка ідзе не пра забарону, а пра ўзаемадзеянне з грамадствам, — падкрэсліў Чаргінец.

Цікавай навіной для прысутных стала інфармацыя пра стварэнне «Асацыяцыі пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы», першы з'езд якой плануецца правесці ўжо гэтай восенню. Месцам правядзення, паводле папярэдніх звестак, стане Мінск. На правядзенне з'езда ўжо выдаткавана сума ў 1,5 млн расійскіх рублёў. У будучым — стварэнне сумеснага літаратурнага 50-томніка (па 25 кніг ад кожнай краіны).

Для таго, каб любая літаратура развівалася, у ёй, несумненна, павінны быць тыя, хто будзе працягваць справу пачынальнікаў — пераемнікі. Ці ёсць такія людзі ў беларускай літаратуры?

— Вышукваць таленты і даваць ім дарогу ў жыццё трэба перш за ўсё праз літаратурныя конкурсы, — упэўнены **першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар ПРАЎДЗІН**. — Гэтаму садзейнічае, напрыклад, літаратурны конкурс «Лепшы твор года», які праводзіцца практычна ва ўсіх беларускіх рэгіёнах.

У Мінску не так даўно быў праведзены агульнагарадскі літаратурны конкурс сярод старшакласнікаў, арганізаваны Мінскім аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі. Паводле слоў яго **старшыні Міхаіла ПАЗНЯКОВА**, конкурс даў штуршок і стымул для таленавітых школьнікаў.

— Мы хочам адкрыць як мага больш таленавітых маладых людзей. Дапамагаем ім друкаваць першыя літаратурныя творы. У планах — выданне як асобных кніг, так і цэлых зборнікаў маладых аўтараў.

На пытанне карэспандэнта «Звязды», што зроблена Саюзам пісьменнікаў для ўдасканалення школьнай праграмы, дзе на сёння слаба асветлены стан сучаснай беларускай літаратуры, Мікалай Чаргінец адказаў:

— Школьную праграму не трэба скарачаць, яе трэба ўдасканальваць. Зразумела, мы б хацелі больш цесна супрацоўнічаць з Міністэрствам адукацыі. І гэта праца ідзе. З гэтага года, напрыклад, была вернута серыя «Школьная бібліятэка».

Год дзіцячай і юнацкай літаратуры абвешчаны сёлета на Гомельшчыне. Пра гэта расказаў **прадстаўнік Гомельскага аддзялення саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ**.

— Вынікі гэтага года будуць падведзены на літаратурным міжрэгіянальным свяце «Славянскія літаратурныя дажынкі», куды мы актыўна запрашаем нашых калег з Расіі і Украіны.

— Чытанне ўсё часцей, на жаль, становіцца для моладзі пакутай, — кажа Мікола Мятліцкі. — Я згадзіўся б са скептыкамі, якія кажуць, што беларуская літаратура і кніга сыходзяць на задворкі гісторыі, калі б не быў перакананы ў адным: без асэнсаванага чытання не можа нарадзіцца чалавек думаючы. Чалавек ідзе да адкрыцця свету толькі тым шляхам, які яму дае кніга. Я не думаю, што чалавецтва ў XXI стагоддзі захоча развучыцца думаць.

Ілья ЛАПАТО.

Наўздагон

ЦІ ПОЙДЗЕ БЕЛАРУСЬ «БРЫТАНСКІМ» ШЛЯХАМ?

Як ужо пісала «Звязда», у Вялікабрытаніі падрыхтаваны законапраект, што мае на мэце скасаваць гранічны ўзрост выхаду на пенсію, які сёння вызначаны ў 65 гадоў. Такім чынам, фактычна прапануецца ліквідаваць само паняцце «пенсійнага ўзросту» — грамадзяне Злучанага Каралеўства змогуць працаваць столькі, колькі палічаць патрэбным, пакуль спраўляюцца са сваімі абавязкамі.

— Праект, што прапанаваны ўрадам Вялікабрытаніі, сапраўды цікавы, і падобную прапанову варта разглядаць як адзін з крокаў па вырашэнні цяперашніх пенсійных праблем гэтай краіны, — адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» **начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ПАГОНЫШАВА**. — Прычым варта заўважыць: дэмаграфічнае пытанне з'яўляецца актуальным і для Беларусі, дастаткова сказаць, што колькасць пенсіянераў у нашай краіне ўжо даўно перавысіла колькасць як школьнікаў, так і дзяцей і падлеткаў да 18 гадоў у цэлым: амаль на 2,5 мільёна атрымальнікаў пенсій у нас прыпадае ўсяго крыху больш за мільён вучняў школ і каля 1,9 мільёна — асобаў да 18-гадовага ўзросту. Адпаведна, мы таксама маем намер разгледзець дадатковыя магчымасці стымулявання больш позняга выхаду на пенсію. Аднак ці пойдзе Беларусь менавіта «брытанскім» шляхам у будучыні, асабіста я меркаваць не буду — як кажуць, тут ёсць розныя варыянты.

Сяргей ГРЫБ.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

СМЕЛАЯ АТАКА

Аўтарскі конкурс-8 працягваецца заданнем № 12 майстра спорту Пятра Шклудава (Наваполацк):



Белыя: a7, c5, d2, d4, d6, e3, g1, h2, h6 (9). **Чорныя:** a3, b2, b6, b8, c7, f2, f4, f8, g5, g7, h4 (11). Выйгрыш.

Па-за конкурсам разгледзьце і яго эцюд:

Белыя: c1, e3, дамка f2 (3). **Чорныя:** b4, b8, c3, e5 (4).

e1 (c7A) f4 (A. Савельеў) h4 (a3B) f6 (ab2) a3 (d2) c3, c5x. B (d2) e3 (c3) f6x.

Варыянт A (d4) застаецца за вамі. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

А ў рамках **бліца-49/2** развязыце 100-клетачную канструкцыю 7 на 8 вядучага рубрыкі:



Белыя: 10, 16, 17, 29, 31, 46, 48 (7). **Чорныя:** 3, 18, 26, 28, 30, 37, 38, 42 (8).

І тут белым дапамагае смелая атака. Праблема праверана на супадзенне і дакладнасць рашэння нашым кансультантам Антанасам Гімбутасам (Літва).

Тэрмін для адказаў — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

ТУРНІРНАЯ АРБІТА

Адбыліся першынствы свету па шашках-100 (сярод мужчын) і 64 (у жанчын).

Чэмпіёнамі сталі масквіч Аляксандр Шварцман і Алена Міськова (Малдова). Чатырохразовы чэмпіён свету па шашках-100 Анатоль Гантварг (Беларусь) падзяліў з міжнародным гросмайстрам Гунтасам Валнерысам (Латвія) першае-другое месцы ў турніры, які прайшоў у іспанскім курортным горадзе Салоу. А вось у фестывалі «Злата Прага» ён заваяваў галоўны прыз.

А ў Мінску ладзіўся 22-гі фестываль стаклетачнікаў. Гэтым разам перамогу ў ім святкавалі Вольга Федаровіч (Беларусь) і Матрона Нагавіцына (Расія). Яны апярэдзілі моцнага майстра з Якуціі Мікалая Кічкіна.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні папярэдніх заданняў:

АЎТАРСКІ-8 (П. Шклудаў): f6 (e7:g5) f6, ce3, h8 (e3) f6, d2 (e7 A) e3 (d6 B) f4 (c5) e5 (ab4) d6, c5 (f6) d6 (g5) c7 (f4) b8 (e3) f2, a7, g1x. A (g7) e3 (h6) f4x. B (f6) f4x.

БЛІЦ-47/5 (П. Шклудаў): d8, c7, c7, d6 (h2 A) g3 (f4le7) d8, c1x. A (e7)d8, g3, c1x.

БЛІЦ-48/5 (М. Грушэўскі): 47, 47:29:4 (36) 22-18 (9 A) 24, 33x. A (13) 18x.

г. ВИТЕБСК 25.08.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ

О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ КАЖДОГО ОБЪЕКТА РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи, рублей	Сумма задатка, рублей
		Месторасположение объектов: д. Зубревичи Оршанского района Витебской области		
1.	Сооружение № 1 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, полуподземное, бетонное, кровля совмещенная, обвалованное землей, состояние неудовлетворительное, общей площадью 1010 кв. м. Земельный участок: площадью 0,8278 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000168, срок аренды земельного участка - 25 лет	239313	23931
2.	Сооружение (здание) № 2 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, с рулонным покрытием, состояние аварийное, общей площадью 1044,71 кв. м. Земельный участок: площадью 0,5989 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000172, срок аренды земельного участка - 25 лет	182759	18275
3.	Сооружение № 3 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, полуподземное бетонное, кровля совмещенная, обвалованное землей, состояние неудовлетворительное, общей площадью 1506,07 кв. м. Земельный участок: площадью 0,7337 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000169, срок аренды земельного участка - 25 лет	215892	21589
4.	Здание казармы и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное, перекрытие деревянное, крыша совмещенная, шиферная, 2-скатная, состояние аварийное, общей площадью 420 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2600 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000170, срок аренды земельного участка - 25 лет	99210	9921
5.	Здание казармы-столовой и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание 2-этажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 666 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1521 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000176, срок аренды земельного участка - 25 лет	72693	7269
6.	Здание спортзала и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное и г/с блоки, перекрытие деревянное, кровля шиферная, 2-скатная, состояние аварийное, общей площадью 270 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1958 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000175, срок аренды земельного участка - 25 лет	83418	8341
7.	Здание гаража-лаборатории и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, покрытие рулонное, кровля совмещенная, состояние неудовлетворительное, общей площадью 297 кв. м. Земельный участок: земельный участок площадью 0,1156 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000163, срок аренды земельного участка - 25 лет	63544	6354
8.	Здание гаража и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие деревянное, кровля деревянная, обрушена, состояние аварийное, общей площадью 676,18 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1157 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000174, срок аренды земельного участка - 25 лет	63544	6354
9.	Здание котельной и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание 4-этажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние аварийное, общей площадью 228 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1680 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000165, срок аренды земельного участка - 25 лет	76268	7626
10.	Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, с рулонным покрытием, состояние неудовлетворительное, общей площадью 147 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2342 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000173, срок аренды земельного участка - 25 лет	92567	9256
11.	Здание-гараж 1 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 504 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2451 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000171, срок аренды земельного участка - 25 лет	95635	9563
12.	Здание-гараж 2 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 518 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2128 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000164, срок аренды земельного участка - 25 лет	87472	8747
13.	Здание дизельной и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние аварийное, общей площадью 158,49 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1517 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000166, срок аренды земельного участка - 25 лет	72186	7218
14.	Здание боксов под автотехнику и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, ж/б перекрытие, кровля совмещенная рулонное покрытие, состояние неудовлетворительное, общей площадью 318 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2648 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000167, срок аренды земельного участка - 25 лет	100224	10022
15.	Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное заглубленное, обвалованное, перекрытие ж/б, полы бетонные, состояние аварийное, общей площадью 27,4 кв. м. Земельный участок: площадью 0,0433 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000162, срок аренды земельного участка - 25 лет	45697	4569

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

1. Аукцион состоится 25 августа 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество». Не допускается одновременное участие в торгах по одному и тому же предмету аукциона следующих лиц: близких родственников (родителей, детей, усыновителей, усыновленных (удочеренных), родных братьев и сестер, деда, бабки, внуков), а также супругов и их близких родственников; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере 20 и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию, **без нотариального засвидетельствования**; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования**; иностранными юридическими лицами — копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица — легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также — документ, подтверждающий его полномочия.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 24.08.2009 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 25.08.2009 с 14.00 до 14.45**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель — фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; **не позднее 10 дней** со дня принятия Витебским облисполкомом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка; **не позднее 12 дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить с Учреждением «База хранилище государственного страхового фонда документации Республики Беларусь» договор купли-продажи недвижимости, а с Оршанским райисполкомом — договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

6. Подробная информация об условиях участия в торгах и условиях продажи предметов аукциона опубликована ранее в газете «Рэспубліка» от 27.05.2008 № 95 (4518).

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (15 ліпеня). Па гарызанталі: Бархан. Мантаж. Шаша. Барк. Бал. Одэр. Ралля. Руль. Імша. Кап. Тарту. Паклажа. Рэя. Каа. Краб. Склеп. Нарада. Манітор. Кат. Паркан. Нага. Жаба. Парад. Дыск. Скачок. Гало. Град. Прынтар. **Па вертыкалі:** Рапа. Ясак. Флокс. Краж. Лата. Караед. Бокс. Дражэ. Папа. Ніша. Паяц. Драга. Арба. Нарды. Чад. Мышка. Стол. Лом. Маяк. Коп. Пан. Ратнік. Руіна. Лірыка. Тар. Аблога. Клавіятура. Радыятар.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Казярогаў чакаюць карысныя знаёмствы, а Блізнятаў — прыемнае падарожжа

ВАЕН. Пастарайцеся не замыкацца ў сабе і не пераўтварацца ў рака-пустэльніка. Стасункі вам неабходны, няхай нават патроху, ненадоўга. Ваша ідэя, якая пераўтворыцца ў рэальнасць, пачне прыносіць плён. Можаце адкрыць для сябе новыя творчыя аспекты, але неабходна ўлічваць, што для гэтага спатрэбіцца цішыня і камфортныя абставіны.

ЦЯЛЕЦ. Спатрэбіцца адказнасць у прыняцці рашэнняў і сіла ва ўсім астатнім. На працы праявіце асцярожнасць — няхай пра вашы поспехі пакуль не ведаюць калегі, бо гэта можа стварыць пэўную праблему ў адносінах. Сканцэнтруйцеся на галоўнай мэце: сілаў для яе рэалізацыі павінна хапіць.

БЛІЗНЯТЫ. Тыдзень будзе суправаджацца цэлай гірляндай яркіх і значных падзей. Гэта, верагодна, доўгачаканае падарожжа з каханым чалавекам ці разам з сябрамі, ажыццяўленне даўніх жаданняў і задумаў. Для тых, чый адпачынак яшчэ не пачаўся, пажадана пачакаць з праявай ініцыятывы — зараз для гэтага не лепшы час. У некаторых сітуацыях будзе вельмі складана захоўваць дыпламатычнасць.

РАК. Поспех прыйдзе праз сяброў і кантакты з аддаленымі, магчыма, замежнымі дзелавымі партнёрамі. Сцеражыцеся вельмі прывабных прапаноў, якія звязаны з неабходнасцю тэрміновых капіталаўкладанняў. Нягледзячы на вынослівасць, не ўзвальвайце на сябе празмерны цяжар працы — гэта можа не лепшым чынам паўплываць на сямейныя адносіны.

ЛЕЎ. Сціпласць будзе ўпрыгожваць і пазбавіць ад непаразуменняў і канфліктных сітуацый. А вось за свае правы давядзецца пазмагацца: падбярыце неабходную аргументацыю — тады да вас прыслухаюцца. Неабходна схаваць свае слабыя месцы ад поглядаў навакольных.

ДЗЕВА. Магчымыя няпростыя сітуацыі. Верагодна фінансавая залежнасць ад партнёра ці ўстановы. Рыхтуйцеся адказаць за свае словы і абавязацельствы, якія ўзялі. Найлепшай схемай дзейнасці будзе спантаннасць. Цалкам верагодна, што ўсё складзецца само па сабе.

ШАЛІ. Ваша схільнасць да крытыкі іншых можа выклікаць ускладненні і скандалы як на працы, так і ў асабістым жыцці. Не спрабуйце жорстка ацэньваць, вучыцеся цярпенню. Старайцеся не толькі добрасумленна працаваць, але і паўнацэнна адпачываць. Больш часу надавайце сваёй фізічнай форме.

СКАРПІЁН. У пачатку тыдня можаце стаць проста незаменным работнікам, чым бы вы ні займаліся. Вас чакае шмат кантактаў, не выключаны кароткія паездкі, пераважна — дзелавога характару. У аўторак не адмаўляйце сабе ў прыемных стасунках. У пятніцу можаце спадзявацца на дапамогу з боку начальства ці старэйшых сваякоў.

СТРАЛЕЦ. З'явіцца шанц для паспяховай самарэалізацыі на працы. Каб дабіцца пастаўленай мэты, ёсць сэнс аб'яднаць намаганні з іншымі людзьмі. Надышоў час задумацца аб ажыццяўленні сваіх жаданняў. Серада стане не самым лепшым днём для тых, хто будзе знаходзіцца ў далёкай паездцы ці камандзіроўцы.

КАЗЯРОГ. Тыдзень абяцае прыемныя і карысныя знаёмствы. Магчымыя ўдалыя перамовы аб супрацоўніцтве. Перш чым прыняць канчатковае рашэнне па важным пытанні, уважліва ўсё абдумайце. І тады ў вас абавязкова ўсё атрымаецца. У самых рашучых прадстаўнікоў знака можа з'явіцца магчымасць стварыць суменснае прадпрыемства ці нават пачаць сваю справу.

ВАДАЛЕЙ. Каб зрабіць тое, што запланавалі, спатрэбяцца пэўныя намаганні і ўпэўненасць у сабе і сваіх дзеяннях. Засяродзьцеся на самым галоўным. Не пажадана звязвацца з сумнеўнымі праектамі, а тым больш рызыкаваць рэпутацыяй.

РЫБЫ. Жыццё будзе мільгацець рознымі фарбамі. Работы будзе шмат, але не імкніцеся зрабіць усё адразу. Лепш не нарабіць памылак. Можа спатрэбіцца творчая імправізацыя, пунктуальнасць і сабранасць. Калі прыменіце гэтыя якасці, поспех не міне вас.

ЧАРНІЦЫ

● Працягваецца збор чарніц, якія, па народных павер'ях, «адводзяць ад жывата ліха», «пазбаўляюць страўнік ад хваробы, ачышчаюць кроў, нармалізуюць работу пячонкі».

● У народзе казалі: «У ягадны год спраў неўправорот». Лічылася, што «чарніцы спеюць пад камарыныя спевы», г.зн., калі ёсць камарыныя зграі, то ёсць і чарніцы ў лесе.

Чарніцы — гэта не толькі смачныя ягады; здавён у народзе ведалі, што ягады чарніц неабходна ўжываць пры праблемах страўніка і кішэчніка, пры дыябеце, захворваннях пячонкі і іншых органаў крыві, рэўматызме і падагры. Чарніцы таксама стабілізуюць зрок. Чарніцы — галінкі разам з ягадамі — сушылі на зіму, вешалі ў цёмных месцах. Шматгадовы вопыт народа вучыць, што вельмі карысна ўжываць чарніцы ў спёку, яны дапамагаюць падтрымліваць сілы ў арганізме. З чарніц варылі смачнае духмянае варэнне, кампоты. Ягады чарніц захоўваюць свае каштоўныя лекавыя якасці і не губляюць вылікай колькасці вітамінаў, нават калі іх сушыць і варыць.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Паритетбанк

ОАО «Паритетбанк» г. Минск, ул. Гамарника, 9/4

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2009	01.07.2008
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	10 131,9	6 925,0
3	Средства в Национальном банке	1102	10 766,3	45 220,9
4	Ценные бумаги:	1103	19 230,7	25 986,3
	для торговли	11031	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	-	-
	в наличии для продажи	11033	19 230,7	25 986,3
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	68 779,0	24 900,9
6	Кредиты клиентам	1106	211 779,1	162 999,4
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	16,0	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	19 524,0	14 755,0
9	Прочие активы	1109	5 881,7	5 089,1
10	ИТОГО активы	110	346 108,7	285 876,6
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
12	Средства Национального банка	1202	100 000,0	55 000,0
13	Кредиты и другие средства банков	1205	37 197,0	56 306,0
14	Средства клиентов	1206	90 685,0	60 559,9
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	1 172,3	6 509,5
16	Прочие обязательства	1209	4 770,4	2 601,9
17	ВСЕГО обязательства	120	233 824,7	180 977,3
18	КАПИТАЛ			
19	Уставный фонд	1211	93 368,4	93 368,4
20	Эмиссионный доход	1212	-	-
21	Резервный фонд	1213	1 555,9	964,3
22	Накопленная прибыль	1214	10 516,1	6 390,8
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	6 843,6	4 175,8
24	ВСЕГО капитал	121	112 284,0	104 899,3
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	346 108,7	285 876,6
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ			
27	Требования	1301	175 145,0	125 094,7
28	Обязательства	1302	63 977,4	38 795,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2009	01.07.2008
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	22 185,9	13 397,3
2	Процентные расходы	2012	11 778,0	4 608,7
3	Чистые процентные доходы	201	10 407,9	8 788,6
4	Комиссионные доходы	2021	2 352,4	1 937,9
5	Комиссионные расходы	2022	204,0	101,9
6	Чистые комиссионные доходы	202	2 148,4	1 836,0
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	2 753,7	677,7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	151,5	(-84,0)
9	Доход в форме дивидендов	205	-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	2 059,8	1 081,4
11	Прочие доходы	207	1 207,9	915,2
12	Операционные расходы	208	9 759,6	7 973,1
13	Прочие расходы	209	1 735,0	643,8
14	Налог на прибыль	210	-	446,0
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	3 115,0	1 989,2

Председатель Правления С.Л. Панковец

Главный бухгалтер М.М. Абраменко

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.

НОВЫЯ МАРКІ

4 ліпеня 2009 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне 2 маркі «Авіяспорт», «Парашутны спорт» з серыі «Авіяцыйна-тэхнічныя віды спорта». **Мастакі: Аляксей НІКАЛАЕЎСКІ і Іван ЛУКІН.**

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЗДАРОЎЕ АД ПРЫРОДЫ

Абрыкос — крымская ягода

Калі вы хоць аднойчы адпачывалі ў Крыме, то напэўна заўважылі, што абрыкосы там растуць нават уздоўж дарог. Абрыкосы — адны з самых смачных пладоў і ледзь не самыя карысныя. Паласавацца імі сёння можам і мы. Аб некаторых лекавых уласцівасцях абрыкосаў і пойдзе размова.

Яшчэ ў пачатку XIV ст. у Францыі з'явіліся навуковыя публікацыі аб магчымасці прымянення абрыкосаў «пры стане моцнай стомленасці». Пазней спіс лекавых якасцяў абрыкосаў значна пашырыўся.

Вялікая колькасць жалеза ў іх вызначае лекавую каштоўнасць пры малакроўі, прычым навукова даказана, што 100 г пладоў абрыкосаў аказвае такое ж дзеянне на працэс кроваўтварэння, як і 200 г свежай пячонкі. Абрыкосы лёгка, але надоўга ўзбуджаюць жалезісты апарат страўніка, нармалізуюць кіслотнасць страўнікавага соку, дзякуючы чаму прыходзіць у норму дзейнасць падстраўнікавай залозы, а таму наладжваецца работа печані і жоўцевага пухіра. Адвар з абрыкосаў — выдатны змякчальны сродак пры запаленні страўнікава-кішачнага тракта, незаменныя абрыкосы пры ацёках, хваробах нырак, яны выводзяць з арганізма розныя шлакі.

Усё вышэйсказанае не азначае, што есці абрыкосы павінны толькі хворыя людзі. Яны патрэбныя ўсім, асабліва школьнікам, студэнтам, людзям, занятым інтэлектуальнай працай, бо абрыкосы багатыя на фосфар і магній, якія необходныя арганізму для актыўнай работы мозгу. Дзякуючы гэтаму яны павышаюць разумовую працаздольнасць і паляпшаюць памяць.

ПАДТРЫМКА ДЛЯ СЭРЦА

Абрыкосы змяшчаюць шмат калію і магнію, таму з'яўляюцца незаменнай падтрымкай для сардэчна-сасудзістай сістэмы. У час разгрузачных дзён пры захворваннях сэрца ў рацыён хворых у залежнасці ад сезона ўключаюць курагу. Асабліва карысныя абрыкосы тым, хто пакутуе ад стэнакардыі ці перанёс інфаркт міякарда. Пры гіпертаніі рэкамендуецца штодня ў сезон есці як мага больш гэтых пладоў. Дзякуючы вялікай колькасці магнію, яны хутка і надоўга паніжаюць артэрыяльны ціск.

ЗАЛАТЫ СОК

Абрыкосавы сок з мякаццю вельмі карысны. Ён змяшчае шмат соляў, кальцый і жалеза. Дастаткова сказаць, што ўсяго 150 г абрыкосавага соку задавальняе сутачную патрэбнасць чалавека ў караціне. Акрамя таго, абрыкосавы сок нармалізуе кіслотнасць страўніка, эфектыўна дзейнічае пры калітах.

На жаль, у крамах сёння можна сустрэць толькі абрыкосавы нектар, а гэта не зусім тое, што трэба для лячэння, таму лепш нарыхтаваць сок на зіму самім. Для гэтага добра памытыя абрыкосы разрэжце напалам, аддзяліце костачкі, пакладзіце ў каструлю і наліце крыху вады, паварыце, каб усё размякчылася. На 1 кг абрыкосаў з сокам дадайце 200 г цукру і палову чайнай лыжкі лімоннай кіслаты, усё размяшайце, разліце ў слоікі, пастэрылізуйце. Перад ужываннем сок развядзіце гатаванай вадой у роўных суадносінах. Гэта вельмі смачна і карысна.

КУРАГА — ЗІМОВЫ ЛАСУНАК

Абрыкосы, як і іншая садавіна, — прадукт сезонны, і ў свежым выглядзе даступны толькі ўлетку. Аднак зімой іх цалкам можна замяніць курагой. Яе цэняць у першую чаргу за вялікую колькасць калію, караціну, фосфару, кальцыю і жалеза. Курагу прызначаюць хворым з парушэннямі сардэчнага рытму, кровазвароту, пры інфаркце міякарда, міястэніі і інш. захворваннях. Сардэчнікам можна рэкамендаваць штодня з'ядаць хоць бы па некалькі лыжак сумесі курагі, разынак і грэцкіх арэхаў, узятых пароўну.

-2589-

ХАТНІЯ НАРЫХТОЎКІ

Варэнне з вішань з костачкамі

На 1 кг ягад 1,5 кг цукру.

Палавіну нормы цукру заліце 2 шк. вады і прыгатуйце сіроп. Вішні добра прамыйце, выдаліце пладаножкі, кожную ягадку пракаліце іголкай (а можна зрабіць прасцей: апусціць вішні на 2 хвіліны ў кіпень). Пакладзіце вішні ў тазік ці каструлю (пажадана не алюмініевую і не эмаліраваную), заліце гарачым сіропам. Дайце будучаму варэнню «адпачыць» на працягу 4 гадзін. Затым пастаўце пасудзіну на агонь, давядзіце да кіпення, агонь паменшыце і гатуйце варэнне 7 хвілін.

Зліце сіроп у іншую пасудзіну, давядзіце яго да кіпення, гатуйце яшчэ 7 хвілін. Пасля гэтага апусціце ягады ў сіроп, засыпце астатні цукар, варыце варэнне да гатоўнасці пры пастаянным памешванні. Разліце ў падрыхтаваныя слоікі, закатайце.

Камусьці можа здацца, што з такім варэннем шмат важданіны, аднак вынік таго варты. Пры такім спосабе ягады добра насычаюцца сіропам, не губляюць смаку і выгляду.

Дарэчы, каб варэнне не зацукравалася, на 1 кг цукру вазьміце чвэрць чайнай лыжкі лімоннай кіслаты, развядзіце яе чайнай лыжкай вады і ўліце ў варэнне ў працэсе гатавання.

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

Выбіраем чамадан

Галоўнае, каб ён быў зручны і надзейны, а гэта залежыць ад матэрыялаў і дэталяў, з якіх чамадан выраблены.

Матэрыялы:

Тканіна. Шчыльная, звычайна з вільгаценепрымальным прамочваннем, не драпаецца, але хутка пэцкаецца. На чамадане можна сядзець. Такія чамаданы самыя лёгкія.

Пластык. Лёгка мыюцца, маюць жорсткую форму, г. зн., што рэчы будуць менш камечыцца, даволі лёгкія, але хутка драпаюцца. Іншы раз ад удару (пры неакуратнай пагрузцы-разгрузцы) пластык трэскаецца.

Скура. Трывалы матэрыял, лёгка мыецца, але і лёгка драпаецца і губляе выгляд. Акрамя таго, скураныя чамаданы самыя дарагія і цяжкія.

Дэталі:

Калёсы. Могуць быць пластыкавыя ці сіліконавыя. Пластыкавыя менш трывалыя, пасля некалькіх пракатаў па асфальце сціраюцца і махрацца. Сіліконавыя — бясшумныя і надзейныя.

Засцежкі (маланкі). Надзейныя і зручныя пластмасавыя засцежкі-маланкі (металічныя маланкі іншы раз «заядаюць»), а замкі і зашчапкі — металічныя. Маланка мусіць быць шырокай, тоўстай і лёгка адчыняцца і зачыняцца.

Дзяржанне. Павінна цалкам складацца і прыбірацца ў корпус чамадана (інакш пры транспарціроўцы можа зламацца), а ў мадэлях з мяккіх матэрыялаў, па магчымасці, зачыняцца клапанам на маланцы. Гэта дэталь павінна быць зручнай і не выклікаць ніякага дыскамфорту, таму цвёрдае вуглаватае дзяржанне — нагода адмовіцца ад выбранай мадэлі.



Важныя дробязі

● Сярэдняй сям'і з трох чалавек лепш адразу набыць адзін вялікі і адзін сярэдні чамадан для ручной паклажы.

● Умяціны і драпіны больш за ўсё бачныя на чамаданах чорнага, карычневага і бэжавага колеру.

● Зручна, калі чамадан для ручной паклажы мае вешалку, розныя кішэнькі.

● Яшчэ адна карысная рэч — умацаваныя вуглы: як унутры, так і звонку. Чамадан з такой канструкцыяй добра ахоўвае рэчы ад механічных пашкоджанняў.

-2590-

Дзве даты

18 ліпеня

1195 год — нарадзіўся Міндоўг, заснавальнік і першы вялікі князь ВКЛ. Ён аб'яднаў у сваіх уладаннях Наваградскую зямлю, усходнія землі Літвы і частку Полацкай зямлі ў адзіную беларуска-літоўскую дзяржаву, якая стала асновай ВКЛ. У 1253 годзе прыняў тытул караля. Вёў барацьбу з Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі, для гэтага ў 1261 годзе заключыў саюз з Аляксандрам Неўскім. Карыстаўся ў Літве неабмежаванай уладай, што выклікала незадаволенасць літоўскіх князёў. У выніку іх змовы Міндоўг быў забіты ў 1263 годзе.

1909 год — нарадзіўся (вёска Грамыкі, сёння — Веткаўскі раён) Андрэй Андрэевіч Грамыка, вядомы савецкі дзяржаўны дзеяч, міністр замежных спраў СССР (1957—1985), Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР (1985—1987), доктар эканамічных навук, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. За цвёрдае адстойванне сваіх пазіцый на Захадзе атрымаў мянушку «Містэр «Не».

Цытата дня:

«Ніколі не позна замаўчаць, калі ведаеш, што хлусіш».

Аляксандр Дзюма-сын (1824—1895), французскі паэт і драматург.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 25



Белыя: Крa3, Фd5, Кс1, Кg3 (4).
Чорныя: Крh2, Фh7, п. f2 (3).
Выйгрыш.

Заданне № 26
(заключнае)



Белыя: Крd1, Лf8, Cf1 (3).
Чорныя: Крa1, Ла5, пп. a2, b4 (4).
Нічыя.

На рашэнне заданняў даецца 15 дзён.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ АДКАЗЫ

Змяшчаем рашэнні заданняў масавага конкурсу рашэнняў, апублікаваных 24 і 25.06 г.г.

Заданне № 19. У. Саміла. 1. Ла8 Kb4+! 2. a7 Кс6 3. Кр:с6 Крa6 4. С:b6 Лd8 5. Лb8! Л:b8 6. abKx.

Заданне № 20. Я. Ібулаеў. 1. Сс3+Лb2 2. Kd2 a3 3. Крe2 a4 4. Крd1 a5 5. Кс4! Крb1 6. К:a3+ Крa1 7. Кс4 a3 8. Крс1 a4 9. К:b2 ab+ 10. С:b2x.

Заданне № 21. М. Буржуцкі. 1. c4 Kh5 2. c5 Kf6+ 3. Крe6 Kh5 4. c6 Kf4+ 5. Крd7 Kd5 6. Kb5 Kb4. 7. c7 Ka6 8. c8 Л+! і выйгрыш. 8. c8 Ф? Kb4+ 9. Кр~ — пат; 8. c8 С? Kb4! 9. Крd6 Крb8 10. Cf5 Крb7! 11. Крс5 Ka6+! і нічыя.

Адказы на заданні даслалі Алег Бадзюкоў (Круглянскі раён), Юрый Бандарэнка (Магілёў), Віктар Быкаў (Мінск), Міхаіл Балянкоў (Рагачоўскі раён), Анатоль Дарашэнка (Мінск), Анатоль Прынеслік (Віцебск), Пётр Шчамялёў (Бялыніцкі раён).

ЗАПРАШАЕМ ДА ЎДЗЕЛУ

Газета «Вечерний Петербург» (Расія) аб'явіла XV міжнародны конкурс складання шахматных кампазіцый: двухходоўкі, трохходоўкі, шматходоўкі і эцюды. Прысланыя кампазіцыі будуць публікавацца на працягу 2009—2010 гг.

Задачы і эцюды ў 1 экзэмпляры кожная, на дыяграмах і з поўным рашэннем дасылаць на адрас рэдакцыі газеты «Вечерний Петербург»: ул. Мира, 34, лит. А, г. Санкт-Петербург, 297101, Россия з паметкай «Шахматы для любознательных».

Усміхнёмся!

— Як пісаць: «выздаравіла» або «выздаровела»?
— Пішы: «Ніпадохла!»

☺

Маладой гаспадыні да ўвагі. Калі вы з мужам ідзяце ў госці, а там будуць незамужнія дамы, скарміце мужу пару долек часнаку....

☺

Званок на метэастанцыю:
— Алё, гэта метэастанцыя?
— Так!
— Тут з майго склепа пажарнікі адпампоўваюць вашу лёгкую воблачнасць...

☺

Бутэлька гарэлкі, якая пабілася, дэзынфіцыруе асфальт — для таго, каб вінаваты, лежачы на ім з пабітым тварам, не атрымаў заражэнне.

☺

Сабака — сябар чабурэка.



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.01	21.30	16.29
Віцебск —	4.44	21.26	16.42
Магілёў —	4.51	21.20	16.29
Гомель —	4.56	21.08	16.12
Брэст —	5.18	21.44	16.26
Гродна —	5.27	21.36	16.09

Месяц

Апошняя квадра 15 ліпеня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Варвары, Ганны, Лізаветы, Апанаса, Сяргея.*

К. *Караліны, Арнольда, Емяльяна.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 3874. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12